Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 50 (4441) 14 снежня 2007 г.

У нумары:

Дыялог культур праз літаратуру

Літаратары, заклапочаныя адсутнасцю ўзаемаперакладаў, урэшце, селі за «круглы стол».

Стар. 3

Пад зоркай літаратурнай

Актуальнае інтэрв'ю з Анатолем Грэкавым — начальнікам аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама.

Стар. 5

Чарадзейная сіла слова

Агляд 11-х нумароў часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Нёман».

Стар. 7

Радавое гняздо...

У сваю вёску Зубакі пераехаў і Генадзь Пацыенка — беларус, колішні галоўны рэдактар «Роман-газеты».

Стар. 12

Нотынгемскі дзённік

Першыя крокі беларускага замежнага літаратуразнаўства у сусветны кантэкст.

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 6400 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 8300 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Зорнае святло паэзіі

Зорка паэзіі Максіма Багдановіча праз гады вядзе за сабой усіх адухоўленых беларускім словам, вядзе да прыгажосці і любові. 7 снежня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча прайшла вечарына "І свеціцца зорнае слова Максіма", на якой адзначалася не толькі 116-годдзе з дня нараджэння паэта, але і сто гадоў ягонай творчасці, бо менавіта ў 1907 годзе ў "Нашай ніве" ён надрукаваў свой першы твор — алегарычнае апавяданне "Музыка". Кожны з выступоўцаў распавёў пра нейкую асобную грань таленту Багдановіча і пра сваю, асабістую зорку Максіма.

Леанід Дранько-Майсюк прыгадаў дзяцінства ў Давыд-Гарадку, дзе класічнае, вечнае слова паэзіі перапляталася з фальклорнымі прыказкамі і вершамі: "На вуліцы я чуў гутарковую творчасць кшталту: "Бульба-цыбуля, бацька-матуля, ноччу не спіцца, хачу я жаніцца", а ў школе настаўніца чытала нам: "Зорка Венера ўзышла над зямлёю...". Вось так ад яркіх фальклорных матываў я спасцігаў сапраўдную, цудоўную і бясконцую беларускую паэзію, дзякуючы якой — і ў першую чаргу, дзякуючы паэзіі Багдановіча — мы, беларусы, — прыгожая нацыя".

Асоба Максіма Багдановіча сёння ўвасабляецца ў шматлікіх вершах сучасных паэтаў. Васіль Жуковіч прызнаўся: "Ні адзін паэт і нават ні адна паэтэса гэтак часта не прысутнічае ў маіх вершах, як Багдановіч". А паэт, бард Алесь Камоцкі праспяваў песні на словы Багдановіча.

Падчас вечарыны не знікала зорная тэматыка. Людміла Хейдарава нават паспрабавала высветліць, "як зоркі ставяцца да Багдановіча". Паводле яе назіранняў, ён быў вельмі рэлігійным чалавекам, ягоныя вершы інтанацыйна маюць малітоўны настрой, і таму можна сцвярджаць, што гэты таленавіты чалавек быў "на прамой лініі з Богам".

Пісьменнік Анатоль Бутэвіч распавёў, што пачынаў пісаць пад псеўданімам Максім Валошка, які, зразумела, цесна звязаны з імем Багдановіча: "Валошка — гэта тая непаўторная кветка, якая стала для мяне яго сімвалам як увасабленне ягонага захаплення жыццём, разумення прыгожага".

Валерый Стралко, які даў магчымасць спадчыне Максіма Багдановіча загучаць і на ўкраінскай мове, прачытаў некалькі сваіх перакладаў, што зрабіў спецыяльна для гэтай вечарыны.

Урачыстасці, прысвечаныя дню нараджэння паэта, не абмежаваліся сустрэчай у музеі. Пісьменнікі, навукоўцы і прыхільнікі творчасці славутага паэта сабраліся ля яго помніка, каб ускласці кветкі і яшчэ раз узгадаць яго зорнае імя.

Саша ДОРСКАЯ

Беларускі «тахелесец»

"Тахелес" — гэта месца, кшталту агульнаберлінскага дома культуры, адно з самых экзатычных і андэграўндных у горадзе. Тут круглы год збіраюцца з многіх краін свету шматлікія госці: каларытныя, цікавыя і, паводле слоў відавочцы, вядомага беларускага мастака Аляксандра Родзіна, жывуць яны там "запаралелена-касмічным" экстравертным жыццём авангарда. Да вайны тут быў самы вялікі універмаг Берліна. Пасля Другой сусветнай будынак набыў новы статус і новае жыццё: прыгрэў тут хіпі, нефармалаў і пацыфістаў з усімі прыярытэтамі гэтай стракатай публікі. Так працягвалася да 1991 года, а потым, як сведчаць надпісы на сценах, зробленыя тымі, хто там жыў, — "Калонія стала пусцець — людзі пачалі старэць"... Трэцяе нараджэнне "Тахелеса" пачалося прыкладна з 1996 года. Ён зрабіўся культавай, улюбёнай мясцінай для турыстаў з усяго свету. І хоць тут жывуць рускія, іспанцы, італьянцы, немцы, англічане, французы, прадстаўнікі іншых народаў, паняцце нацыянальнасці сярод іх знівеліравана — усе называюць сябе "тахелесец". А гаворка ў "Тахелесе" зведзена да прыблізна нямецкай, з дамешкам рускай, італьянскай, англійскай, французскай ды іншых моў. Да рускіх (а ў "Тахелесе" ўсіх, хто размаўляе па-руску, называюць рускімі, і такіх тут шмат) адносяцца з павагай. Дружба тут галоўнае. А калі ты яшчэ і таленавіты, цябе "раскруцяць".

Вось у гэтае асяроддзе і трапіў наш Аляксандр Родзін і ўжо шэсць гадоў жыве, стварае новыя работы, ладзіць выстаўкі. Часцяком прыязджае з Берліна ў Мінск — адведаць састарэлых бацькоў. Падчас аднаго з такіх візітаў я сустрэла Аляксандра ў Беларускім саюзе мастакоў; пагутарылі...

Летась яго персанальная выстаўка з вялікім поспехам прайшла ў прэстыжнай берлінскай галерэі "Кунстхаус", плошча якой — тысяча квадратных метраў. Сёлета мастаку споўнілася 60 год, і да свайго юбілею ён прадставіў 60 новых карцін, большасць якіх манументальныя. Адкрыццё новай экспазіцыі А. Родзіна пад назвай "Дах-5" спалучылася з музычным фэстам (яго курыраваў таксама наш зямляк Улад Бубен) і з перформансам. Імпрэза працягвалася два тыдні; на вуліцы, побач з галерэяй, збіралася шмат народу, людзі з вялікай цікавасцю назіралі і самі ўдзельнічалі ў дзеі. І ўжо амаль год працуе тая выстава. На будынку "Тахелеса", у самым цэнтры Берліна, — яе вялізная рэклама, і яна прадстаўляе не толькі мастака Аляксандра Родзіна, а і Беларусь.

(Працяг на стар.11)

Палымянцы ў Маладзечна

У часопіса "Полымя" юбілей — 85 гадоў. За прамінулы час змянілася некалькі пакаленняў рэдактараў, супрацоўнікаў, чытачоў выдання. Сёння прыхільнікі "Полымя" — гэта не толькі сталыя людзі, але і моладзь, якая цікавіцца беларускай культурай і літаратурай, неабыякавая да духоўнага жыцця сваёй краіны. І значную ролю тут маюць сустрэчы палымянцаў са сваімі чытачамі. Сустрэча, прысвечаная юбілею, адбылася ў горадзе Маладзечна, які самі жыхары называюць "культурнай сталіцай" Міншчыны. Тут былі ўзгаданы адразу тры юбілейныя даты, якія прыпалі на 2007 год: 125-годдзе Янкі Купалы і Якуба Коласа, 85-годдзе "Полымя" і 5-годдзе Палаца культуры горада Маладзечна, дзе прайшло святочнае мерапрыемства.

Дырэктар Палаца культуры Святлана Сарока з задавальненнем зладзіла гасцям невялічкую экскурсію па ўтульных калідорах і залах установы, расказала пра мерапрыемствы, што адбываюцца ў яго сценах штогод.

Ніводнае з памяшканняў палаца не "прастойвае". За 5 гадоў існавання намаганнямі яго супрацоўнікаў было арганізавана каля 2000 мерапрыемстваў рознага кшталту — міжнародны турнір па спартыўных бальных танцах "Кубак Маладзечна", Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна", рэгіянальны фестываль-конкурс "Адна зямля" і г.д. Гасцямі Палаца з'яўляліся калектывы і дзеячы самых розных накірункаў самадзейнага і прафесійнага мастацтва.

Вынік адданай працы супрацоўнікаў Палаца культуры Маладзечна — запатрабаванасць у сваім горадзе і раёне ды за іх межамі. Вось і зараз Палац культуры добразычліва прывітаў сваіх гасцей у "малой" зале, дзе распачалося мерапрыемства ў гонар 85-годдзя часопіса "Полымя".

Сур'ёзнасць падзеі была разбаўленая гумарам і ўсмешкамі намесніка дырэктара РВУ "Літаратура і Мастацтва", вядучага свята А. Бадака, галоўнага рэдактара часопіса М. Мятліцкага, пісьменнікаў, былых і сённяшніх супрацоўнікаў часопіса К. Камейшы, Ул. Мазго, І. Міклашэўскага, Ул. Марука, В. Спрынчана.

Распачалася імпрэза словамі А. Бадака, які зачытаў успаміны заснавальнікаў "Полымя". Стаўшы ў 1922 годзе першым літаратурна-мастацкім выданнем, "Полымя" здолела захаваць свой аўтарытэт па сённяшні дзень. Акрамя дакументальнага тэксту А.Бадак прачытаў некалькі вершаў са свайго зборніка "Маланкавы посах".

М.Мятліцкі працягнуў расповед пра гісторыю станаўлення часопіса "пад зоркай Янкі Купалы і Якуба Коласа", ад першага рэдактара П.Галавача і да сучаснасці. "Якой будзе сённяшняя літаратура? — задаўся пытаннем М.Мятліцкі. — Улічыўшы доўгую і багатую на выпрабаванні гісторыю беларускага народа, яна будзе адной з самых гуманных". Але для таго, каб часопіс жыў і развіваўся далей, побач са сталымі творцамі ў яго павінны прыходзіць маладыя таленты. І тут не трэба палохацца сваёй кароткай творчай біяграфіі, бо за спінай у кожнага творцы — гісторыя яго народа. Паводле слоў галоўнага рэдактара выдання, "Полымя" аддае перавагу "кансерватыўным" формам твораў перад моднымі зараз формамі кшталту хоку і г.д. М. Мятліцкі галоўным крытэрыем ацэнкі твораў назваў талент, які альбо ёсць, альбо яго няма. "Свету мы будзем цікавыя толькі сваім, уласна беларускім," — адзначыў ён. Падкрэсліў таксама, што гэтая юбілейная сустрэча — не парадны ход "Полымя" па Беларусі, а экзамен, справаздача па зробленым на карысць роднай краіны, заклапочанасць лёсам якой ён бачыць у вачах прысутных.

Агульны эмацыйны фон вечарыны падтрымалі Ул. Мазго, І. Міклашэўскі, В. Спрынчан, А. Зэкаў, маладыя аўтары "Полымя" М. Шамякіна і Р. Малахоўскі. Парадавалі гледачоў і гасцей сваімі спевамі калектывы Палаца культуры "Харашуха" і "Талака". А верш "Укралі плуг", прачытаны К. Камейшам, стаў пачаткам сапраўднай алегорыі на гэтую тэму, што турбавала розумы ўдзельнікаў свята цэлы вечар: што такое плуг ва ўмовах нашай рэчаіснасці — хіба не сімвал нацыянальнай самастойнасці, якую шукае беларус і дапамагчы знайсці якую задача такіх духоўна скіраваных выданняў, якім з'яўляецца "Полымя"?

Пасля заканчэння імпрэзы ўсе прысутныя маглі задаць пытанні і пагутарыць з супрацоўнікамі часопіса.

Ганна КОТ

На здымку: вядучы імпрэзы Алесь Бадак.

Фота аўтара

Старонкі славянскай гісторыі

Калі вас цікавіць гісторыя паходжання славян, вам абавязкова трэба азнаёміцца з кнігай польскага пісьменніка Рышарда Курыльчыка «Славянскі світанак», якую пераклаў на беларускую мову Анатоль Бутэвіч.

Нядаўна ў Доме дружбы прайшла прэзентацыя гэтай кнігі, дзе сабралася шмат людзей, якіх захапляе гісторыя нашага мінулага. Прысутнічаў на ёй і сам аўтар.

— Гэта кніга з'яўляецца спробай дайсці да сутнасці гісторыі славянства, — падзялілася сваім уражаннем аб прачытаным творы вядомая пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова.— Яна захапляе з першых старонак і чытаецца на адным дыханні. Асабліва спадабаўся мне той момант, дзе аўтар называе "золатам славян" жанчын.

Глыбокі сэнс кнігі, закладзены аўтарам, выяўляецца праз жывую мову перакладчыка: чытач адчувае, нібы сапраўды апынуўся ў далёкім мінулым.

Цікава, што раней Анатоль Бутэвіч і Рышард Курыльчык былі дзяржаўнымі дзеячамі, аднак з цягам часу любоў да літаратуры перамагла. Дзякуючы гэтаму імі былі створаны цудоўныя мастацкія творы.

— Мы пазнаёміліся ў 1997 годзе, супадзенне інтарэсаў зблізіла нас і мы сталі сябрамі, — расказаў Анатоль Бутэвіч. — Я і сам люблю пісаць на гістарычную тэму, таму перакладаць кнігі Рышарда нескладана, тым больш, што піша ён заўсёды сцісла і коратка.

На прэзентацыі таксама выступіў Андрэй Прохараў, намеснік дэкана гістарычнага факультэта БДУ, які напісаў прадмову да кнігі. У прыватнасці, ён падкрэсліў:

— Часцей пісьменнікі лепей тлумачаць падзеі мінулага, бо маюць магчымасць нешта дадумаць у адрозненне ад гісторыкаў, якія павінны абапірацца толькі на факты. Маёй задачай было даць чытачу некаторыя тлумачэнні менавіта з пазіцыі гісторыка.

Рышард Курыльчык зазначыў:

— Калі "Славянскі світанак" быў ужо напісаны, я задаў сабе пытанне: як змог я напісаць аб падзеях, якія адбыліся тысячагоддзе таму? А потым вырашыў, што такія пачуцці, як павага, каханне, зайздрасць, — нязменныя. Бясспрэчна, усё вакол нас змяняецца: у мінулым сродкам перамяшчэння быў конь, а зараз — машына, з'явіліся тэлевізары, камп'ютэры, ракеты... Аднак людзі засталіся ранейшымі.

Дар'я КАЛІНІНА

За жыццё без войнаў

Адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя ў Беларускім фондзе Міру. На ёй прысутнічалі змагары за жыццё без войнаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Падводзіліся вынікі працы за 5 мінулых гадоў і ўдакладняліся планы на будучае. Старшынёй праўлення зноў абраны сусветны пасол Міру Марат Ягораў.

Гэта грамадская арганізацыя надае шмат увагі папулярызацыі культурных каштоўнасцей краіны па-за яе межамі. Так, сёлета фонд Міру, далучыўшыся да святкавання 125-гадовага юбілею класікаў беларускай літаратуры, падтрымаў ініцыятыву грамадскага аб'яднання "Радуга", літаратурных музеяў Купалы і Коласа ў правядзенні міжнароднага фестывалю юных мастакоў «Мая зямля», які стаў часткаю праекта "Свет без межаў".

У бліжэйшы час удзельнікі фонду Міру возьмуць удзел у правядзенні антываенных акцый у Швецыі, Германіі, Вялікабрытаніі. Знакаміты па сваіх выступленнях за мяжой калектыў "Дзіця свету" Брэсцкага цэнтра маладзёжнай творчасці, які пабываў ужо з дабрачыннымі канцэртамі ў Бельгіі, Галандыі, Нарвегіі, на Блізкім Усходзе і ў інш. краінах, зараз збіраецца ў Расію.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

З перамогай!

Чарада інтэрв'ю, тэлевізійнае ток-шоу, прэс-канферэнцыя... Аляксей Жыгалковіч на гэтым тыдні, бадай, самы папулярны чалавек у краіне.

Няма патрэбы распавядаць пра тое, як да 11-гадовага мінчука прыйшла слава. Тысячы нашых суайчыннікаў увечары 8 снежня глядзелі тэлетрансляцыю з галандскага горада Ратэрдама, дзе праходзіў V Міжнародны дзіцячы конкурс песні "Еўрабачанне-2007", на якім выступленне Аляксея Жыгалковіча з хлапечай танцавальнай групай "All stars" прынесла перамогу Беларусі. Незабыўныя імгненні, калі ў эфіры падсумоўваліся вынікі тэлефоннага галасавання: са значным адрывам лідзіравала кампазіцыя армянскага ансамбля "Арэвік", але гледачы Літвы, Мальты ды Партугаліі адзначылі песню нашага хлапчука "С друзьями" вышэйшым балам — такім чынам Беларусь выйшла на 1-е месца. Вядома, за поспехам Аляксея Жыгалковіча — не толькі вялікая падрыхтоўчая праца (прынамсі, у якасці педагога па вакале да "Еўрабачання" яго рыхтавала Вольга Вронская), але і пэўны творчы досвед, і музычная атмасфера ў сям'і. Бацькі звязалі сваё прафесійнае жыццё з медыцынай, але абое маюць пачатковую музычную адукацыю. Аляксей з 5 гадоў пачаў спяваць, праз год — займацца на фартэпіяна. З 9 гадоў піша песні. Урокі эстрадных спеваў атрымліваў у вядомых беларускіх выканаўцаў. Удзельнічае ў спектаклях Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра, у праграмах ансамбля "Верасяты". Мае званні лаўрэата міжнародных конкурсаў, якія праходзілі ў Італіі, Балгарыі, Беларусі. І ў агульнаадукацыйнай школе ён — выдатнік.

Я. КАРЛІМА

КОНКУРС

Да ўвагі кіраўнікоў Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм

Рэдакцыя тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" працягвае конкурс "СУСВЕТ СЛОВА: ад газеты да энцыклапедыі" для Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Рэспублікі Беларусь (ЦБС). Пераможцы будуць вызначацца паводле вынікаў падпіскі на "ЛіМ" на I паўгоддзе 2008 г. пасля 25 снежня бягучага года.

ЦБС — удзельнікі конкурсу, чые падпісныя кампаніі будуць найбольш плённымі, атрымаюць унікальныя зборы кніг, што ўключаюць прызначаную для рознаўзроставай аўдыторыі энцыклапедычную, даведачную, навукова-папулярную, ілюстрацыйна-дыдактычную і іншую літаратуру, выпуск якой ажыццяўляецца беларускімі і расійскімі выдавецтвамі.

У залежнасці ад вынікаў падпіснай кампаніі пераможцы атрымаюць кнігазбор, які ўключае:

— для I месца — 100 кніжных адзінак;
— для II месца — 70 кніжных адзінак;
— для III месца — 50 кніжных адзінак.

Запрашаем да ўдзелу ў конкурсе Цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы ўсёй Беларусі, з разлікам на зацікаўленасць не толькі бібліятэкараў, але і настаўнікаў, пісьменнікаў, навукоўцаў, вучняў, выкладчыкаў, студэнтаў, даўніх і новых прыхільнікаў тыднёвіка — усіх тых, хто рушыў ці толькі мяркуе разам з "ЛіМам" выправіцца ў вандроўку па бязмежным ды чароўна-непрадказальным сусвеце Слова.

Слова светлае, слова чулае

Для паэта кожная сустрэча з чытачом — непаўторная. А калі гэтыя чытачы — маладыя воіны, якія нясуць службу па ахове граніц роднай краіны, такая сустрэча набывае асаблівае гучанне і становіцца ўрокам патрыятызму, любові да Радзімы.

Менавіта так сталася і падчас наведвання старшыні Віцебскага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" Тамары Красновай-Гусачэнкі і ганаровага члена СПБ Барыса Бележэнкі воінаў Віцебскага гарнізона. Паэты чыталі хвалюючыя вершы, прысвечаныя роднай Айчыне, яе гераічнаму мінуламу, тым велічным пераўтварэнням, што адбываюцца ў нашай краіне сёння. Не была абыдзена ўвагай і тэма сапраўднай дружбы, кахання, чалавечай годнасці. Прысутныя задавалі пытанні, прасілі расказаць аб дзейнасці Саюза пісьменнікаў Беларусі. Т. Краснова-Гусачэнка і Б. Бележэнка падарылі воінам свае кнігі з аўтографамі.

Дарэчы, толькі сёлета віцебскія літаратары правялі ўжо больш як трыста выступленняў у працоўных калектывах, воінскіх часцях, бібліятэках, клубах, Дамах культуры, школах, ВНУ, дзіцячых установах. І кожная з іх прынесла радасць, бо слова светлае, чулае, палымянае здольна яднаць людзей і мацаваць адзінства розных пакаленняў і ўсяго народа.

Валянціна АЛЕЙНІКАВА

На здымку: Тамара Краснова-Гусачэнка (у цэнтры) і Барыс Бележэнка з воінамі.

Аўтографы землякам

У рамках акцыі "Чытаючы Магілёў" у абласным цэнтры адбылася ўрачыстая сустрэча з аўтарам сучасных раманаў "Территория души" і "Площадь согласия", а таксама зборнікаў вершаў "Состояние души", "Сто сорок жизненных мгновений" Наталляй Батраковай.

Мерапрыемства стала своеасаблівым падарункам як для супрацоўнікаў бібліятэк, так і для чытачоў, якія з нецярплівасцю чакалі сустрэчы са сваёй зямлячкай. Наталля Батракова адказвала на шматлікія пытанні, выконвала свае песні. А напрыканцы вечарыны ў падарунак цэнтральная гарадская бібліятэка імя К. Маркса атрымала кнігі з аўтографам аўтара.

Ірына ЦІНЯКОВА

«Круглы стол»

Дыялог культур праз літаратуру

Такі кірунак размовы меў аднайменны "круглы стол", у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі навукі, грамадскіх арганізацый і дзяржаўных літаратурных часопісаў, пісьменнікі, крытыкі, публіцысты ды прадстаўнікі РГА "Рускае таварыства", якія ініцыіравалі яго правядзенне.

"Сустракаючыся на форумах, прысвечаных літаратуры, у гутарках з інтэлігенцыяй мы прыйшлі да высновы, што дыялог культур праз літаратуру неабходны, — зазначыў, адкрываючы сустрэчу Міхаіл **ПЕЧАНКО**, намеснік старшыні "Рускага таварыства", кіраўнік літаратурна-філасофскага клуба "Слова". — Беларуская літаратура, бясспрэчна, выходзіць па-за межы краіны і існуе ў культурнай прасторы Расіі і іншых краін".

На некаторых акалічнасцях такога існавання і спыніліся выступоўцы. Асобныя іх думкі мы прапануем увазе чытачоў "ЛіМа".

Анатоль АЎРУЦІН, першы сакратар СПБ, пасля паездкі ў Маскву на міжнародны кангрэс пісьменнікаў замежжа — член-карэспандэнт Расійскай акадэміі паэзіі:

— Не хацелася б, каб "круглы стол" стаўся нейкім аддаленым рэзанансам таго, што ўжо адбылося. У Маскве праходзіў грандыёзны форум пісьменнікаў рускага замежжа, які называўся "Русское слово — связующая нить времен и культур". Удзельнічалі прадстаўнікі 19 дзяржаў, прычым не толькі былых саюзных рэспублік, а і з Францыі, Даніі, Чэхіі, Швецыі, ЗША, Ізраіля і многіх іншых краін. Прычым, цікава: у Чэхіі ёсць саюз рускіх пісьменнікаў, ёсць ён у Германіі. У Амерыцы некалькі пісьменніцкіх аб'яднанняў. У прэзідыуме форуму былі Сяргей Міхалкоў, Чынгіз Айтматаў, Юрый Палякоў і многія іншыя людзі, хто прадстаўляе сабою жывую гісторыю не толькі рускай літаратуры. Размова пайшла вельмі сур'ёзная, бо прастора, якая раней называлася Савецкім Саюзам, дзе дзяржаўнаю моваю была руская — а гэта 250 мільёнаў насельніцтва — развалілася на 15 дзяржаў і далёка не ва ўсіх дзяржавах руская мова сталася любімаю і жаданаю. Прастора, з аднаго боку, аўтаматычна звузілася. Але і нечуваная цікавасць стала праяўляцца з боку Францыі, ЗША, Ізраіля, іншых краін да рускай мовы. Прадстаўнікі гэтых дзяржаў гаварылі, што на сённяшні дзень, прыкладам, у розных гарадах Германіі можна пайсці ў любое месца, любую краму, загаварыць па-руску, і цябе зразумеюць. У Чэхіі, Даніі выдаюцца часопісы... Былі адмысловыя тэмы. Скажам, літаратура рускамоўных немцаў. Тут ёсць пра што гаварыць! Выдадзеныя дзесяткі кніг. У гэтым плане Беларусі ёсць чаму павучыцца. Трэба сказаць, што людзі, занятыя выпускам літаратуры ў Расіі як займаліся сваімі праблемамі, так імі і займаюцца.

Анатоль Юр'евіч азнаёміў прысутных са зместам рэзалюцыі Маскоўскага форуму. Сярод іншага асаблівая ўвага там звернута на аднаўленне ў правах "унікальнага феномена айчыннай школы мастацкага перакладу як неабходнай умовы развіцця літаратурных сувязяў і культурнага абмену паміж народамі"; аднаўленне статуса выдавецтва "Художественной литературы" і павышэння яе ролі ў сучасным грамадстве. У прыватнасці, вырашана "падтрымаць стварэнне на базе "Художественной литературы" спецыялізаванага дзяржаўнага выдавецтва па выпуску літаратуры народаў Расійскай Федэрацыі і сумежных краін і падтрымаць ініцыятыву аб стварэнні бібліятэкі літаратур СНД, якая б пачыналася з дзвюхмоўнай расійска-беларускай бібліятэкі, у 50 тамах"...

Раіса БАРАВІКОВА, пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць":

— Я буду гаварыць наконт беларускай нацыянальнай літаратуры. Яна апынулася ў самай складанай сітуацыі. Для нацыянальнай літаратуры гэта праблема — мастацкага перакладу. Перакладчыкаў мы сваіх, на жаль, страцілі. Іван Бурсаў, Пеця Кошаль, яшчэ некалькі чалавек — яны ўжо гэтым не займаюцца і, напэўна, займацца не будуць. Таму трэба падумаць, як мы можам дапамагчы беларускай нацыянальнай літаратуры і нацыянальным літаратурам краін СНД. Думаю, што мы павінны адказна паставіцца да 50-томнай бібліятэкі-энцыклапедыі, якая плануецца ў "Художественной литературе" і вельмі актыўна ўключыцца ў працэс яе стварэння, выдання твораў, якія туды будуць уключаны. Потым, мы не выкарыстоўваем магчымасці выканкама Саюзнай дзяржавы. Масквічы гэтым карыстаюцца на поўную магутнасць. Мы можам планаваць зборнікі, дзіцячую літаратуру, і адразу двухтомнік: рускую літаратуру перакладаць на беларускую мову, а беларускія пісьменнікі могуць перакладацца на рускую мову і выдавацца ў Расіі. Такім чынам наша літаратура будзе вядомая. Трэба, каб кожны год у бюджэце Саюзнай дзяржавы стаяў двухтомнік. Каб нашы кнігі і большым тыражом маглі выдавацца, і паступаць на расійскі рынак. Дзякуючы рускай мове нашы аўтары могуць выйсці і ў далёкае замежжа. Так было ў савецкія часы, калі Быкаў ці Шамякін альбо Мележ выдаваліся на рускай мове. Такім чынам наша літаратура можа ўліцца ў сусветны літаратурны працэс.

А. АЎРУЦІН: Дадам: Расія — каласальная краіна па маштабах, там што ні рэгіён, то маленькая дзяржава ў дзяржаве. Ёсць асобныя паняцці: сібірская літаратура, алтайская літаратура... Я размаўляў з пісьменнікамі, і многія з задавальненнем будуць друкавацца ў Беларусі. І няма аніякіх пярэчанняў, каб рабіць, да прыкладу, абменныя выпускі нашых выданняў. І двухтомнікаў можа быць намнога больш. Самі рэгіёны могуць выдаваць.

Ніна ЧАЙКА, публіцыст, галоўны рэдактар часопіса "Нёман":

— Гэта толькі эмацыйная спроба адрадзіць былое. Але няма сістэмы і яна нават не праглядваецца ва ўзаемаадносінах рускай, беларускай, украінскай літаратур. Сапраўды, усё трымаецца на асобах. Не ведаю, ці была спроба выпрацаваць структуру міжнацыянальных, міждзяржаўных стасункаў. Усё на аматарскім узроўні. Пра выканкам — ідэя правільная. Толькі і маскоўскія пісьменнікі не шыкуюць. Выканкам фінансуе "Советскую Белоруссию", "Народную газету", у асноўным — СМІ. Нейкім чынам, шляхам энтузіязму туды прарваліся "Наш современник" і "Нёман". Можа, і гэта шлях — заключэнне дамовы з якімсьці часопісам? А што да Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы... Зараз яны збіраюць матэрыялы на тэндар. Неабходна падумаць і выйсці са сваімі прапановамі. Мы на 2008 год падалі на тэндар зборнік "Дзеці Палесся".

Р. БАРАВІКОВА: Расійскія выдавецтвы — гэта ў асноўным выдавецтвы прыватныя. І калі прыватнае выдавецтва не зацікавіць пэўны твор, на якім яно не атрымае прыбытку, то і не будзе яго друкаваць. Але нам трэба нейкім чынам выходзіць і на прыватныя выдавецтвы. А згаданае выдавецтва "Художественная литература", пэўна, будзе выконваць функцыю, як і ў савецкія часы.

А. АЎРУЦІН: "Художественная литература" — гэта тое выдавецтва, якое пакуль што ў незайздросным стане. Цяпер утвораны папячыцельскі савет дзеля таго, каб зрабіць яго дзяржаўным і скіраваць грошы на яго ўтрыманне. Калі зробяць выдавецтва такім, як абяцаюць, то яно будзе выдаваць творы пісьменнікаў усіх краін СНД. На жаль, за прамінулыя гады вырас чытач, які не здагадваецца, што існуе сапраўдная літаратура. Яны ведаюць творы Марынінай, але не ведаюць Буніна.

Алесь НАВАРЫЧ, пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса "Всемирная литература":

— У руках у мяне — "Мікалай Васільевіч Гогаль. Выбраныя творы на беларускай мове" 1952 года. Гэта рарытэт. Заўважце: 1952 год — не прайшло і дзесяці гадоў пасля вайны. Тут перакладзеныя "Вечары на хутары ля Дзіканькі", "Рэвізор", у выдатным перакладзе "Мёртвыя душы". Чытаеш гэта ўзахлёб і адчуваеш такую насалоду! Усё на вельмі прыгожай беларускай мове. У тыя цяжкія часы, калі і хлеба, можа, не ставала, кніга выдадзена накладам у 10 тысяч экземпляраў! Гэта значыць, чыталі Гогаля не толькі пісьменнікі, спецыялісты, а і шырокае кола насельніцтва, настаўнікаў. Каб кожны настаўнік мог пачытаць, паказаць дзіцяці, якое мае філалагічныя здольнасці: паглядзі, пачытай, Гогаль ёсць і на беларускай мове. Не толькі беларуская літаратура ёсць арыгінальная, але яна мае і багаты вопыт перакладчыцкай літаратуры.

І другі прыклад — "Антон Чэхаў". Гэтая кніга выдадзена ў 1994 годзе, наклад — 3 700 асобнікаў. Антона Чэхава перакладалі, у асноўным Янка Брыль, ён і ўкладальнік гэтай кнігі. Але перакладалі Чэхава раней і такія асобы, як Янка Маўр, Генадзь Шупенька, Кандрат Крапіва. У нас Астаф'еў перакладаўся, Валянцін Распуцін, іншыя. Як жа разумелі чыноўнікі таго часу важнасць гэтай з'явы — перакладу!

Іван ЧАРОТА, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскіх літаратур БДУ, вядзе спецыялізацыю мастацкага перакладу:

— Калісьці ў Расіі кафедра перакладаў існавала. І мы ад Беларусі рэкамендавалі ажно 10 чалавек. Але яны, вярнуўшыся сюды, не выконваюць функцыі, якія мы на іх ускладаем. Вось, узяць хаця б серыю "Скарбы сусветнай літаратуры", з якой згаданыя Алесем Наварычам кнігі. Мы, секцыя перакладаў, распрацоўвалі яе. Але ўжо тады, у 1994 годзе наклад падаў. Хаця папярэднія выданні мелі не толькі 10, але і 25 тысяч асобнікаў. Што да нашых магчымасцей прадоўжыць тую серыю, то мушу зазначыць: слабая перакладчыцкая карпарацыя тут, у Беларусі. Але яна ігнаруецца і ў плане належнай аплаты працы. У мяне самога на дадзены момант дзесятак кніг, перакладзеных на беларускую мову. Робяцца яны на энтузіязме, без усялякіх спадзеваў на тое, што ў бліжэйшы час пабачаць свет...

Анатоль АНДРЭЕЎ, пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар БДУ, вядучы "круглага стала":

— На жаль, расійскія выдавецтвы гатовыя прыняць творы, асабліва вострасюжэтны, псіхалагічны раман. Але цікавяцца, дзе праходзіць яго дзеянне? — Калі ж чуюць, што ў Мінску, а не ў Маскве, цікавасць прападае. Узнікае праблема: кнігу ж возьме расійскі чытач!..

Міхась ПАЗНЯКОЎ, старшыня Мінскага аддзялення СПБ, намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Нёман":

— Трэба на такія «круглыя сталы» запрашаць і прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў, пасольстваў, выканкама Саюзнай дзяржавы, і выдаўцоў, далучаць іх да абмеркавання праблем ды планаваць канкрэтныя крокі. І абавязкова — арганізаваць школу маладых перакладчыкаў.

Свае меркаванні па праблеме выказалі таксама Юрый Сапажкоў, Марыя Шамякіна, Алег Пушкін.

— Мы пачалі размову, а гэта значыць, што шукаем шляхі і знаходзім іх, — падсумаваў сустрэчу **Міхаіл ПЕЧАНКО**. — У Расіі шмат літаратурных клубаў. І часопіс літаратурны — гэта таксама сур'ёзная справа. Само па сабе слова і вуснае, і друкаванае — вельмі важкае. Трэба, каб усе гэта разумелі: і настаўнікі ў школах, і пісьменнікі, і публіцысты, і грамадскія дзеячы.

Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

Да Дня айчыннага кіно

Сёлета да Дня беларускага кіно, які адзначаецца 17 снежня, прымеркаваны не толькі святочны вечар...

У Доме кіно падвядуць вынікі і ўзнагародзяць пераможцаў адкрытага маладзёжнага конкурсу на стварэнне сцэнарыя кароткаметражнага мастацкага фільма на тэму «Беларусь. XXI стагоддзе». Узрост канкурсантаў — да 31 года.

Як паведаміў дырэктар Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Максім Буданаў, менавіта да ўрачыстасцяў у Доме кіно плануецца прэм'ерны паказ адной з новых работ Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" — "Свабоднае неба" Дзяніса Скварцова (раней фільм называўся "Шчыт Айчыны") і "Вока за вока" Генадзя Палокі. Першы здымаўся да 90-годдзя Узброеных Сіл. Другі стаў беларуска-расійскім праектам.

На падыходзе — фільмы "Чэрвень", "Вясёлы салдат", "Зграя", камедыя "На спіне ў чорнага ката" ды казка "Навагоднія прыгоды ў ліпені".

Дарэчы, свята адзначаецца 17 снежня менавіта таму, што ў гэты дзень у 1924 годзе пры Наркамасветы БССР было створана "Белдзяржкіно" — Дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі і фатаграфіі.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

Сустрэча ў школе

У сталічнай сярэдняй школе № 68 рэгулярна адбываюцца мерапрыемствы, скіраваныя на папулярызацыю беларускага слова сярод навучэнцаў— наладжваюцца літаратурныя чытанні, праходзяць гуманітарныя алімпіяды. Нядаўна тут, у рамках правядзення фестывалю "Спадчына", прымеркаванага да 125-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа, вучні старэйшых класаў сустрэліся з пісьменніцай, галоўным рэдактарам часопіса "Маладосць" Раісай Баравіковай і паэтам, рэдактарам аддзела газеты «ЛіМ» Янкам Лайковым. Арганізавалі сустрэчу бібліятэкар Валянціна Рэдзько і настаўніца беларускай мовы і літаратуры Таццяна Гармаза. Падчас шчырай, зацікаўленай гутаркі вучні мелі магчымасць пазнаёміцца з пісьменнікамі, паслухаць іх творы, атрымаць аўтографы. Пасля выступлення госці наведалі школьны этнаграфічны куток, у якім намаганнямі настаўнікаў і вучняў быў узноўлены інтэр'ер сялянскай хаты, рупліва сабраны дэталі побыту нашых продкаў. Напрыканцы ўсе выказалі спадзяванне, што і надалей школа будзе актыўна падтрымліваць сувязі з пісьменнікамі.

Іван ПЛЁСАЎ

Новы гістарычна-прыгодніцкі раман

У выдавецтве РВУ "Літаратура і Мастацтва" пабачыла свет кніга Дзмітрыя Вінаградава "Язык огненного дракона". Гэта аднайменны гістарычна-прыгодніцкі раман для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. У ім распавядаецца пра IX стагоддзе да нашай эры, калі на Еўропу хвалямі накатваліся рабаўнікі са Скандынавіі, якіх за нескаронасць і жорсткі характар празвалі вікінгамі. Асабліва помны след па сабе пакінуў конунг Даніі Рагнар Ладброк. Куды ён ні прыходзіў са сваім войскам, паўсюль пакідаў разрабаваныя селішчы, пажарышчы, нявінна загубленыя жыцці месцічаў і пасяленцаў гэтых краёў. Аднойчы ён надумаў пайсці на Русь, на горад Царград, таму вырашыў скарыстацца кароткім і зручным "шляхам з варагаў у грэкі". І выправіўся ён з войскам плысці па цячэнні Нёмана, Прыпяці ды Дняпра... Пра падзеі таго часу, пра тое, якія паразы пацярпелі вікінгі ў гэтым паходзе і напісаны гэты цікавы вострасюжэтны раман Дз. Вінаградава. Няма сумнення, што ён зацікавіць беларускіх падлеткаў. Глядзіш, неўзабаве будзе перакладзены і на беларускую мову.

Кніжку "Язык огненного дракона" можна набыць у сталічных, абласных і раённых кнігарнях, а таксама **ў РВУ "Літаратура і Мастацтва" (т. 284-79-65).**

Л.Г.

Сёлета ў Беларускага Дома друку падвоены юбілей. Калісьці ўстанова стваралася на базе Мінскай губернскай друкарні, якая была заснавана 210 год таму. А 19 снежня 1917 года пастановай Саўнаркома яе перайменавалі — пачаўся новы адлік гісторыі, згодна з якім установа спраўляе 90-гадовы юбілей. Найбольш цікаўныя могуць звярнуцца да сайта прадпрыемства http://www.domdruku.by альбо да кнігі "Нашчадкі Скарыны", якая падрыхтавана менавіта да свята. Мы ж пагутарым аб нараджэнні газет і кніг, праблемах паліграфічнай сферы і не толькі. Знаёмцеся, наш сённяшні суразмоўца — генеральны дырэктар РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" Раман Алейнік.

Нашчадкі Скарыны

— Раман Сцяпанавіч, адносна нядаўна беларуская перыёдыка стала выходзіць у колеры. Наколькі складаным быў працэс пераходу да новых тэхналогій?

—Да пераходу на колер мы ішлі дзесьці каля 10 гадоў, падбіралі тэхніку, якая б магла забяспечыць годную працу па формуле: "даступны кошт —высокая якасць". Спачатку ў 1996 годзе набылі ролевую чатырохфарбавую машыну "ГОСС-ХВ". Але ж гэта быў "друкарскі ціхаход" з хуткасцю 10-12 тыс. экземпляраў у гадзіну. Зразумела, яна нас не задавальняла. Але дзякуючы такой тэхніцы, нашы друкары што называецца "адчулі смак колеру"...

Потым на працягу 2003—2006 гадоў набылі новае абсталяванне для каляровага друкавання перыёдыкі, укаранілі тэхналогію «Computer-to-Plate», што дазволіла поўнасцю камп'ютэрызаваць працэс вытворчасці і скараціць тэрмін падрыхтоўчага працэсу. Бо каб падрыхтаваць да друку чорна-белую газету патрабуецца гадзіна, каляровую — удвая больш. Але часта спраўляемся хутчэй. Зараз уся інфармацыя паступае да нас на электронных носьбітах, а з Дома прэсы, які побач з намі, перадаецца па опта-валаконным кабелі.

Вядома ж, для набыцця дарагога абсталявання прыйшлося браць крэдыт на 5 гадоў, які мы здолелі пагасіць нават за палову тэрміну, бо магутнасці былі загружаны, з'явіўся вялікі попыт з боку нашых заказчыкаў. Працавалі нават у тры змены!

— Нядаўна стала вядома, што праз які час каляровымі будуць і многія раённыя газеты...

— Як паліграфіст скажу, што для "раёнкі" з тыражом каля 10 тыс. экземпляраў друкавацца на нашых магутнасцях выгадна. Калі гэта дзесьці 2 тыс., то лепш выпускаць выданне на месцах. Ведаю, што ролевыя машыны ўжо ўстаноўлены ў абласных цэнтрах.

— У хуткім часе на поўную магутнасць запрацуе завод па вытворчасці паперы ў Шклове. Як лічыце, ці стане з тае нагоды больш таннай прадукцыя паліграфпрадпрыемстваў?

— Не думаю, што папера будзе нават роўнай расійскай па кошце! На жаль, нас не спыталі пра тое, якая папера патрэбна нашаму прадпрыемству для каляровага друку. Мы неаднойчы афіцыйна запытвалі, што за прадукт будзе выпускацца ў Шклове. Ды канкрэтны адказ атрымалі адносна нядаўна. У цэлым, заяўленыя асноўныя параметры паперы нас задаволілі. Але ж кошт застаецца невядомым. Вытворчасць паперы — справа вельмі энергаёмістая...

— Ці толькі з-за гэтага расійскія кнігі сёння каштуюць значна танней за нашы?

— Многае залежыць ад тыражнасці выдання. Усё проста: чым большы тыраж, тым меншы кошт. І гэта датычыцца не толькі кнігі. Возьмем, напрыклад, паштоўку. У Расіі гэта — масавы прадукт для шырокага рынку збыту. Таксама рускамоўныя паштоўкі актыўна распаўсюджваюцца і ў краінах СНД. Сёння мы спрабуем вырашыць праблему выжывання нацыянальнага прадукта, і пакуль неканкурэнтаздольныя. Напрыклад, калі мы напішам на паштоўцы "З Новым годам!", то яна не пойдзе далей за Беларусь з-за моўнага бар'ера. Прычым тыраж будзе дзесьці 10 тыс., у той час як расійскай паштоўкі — 200 тыс.

— Але ці часта расіяне карыстаюцца паслугамі мінскіх паліграфічных прадпрыемствах?

— У Расіі не заўсёды можна аператыўна аддрукаваць тыраж — не хапае магутнасцей. У большасці друкарняў абсталяванне не аднаўлялася з савецкіх часоў! Нядаўна адно расійскае выдавецтва заказала нам каля 300 тыс. асобнікаў кніг — такія кантракты адзінкавыя. Параўнайце, сярэдні тыраж кнігі, якая нараджаецца ў Беларускім Доме друку — усяго каля 4 тыс.

Увогуле, з-за пераносу заказаў за мяжу многія паліграфічныя прадпрыемствы церпяць страты. Зараз нават кнігавыдаўцы Еўропы пераводзяць заказы ў краіны Паўднёва-Усходняй Азіі, бо там танней друкаваць. У Расіі і Беларусі страты абумоўлены мытневымі зборамі. Бо пошліна на ўвоз паперы — 15 працэнтаў ад яе кошту, а на гатовую кнігадрукаваную прадукцыю пошліны няма! З-за гэтага некаторыя глянцавыя часопісы друкуюцца, напрыклад, у Літве...

— Каго лічыце галоўным канкурэнтам?

— Гледзячы ў якіх накірунках. Сёння на айчынных паліграфічных абсягах няшмат значных фігур. Сярод нашых галоўных канкурэнтаў — Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа, Мінская фабрыка каляровага друку, некаторыя прыватныя друкарні. Але што датычыцца выпуску перыёдыкі, то мы — пакуль лідэры. Штодня выпускаем каля 3 млн. экземпляраў газет, прыведзеных да фармату А2.

— Для выдаўцоў кніжныя кірмашы — вельмі дзейсная форма наладжвання моцных сувязей. А для вас як паліграфістаў — таксама?

— Не! Беларускі Дом друку не займаецца буйнамаштабнай выдавецкай дзейнасцю, рыхтуем толькі дробную прадукцыю — блакноты, паштоўкі, календары ды інш. Мы амаль не ўдзельнічаем у такіх выставах, форма кантакту іншая — больш заказаў прыходзіць праз сайт. Зараз мяркуем адкрываць прадстаўніцтва ў Расіі.

— Аднак неаднаразова прагназавалася, што ў будучым паўстане праблема недахопу сыравіны, газеты будуць выходзіць у Інтэрнеце, а кнігі стануць мультымедыйнымі. Не баіцеся, што ваша праца зробіцца непатрэбнай?

— Не баюся! І вось чаму. Безумоўна, Інтэрнет расце ў маштабах, роля яго павышаецца, але не ўсе будуць мець доступ да Сеціва. Справа не толькі ў традыцыйнай схільнасці да папяровых носьбітаў, але і ў нежаданні некаторых катэгорый насельніцтва авалодваць камп'ютэрнай тэхнікай. А паперу можна выпускаць нават з саломы. Усё гэта надае аптымізму людзям, якія аддалі жыццё кніжнай справе. Разам з тым пагаджуся, што мультымедыйныя энцыклапедыі выйграюць у параўнанні з падобнымі папяровымі шматтомнікамі.

Гутарыў Сяргей ДУБОВІК

Фота аўтара

Хто сее, той і жне

Сёлетнім вераснем у Рэчыцы прайшло рэспубліканскае свята хлебаробаў "Дажынкі-2007". Менавіта яно падштурхнула Гомельскае абласное аддзяленне ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" да правядзення аналагічнага пісьменніцкага форуму "Літаратурныя дажынкі-2007", які і адбыўся ў горадзе над Сожам на пачатку лістапада.

Усе мерапрыемствы, запланаваныя на гэты дзень, былі адметныя яшчэ і тым, што ладзіліся пад знакам святкавання 125-гадовых юбілеяў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

А пачаліся "Літаратурныя дажынкі-2007" у абласной бібліятэцы з прэзентацыі кніг гамяльчан — членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адкрыў урачыстасці старшыня абласнога аддзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч, для якога, дарэчы, бягучы год быў не толькі турботны як для кіраўніка, але і плённы як для пісьменніка: у розных выдавецтвах выйшлі дзве ягоныя кнігі — "Плата за каханне" і "Запах черемухи".

На Гомельшчыне цяпер жывуць і працуюць 34 члены СПБ, і многія з іх выдалі сёлета кнігі, апублікавалі мастацкія творы ў літаратурных выданнях. Пра ўласныя набыткі, адзін за адным пачаргова падымаючыся на сцэну, распавядалі Ніна Шклярава, Аляксандр Алейнік, Алег Ананьеў, Аляксандр Атрушкевіч, Міхась Болсун, Валянціна Кадзетава, Тамара Кручэнка, Міхась Сліва ды іншыя гомельскія літаратары.

Пасля гэтага свята прадоўжылася ў спецыялізаванай Славянскай бібліятэцы, якая месціцца ў Грамадска-культурным цэнтры, дзе прайшла прэзентацыя школы маладога літаратара. Пачаўшы свой летапіс 21 сакавіка, якраз у Сусветны дзень паэзіі, гэтая своеасаблівая творчая студыя, якой кіруе вядомая паэтэса Ніна Шклярава, за параўнальна кароткі час ужо змагла заявіць пра сябе на поўны голас. Студыйцы ва ўзросце ад 13 да 25 гадоў не толькі праводзяць пасяджэнні, на якіх чытаюць і абмяркоўваюць свае творы, але і паспелі ўжо выступіць у Добрушы, Чачэрску, Рэчыцы, прыняць удзел у творчых вечарынах двух літаб'яднанняў —"Пралеска" і "На Замкавай". Традыцыйным стала для школы маладога літаратара правядзенне майстар-класа; на іх у якасці настаўнікаў выступалі Васіль Ткачоў, Уладзімір Гаўрыловіч, Мікола Ждановіч, Фелікс Мысліцкі ды іншыя знаныя гомельскія пісьменнікі.

На прэзентацыі школы свае творы прачыталі юныя паэты Карына Цімафеева, Алесь Бараноўскі, Уладзімір Чараўхін, Дзіяна Калупаха ды сёй-той яшчэ, а Анжаліка Водчыц зачаравала залу задушэўнымі песнямі. Маладых калег па пяры віталі Юрый Фатнеў і Васіль Ткачоў, паэт і бард Юрый Арэстаў.

Да свята прымеркавалі і выхад зборніка твораў паэтаў і празаікаў Гомельшчыны "Натхненне. Вдохновение", добрая частка асобнікаў якога была падорана абласной і Славянскай бібліятэкам, а таксама краязнаўчаму музею. А вось кніга вершаў Ніны Шкляравай у перакладзе на рускую мову "Сполохи дождя", якая з'явілася на свет у пярэдадзень свята, стала сапраўдным сюрпрызам і для самой аўтаркі: яе выдалі пры фінансавай падтрымцы Івана Бісева па рукапісе, які паэтэса некалі аддала Уладзіміру Гаўрыловічу.

Былі на свяце і іншыя сюрпрызы. А яшчэ —граматы і дыпломы пераможцам першага абласнога літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага, на які паступіла 127 твораў прафесійных і пачынаючых літаратараў.

У "Літаратурных дажынках-2007" прынялі ўдзел намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Пятро Кірычэнка, кіраўнікі ідэалагічных службаў, а таксама старшыня абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Анатоль Бароўскі.

З асаблівай цеплынёй сустракалі ўдзельнікі свята свайго земляка, загадчыка аддзела прозы часопіса "Полымя" Анатоля Зэкава, які выступіў перад імі двойчы: на прэзентацыі школы маладога літаратара і на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, у "Белай гасцінай" Палаца Румянцавых і Паскевічаў.

..."Літаратурныя дажынкі-2007" сталі для гомельскіх пісьменнікаў своеасаблівай справаздачай зробленага за год. У хлебаробаў пасля дажынак клопатаў не менее — самы час рыхтавацца да новай сяўбы. У пісьменнікаў, зрэшты, таксама так.

Сяргей КРЫВІЧОЎ

Сустрэча з сынам Коласа

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова адбылася сустрэча з Міхасём Міцкевічам, прымеркаваная да 125-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

З цікавымі дакладамі, прысвечанымі творчасці пісьменнікаў, выступілі рэктар ВНУ Канстанцін Бандарэнка і член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Сцяпан Лаўшук. Літаратар Віктар Арцем'еў прачытаў апавяданне пра сваё знаёмства з творчасцю Якуба Коласа і асабістыя сустрэчы з песняром. Доктар філалагічных навук, прафесар Алесь Макарэвіч з захапленнем, укладваючы душу ў кожны радок, дэкламаваў Коласавы вершы, а студэнты універсітэта праспявалі "Мой родны кут..." і "Спадчыну".

Міхась Міцкевіч таксама чытаў урыўкі з твораў бацькі, у тым ліку трэцюю рэдакцыю ўступу да паэмы "Сымон-музыка". Міхась Канстанцінавіч расказваў пра сваё дзяцінства, пра некаторыя цікавыя выпадкі са свайго жыцця, падзяліўся ўспамінамі пра бацьку і сустрэчы з Янкам Купалам, прадэманстраваў шмат фотаздымкаў сям'і Міцкевічаў.

Вераніка КРЭЧУН

Пад зоркай літаратурнай

Анатоль ГРЭКАЎ — начальнік аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама.
У свой час працаваў дырэктарам спартыўнай школы, хаця па адукацыі — рэжысёр. Сустракаўся са знакамітымі зоркамі футбола Беларусі і СССР, збіраў аўтографы знаных людзей.
У сферы культуры — з 1985 года. Яму прапаноўвалі пасады дырэктара філармоніі ў Брэсце, дырэктара палаца культуры Белсаўпрафа.
— Але, калі атрымаў асалоду ад Альбуці, Смольні — зразумеў, што гэта мой куточак, — зазначае суразмоўца. — Хаця сам я з Зэльвеншчыны і жыў на адной вуліцы з Ларысай Геніюш. Натуральна, размаўляць па-беларуску вучыўся на сваёй малой радзіме. А тут, на Стаўбцоўшчыне, палюбіў людзей, якія зберагаюць спадчыну роднага краю. Іх рукамі шмат чаго зроблена.

— Анатоль Васільевіч, калі згадваць здабыткі краю, то Стаўбцоўшчына — найперш край літаратурны...

— Безумоўна. Тут нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас. Усе мерапрыемствы, якія ладзяцца на Стаўбцоўскай зямлі — у нашым Наднёманскім краі, мы прысвячаем гэтаму чалавеку. І фестываль юных музыкантаў "Сымон-музыка", і літаратурнае свята Каласавіны, якое сёлета праходзіла ў 23-і раз, і літаратурнае дзіцячае свята "Слова пра Коласа", і харэаграфічнае свята танца "Буслянняткі", і тэатралізаванае свята "Казкі жыцця", і фестываль дзіцячых рамёстваў "Сядзіба Новазямельцаў", і фестываль мастацтваў народных узорных калектываў Стаўбцоўшчыны "З музыкай да Коласа" — усё гэта нам дапамагае "ладзіць" славуты наш зямляк Якуб Колас. Сёлета мы шмат папрацавалі ў сувязі з яго 125-годдзем. Памятаю стагадовы юбілей, імпрэзу, падрыхтаваную да 110-годдзя песняра. А сёння мерапрыемствы трошкі камерныя. Хаця літаратурныя святы, можа, і павінны так праходзіць — збіраць людзей неабыякавых, улюбёных у творчасць. Прымусова тут дзейнічаць нельга.

— Вы з'яўляецеся сааўтарам праекта ў стварэнні мемарыяльна-мастацкай кампазіцыі "Шлях Коласа"...

— Нам вельмі многа дапамагаюць нашы землякі. І ў першую чаргу — Зінаіда Мікалаеўна Камароўская. Акрамя таго, што яна — дырэктар музея, дык яшчэ і старшыня рады дырэктараў музеяў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі. Што да праекта, то мы ўпершыню пабываўшы ў Вільні, пабачылі там дарогу ад Друскінінкая да Варэны, прысвечаную Чурлёнісу, пабывалі і на радзіме Івана Франко ў Львоўскай вобласці... І сёлета мы ўстанавілі яшчэ пяць мемарыяльных мастацкіх драўляных скульптур. Тры можна пабачыць у Акінчыцах, і дзве — пры ўездзе на нашу стаўбцоўскую зямлю. Такім чынам, у нас зараз 45 такіх кампазіцый. Стварылі таксама разам з музеем Якуба Коласа карцінную галерэю "Смольня". Ёй 15 гадоў. Нам памагаюць паэты Стаўбцоўшчыны: А. Рыбак, Г. Далідовіч, К. Камейша, Я. Хвалей, А. Камароўскі, М. Маляўка, У. Мархель і журналісты С. Галоўка, В. Дранчук. Акрамя гэтых свят у нас яшчэ прайшла імпрэза, прысвечаная дзвюм маці — Коласа і Купалы, адбудзецца творчая сустрэча інтэлігенцыі нашага краю, якая ладзіцца гадоў дзесяць...У канцы года правядзём сустрэчу з нашымі ветэранамі працы — "Жураўліныя пасядзелкі". Ідэю я "пазычыў" ў Маскоўскай вобласці.

—Калісьці раён славіўся сваёй матэрыяльнай базай — менавіта ўстаноў культуры. Затым на нейкі час давялося саступіць у прыярытэтах, але ці апраўдваюцца спадзяванні на аднаўленне страчаных пазіцый цяпер?

— Зараз па краіне рэалізуецца досыць актуальная праграма па будаўніцтве аграгарадкоў. За апошнія нават два гады мы многае зрабілі. Летась рэалізоўвалі праграму па матэрыяльнай падтрымцы ўстаноў культуры ў аграгарадках Вішнявец, Зараўная. Досыць добры ў нас Старасвержанскі Цэнтр культуры, а сёлета павінны ўвесці ў строй яшчэ 4 аграгарадкі. Традыцыі фальклору, рамёстваў мы павінны зберагаць. І тыя ўстановы культуры, дзе асабліва многа моладзі, павінны абавязкова застацца. Моладзь наша вельмі таленавітая. Так, шасцёра дзяцей са студыі жывапісу сталі стыпендыятамі Фонду Прэзідэнта, а калектыў народнай песні "Жавароначкі" Стаўбцоўскай школы мастацтваў атрымаў Гран-пры Прэзідэнта. Узорны харэаграфічны ансамбль "Лявоначкі" сёлета пабываў у Польшчы, летась — у Балгарыі, Латвіі, ездзілі і ў Расію.

— Сапраўды, многае залежыць ад таго, як вы сказалі, хто прыходзіць ва ўстановы культуры. Хто ў іх працуе?

— У нас ніколі не было праблем з кадрамі. Так, на Стаўбцоўшчыне існуе 5 школ мастацтваў, дзе плённа працуюць 102 настаўнікі. Напрыклад, 48 навучэнцаў Дзераўнянскай школы мастацтваў паступілі ў музычныя вучылішчы і педагагічныя інстытуты, 2 чалавекі паступілі ў кансерваторыю ў Варшаве, у Санкт-Пецярбургу. Кіраўнік калектыву "Жавароначкі" Людміла Канаплянікава-Доўнар таксама выпускніца Дзераўнянскай школы. Зрэшты, Валерый Шмат, які кіруе калектывам "Мы — беларусы" Беларускай федэрацыі прафсаюзаў, з'яўляецца выпускніком гэтай школы. У нашых школах сёння займаецца звыш 900 навучэнцаў. Гэта вельмі вялікі ахоп музычным выхаваннем.

— Вы выступілі ініцыятарам выдання кніг літаратурнага цыкла "Мне сонцам свеціць Наднямонне". Як выспявала ідэя і як вам удалося яе рэалізаваць: знайсці аўтараў, выдавецтва?..

— Ідэю зноў жа падказаў дух Коласа. "Мне сонцам свеціць Наднямонне" — гэта яго словы. І цыкл з'явіўся да 120-годдзя класіка. Я — кіраўнік праекта, выйшла ужо сем кніг. У гэтым годзе выходзіць кніга Генрыха Далідовіча, наступныя дзве кнігі — Алеся Камароўскага і Яўгена Хвалея. Сёлета выдалі яшчэ адну кнігу серыі "Землякі" і прысвяцілі яе загадчыку філіяла музея Якуба Коласа Мікалаю Семяняку, які з'яўляўся заслужаным настаўнікам Беларусі, летась ён памёр...Таксама райвыканкам заснаваў серыю кніг "Фальклорны кут Якуба Коласа" і тры каталогі. Так што ў нас ужо 20 выданняў пабачылі свет...

— Дзе знаходзіце сродкі? Сфера культуры — не з тых, якая фінансава шыкуе.

— Мы жывём за кошт спецрахунку. Сёння грошай не хапае. А яшчэ ж трэба купіць кнігі для бібліятэк, арганізаваць падпіску. Шукаем спонсараў і амаль усё робім за кошт спецрахунку і сродкаў спонсараў, мы навучыліся працаваць менавіта так.

— А што за спецрахунак... загадкавы?

— Зарабляюць нашы ўстановы культуры. У нас, прыкладам, ёсць цудоўны харэаграфічны ансамбль "Лявоначкі" Стаўбцоўскага гарадскога Дома культуры. Ансамбль кожны год за кошт сваіх студый папаўняе спецрахунак. Яны з'ездзілі ў Польшчу. І прымалі іхні калектыў — таксама за кошт спецрахунку. Палякі таксама нешта пералічылі і тыдзень былі ў Беларусі.

Я лічу, кожны рэгіён Беларусі мае штосьці сваё адметнае і цікавае. Наш фестываль юных музыкантаў "Сымон-музыка" мы правялі 18-ы раз. І будзем рабіць яго кожны год. Таму што калі праводзіць раз у два гады — прападае цікавасць да самой імпрэзы. У нас у гэтым годзе ўдзельнікамі былі 48 школ мастацтваў з Беларусі. Уявіце сабе: 9 школ мастацтваў прыехалі толькі з горада Мінска, 3 школы — з Магілёва, таксама з Ліды, Пінска, Бабруйска... Правялі яшчэ рэгіянальны конкурс выканаўцаў на духавых інструментах памяці Івана Янкоўскага, заслужанага дзеяча культуры Беларусі. Вельмі многа праходзіць розных пленэраў. Сёлета правялі 10-ы па ліку пленэр юных мастакоў "Дзе льецца Нёман срэбраводны". Прычым, прымаем удзел у пленэрах у Даніі, Балгарыі, Польшчы, пабывалі ў Санкт-Пецярбургу. Нашы народныя калектывы выязджаюць у Калінінградскую, Маскоўскую, Уладзімірскую вобласці Расіі.

— Ці можна зараз прааналізаваць побытавую культуру насельніцтва і стан самой сферы культуры?

— Калісьці ў нашым райвыканкаме працаваў аксакал-фінансіст Міхаіл Пупейка, які казаў: задача аддзелаў культуры зрабіць настрой у клубе, а начынне забяспечыць старшыня калгаса. Усе ўстановы знаходзіліся тады на балансе калгасаў і іх кіраўнікі набывалі музычныя інструменты, апаратуру, касцюмы, сцэнічнае афармленне. Зараз гэтыя ўстановы культуры знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, і нам вельмі цяжка прывесці іх у той стан, у якім яны былі раней.

Цяпер ёсць буйныя ўстановы культуры, але ў вялікіх памяшканнях адбываецца мала мерапрыемстваў, таму трэба вызначыцца, што сёння больш патрэбна. Можа, вялікія палацы культуры зараз немэтазгодныя, таму што іх вельмі цяжка ўтрымліваць. Ды і такая колькасць устаноў культуры, як у нашым раёне, і ў іншых раёнах таксама, пэўна, непатрэбна. Іх трэба скарачаць. Я быў у пачатку дзевяностых у Галандыі і Германіі, выязджаў з нашымі "Крупіцкімі музыкамі", і заўважыў: там у радыусе 30 км знаходзіцца адна ўстанова культуры. У Літве ў рэгіёнах меліся толькі два-тры вядучыя калектывы. У нас на Стаўбцоўшчыне 26 народных і ўзорных калектываў. Тады я гэтага не зразумеў. А цяпер пагадзіўся: вялікую колькасць калектываў мы сёння не можам захаваць, але неабходна падтрымліваць тыя, якія маюць добрыя традыцыі. Шмат пытанняў сёння трэба абдумаць... Нават, лічу, тут павінны папрацаваць сацыёлагі.

— Чалавек, калі прыходзіць у культуру, плануе нешта важкае зрабіць. Як самі сцвярджаеце, у вас два захапленні: спорт і культура. Чаму менавіта культура пераважыла?

— Я выступаў калісьці ў зборнай Гродзенскай вобласці па ручным мячы, у мяне былі здольнасці ў бегавых праграмах і біятлоне, але з-за праблем з сэрцам не змог паступіць у інстытут фізкультуры. Хаця праз усё жыццё люблю людзей моцных, з характарам. Разумею, што не кожнаму гэта дадзена. Успамінаю цяпер і сваю Зэльвенскую музычную школу, дзе вучыўся па класе баяна, былі і акцёрскія здольнасці — хацеў таксама стаць рэжысёрам і нават паступаў у тэатральны інстытут у 1966 годзе, тады быў конкурс — 36 чалавек на месца. Экзамены прымалі Дзядзюшка, Глебаў, Платонаў... Але так атрымалася, што больш займаўся музыкай, працаваў 9 гадоў настаўнікам музыкі і спеваў у сельскай школе. А па адукацыі — рэжысёр самадзейных тэатральных калектываў. Думаю, калі пайду ў адстаўку як чыноўнік, буду працаваць з юнымі акцёрамі ў школе мастацтваў.

— Мы мелі магчымасць бачыць у Стаўбцоўскай дзіцячай бібліятэцы выставу кніг з вашага ўласнага збору...

— Так, і шмат прадстаўленых там кніг з аўтографамі. У мяне іх больш як 500. Наведвальнікі пабачылі каля 250-і кніг. Няма ўжо дзе трымаць іх дома, і я частку кніг перадам у фонды нашага раённага музея, абавязкова. Сёння на выстаўцы прадстаўлены асобнічкі з аўтографамі Брыля, Грахоўскага, Азгура, Анікейчыка, якія наведвалі нашыя мясціны. Дарэчы, Даніла Міцкевіч пакінуў свае 50 аўтографаў на кожнай кніжцы Якуба Коласа.

— Між іншым, вы збіраеце не толькі кнігі, а і манеты, маркі, значкі, паштоўкі. Хаця зазвычай у калекцыянера вылучаецца адзін напрамак, нейкая адна тэма дамінуе...

— Так, я калекцыянер з дзяцінства. Люблю жывапіс, захапляюся творчасцю мастакоў, і прозвішча маё Грэкаў, сугучнае са славутым мастаком (усміхаецца). У першую чаргу і збіраю маркі з мастацкай тэматыкай. Калекцыі значкоў нагадваюць пра памятныя мясціны Беларусі і былога Саюза. Дарэчы, за час нашай сумеснай працы з музеем Якуба Коласа мы выпусцілі больш як 30 значкоў, сёлета ўбачылі свет яшчэ 7. Таксама выпусцілі каля 50 вымпелаў, 40 керамічных медалёў, шмат календароў — усё гэта знаходзіцца ў фондах музея. І гэта павінна заставацца.

Ірына ТУЛУПАВА

Фота аўтара

У Віцебскай абласной бібліятэцы адбылася вечарына, прысвечаная 50-годдзю працоўнай дзейнасці і 45-годдзю літаратурнай творчасці педагога, паэта і перакладчыка Уладзіміра Папковіча. Супрацоўнікі бібліятэкі наладзілі ў гонар таленавітага творцы выставу-прысвячэнне "Вось збяру я свае блакноты..."

«А мне, як песня запаветная...»

Уладзімір Антонавіч нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Дварэц Вілейскага раёна ў сялянскай сям'і. Ён зведаў ваеннае ліхалецце, арышт бацькі, пасляваенную сіроцкую нішчымцу... Пра сваю малую радзіму аўтар пасля напіша вельмі шчымліва і прачула:

Паміж Вілейкай
і Лагойскам —
Па сорак вёрст у два бакі —
Стаіць маленечкая вёска,
Дзе хаткі, як баравікі.
Чужому воку непрыкметная,
Лясны няведамы куток,
А мне, як песня запаветная,
Мой першы крык,
Мой першы крок...

У 1958 годзе У. Папковіч скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, выкладаў у гэтым інстытуце. Затым па спецыяльнасці працаваў на розных пасадах у Мінску і ў Віцебску. У друку пачаў выступаць у 1962 годзе з вершамі і апавяданнямі. Ён — аўтар зборнікаў вершаў "На досвітку", "Зерне", "Самы кароткі цень". Паэт шчыра адкрываў свой першасны свет дабрыні і чалавечнасці, вялікай любові да людзей і ў першую чаргу да сваіх землякоў, да тых гераічных спраў, што здзейснілі яны ў Вялікую Айчынную вайну. Ён гаварыў ад імя сваіх аднагодкаў — дзяцей вайны, якім выпала перажыць суровыя гады фашысцкай акупацыі. Яго лірыка празрыстая, пяшчотная, сонечная, уся пранізаная дабрынёю і шчырасцю, як вясновыя далі, калі ён з'явіўся на гэты свет. У вершах паэта выдатна адлюстравана шырокая душа народа, яго высакародства, шчырасць, гасціннасць, ветлівасць, дабрыня.

У. Папковіч актыўна перакладаў на беларускую мову творы нямецкіх, рускіх, цыганскіх і польскіх паэтаў. У яго перакладзе выйшлі кнігі: І. Р. Бехер "Вяртанне да сябе", Р. Крафт "Востраў без маяка", "Закаханы вандроўнік: Паэзія нямецкага рамантызму". А нямецкай мовай ён валодае дасканала і бездакорна, як, дарэчы, і беларускай. Таму і пераклады атрымліваюцца выдатнымі.

Уладзімір Антонавіч любіць студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, дзе многія гады выкладае, дзе быў загадчыкам кафедры нямецкай мовы. Як педагог ён асоба незвычайная, вельмі далікатная і мудрая. Больш за ўсё цэніць у людзях высокую мараль, прыгажосць душы, сардэчную адкрытасць і павагу. Паэт не выносіць людской абыякавасці. І яго паэзія вучыць праўдзе і дабрыні. Ва ўсім адчуваецца асоба паэта, па-сялянску руплівага і сціплага, сейбіта добрых спрадвечных слоў.

...Я зноў і зноў перачытваю вершы і пераклады У. Папковіча. І раблю для сябе вывад, што ён — паэт глыбока ўражлівы, з пачуццём грамадскай адказнасці за Час, за лёс Зямлі, за будучыню Прыроды-матухны. За лёс любай яго сэрцу вёсачкі Дварэц, адкуль звонкім жаўранкам узляцела песня Уладзіміра Папковіча.

Канстанцін КАРНЯЛЮК



Гудкі далёкіх паравозаў

Паравозы цяпер стаяць на п'едэсталах. Як казаў стары машыніст Андрэй Лятун з аднайменнага апавядання Міхася Лынькова, "і ні пары наддаць, ані поўны ход, ні табе семафоры крылатыя, ані вёрсты, ані рэйкі бліскучыя, што мігцяць-сакацяць пад грымучымі коламі..." Паравозы, гэтыя вогнедышныя працаўнікі "сталёвых магістраляў", наколькі я ведаю, узняты на пастаменты ў Баранавічах, Оршы, Калінкавічах, магчыма, яшчэ дзе-небудзь. Помнікі суровай эпохі, сведкі крывавых падзей. Аднак у літаратурныя творы пра далёка не будзённае жыццё чыгункі трапіла, бадай-што, адна старадаўняя Орша, да якой "увечары і ўранку цягнікі імчаць па ўсіх напрамках". На памяць адразу прыходзіць сёння ўжо трошкі забыты раман-эпапея таго ж М. Лынькова "Векапомныя дні", дзе з дакументальнай грунтоўнасцю паказаны мужнасць і гераізм падполыпчыкаў Мінска і Аршанскага дэпо ў гады вайны. Патрыёты-чыгуначнікі, як вядома, тут дзейнічалі пад кіраўніцтвам К. Заслонава. Яму, выдатнаму арганізатару партызанскай барацьбы, Герою Савецкага Саюза, яшчэ ў 1955 годзе каля вакзала ў Оршы быў устаноўлены помнік, а яшчэ пазней у тым жа скверы ўзняты на пастамент прыгажун паравоз серыі "П-36". Што ж, яны цяпер заўсёды побач — сімвал працоўнай славы чыгуначнікаў і беларускі змагар К. Заслонаў:

Што пераможам — ведаў,
І вёў смяротны бой...
Вунь паравоз "Победа",
Як сімвал, за спіной.

Мо аб такім ён марыў,
Хоць час цяпер такі:
Бягуць ужо — без пары —
Другія цягнікі.

Ды каб нашчадкі зналі,
Як наш каціўся лёс,
Стаяць на п'едэстале
Герой і паравоз!

Вось такія шчырыя і прачулыя радкі землякам-аршанцам прысвяціў паэт Павел Саковіч — сын вядомага машыніста, дзіця і выхаванец чыгункі. Нарадзіўся ён за два месяцы перад вайной у горадзе Орша, але ў дзіцячую памяць на ўсё жыццё ўрэзаліся жахлівыя малюнкі нямецкай акупацыі. Потым была цяжкая пасляваенная барацьба за сваё месца на зямлі. Скончыў школу і гістфак Белдзяржуніверсітэта, служыў у арміі, працаваў на заводзе, у рэдакцыях аршанскай "раёнкі" і рэспубліканскай "Чырвонай змены", у партыйных камітэтах і Міністэрстве культуры, загадваў культурна-масавым аддзелам Белсаўпрафа, быў намеснікам старшыні Рэспубліканскага савета па турызме. У 1996 годзе вярнуўся да журналісцкай і літаратурнай дзейнасці: стаў загадчыкам аддзела часопіса "Полымя", затым перайшоў у часопіс "Вожык". Напісаў шмат кніжак прозы, паэзіі, сатыры і гумару, твораў для дзяцей.

Перажытае ў дзяцінстве, а яно выпала на долю паэта малахлебным і горкім, нечакана, ужо ў сталыя гады, адгукнулася ў памяці і сэрцы значнай па аб'ёме, арыгінальнай па змесце паэмай "Не моўкне рэха тых гудкоў". Паэт з "вузлавой" Оршы, праслаўленай такімі гучнымі імёнамі, як Канстанцін Заслонаў, Міхась Лынькоў, Уладзімір Караткевіч, Янка Сіпакоў, сваю таленавітую рэч, над якой працаваў шмат часу, прысвяціў бацьку-машыністу, родным і ўсім землякам-чыгуначнікам. Аўтар добра ведае жыццё чыгункі, бо шматлікая радня Паўла Саковіча, уся разам, адпрацавала на ёй семсот гадоў. Зразумела, чаму першыя спробы пяра іх нашчадка: вершы, празаічныя абразкі, мініяцюры — узялі пачатак ад вогнедышных паравозаў, бліскучых рэек і лупатых семафораў. Невыпадкова яшчэ ў 1980 годзе ён стаў лаўрэатам Усесаюзнага літаратурнага конкурсу самай папулярнай некалі галіновай газеты "Гудок". Апавяданне "Бацькаўшчына" — пераможца конкурсу — друкавалася і ў часопісе "Маладосць". І вось зноў вобраз бацькі, шчырага працаўніка і патрыёта, праходзіць, бадай, праз усю паэму, а для характарыстыкі самага роднага і блізкага чалавека паэт знаходзіць трапныя мастацкія штрыхі і дэталі.

...Бацькаў кіцель я насіў
Пераліцаваны.
Дый не я адзін так быў
Абмундзіраваны.
.....
Я ж хацеў, само сабой,
Хай засведчыць памяць,
Каб мундзір у школе свой
Неяк не запляміць.
.....
Гэта ж гонар мне які:
Апрануць так рана
Бацькаў кіцель! Хоць такі —
Пераліцаваны.

Твор (дарэчы, гэта першая ў беларускай літаратуры паэма пра чыгуначнікаў) прываблівае шчымліва-балючым сюжэтам, неардынарнымі вобразамі персанажаў, дакладным ужываннем мастацка-выяўленчых сродкаў. З напластаванняў часу вострая дзіцячая памяць выхоплівае то "чорны варанок", які кудысьці па начах забіраў людзей з чыгуначнага пасёлка, то родную сястрычку Волечку, якую немцы расстралялі за ўкрадзены ў іх наган. Цяжка было ў акупацыі, але і жыццё пасляваеннай Оршы не дужа песціла хлапчукоў-падранкаў. Паэт з непрыхаванай крыўдай згадвае сваю "сталінскую" школу, дзе ў "кутку пачэсным стаяў бюст правадыра, "велічны, таўшчэзны", і, каб дзеці, крый Бог, не скінулі ды не разбілі вялікую каштоўнасць, "настаўніца, як мух", праганяла шаляніц прэч. Цікавы, але сумны і трагічны раздзел паэмы "Перарасткі вайны". Цыбатых падшыванцаў, якія не скончылі і першага класа, "садзілі па адным на апошніх лаўках", бо ў "малых "калег"сваіх спісвалі заданне" і нават "падміргвалі штораз маладым "вучылкам". Перарасткі самі шукалі сабе прыгод: не слухаліся старэйшых, хуліганілі, курылі, спрабавалі піць гарэлку, і вельмі часта "ненажэрная вайна раптам ажывала і падранкаў тых яна ўрэшце дабівала..."

Хлапчукі-падлеткі, якіх і так было мала, падрываліся ў лясах і на палетках, бо "шмат снарадаў, бомб і мін фронт вакол пакінуў". А яшчэ ў малечы з чыгуначнага пасёлка было сваё адметнае дзяцінства, няхай галоднае, няўтульнае, але сваё. Пра гэта — яскравы, уражлівы раздзел паэмы "Мае даўті". Замурзаныя, босыя падшыванцы на станцыі Орша-Заходняя бадзяліся ледзь не суткамі, ладзілі тут розныя небяспечныя гульні, да прыкладу, катаючыся з ветрыкам на старых вагонных скатах, і бывала, "што скаты раптам ляцелі пад адхон". Пасля такога "крушэння" пуцейцы праганялі неразумнікаў з рэек, але тыя зноў і зноў вярталіся на чыгунку, якая "зрэдку магла і падкарміць".

Аднак ці не самы важкі, ці не самы ўчэпіста "схоплены", пафіласофску асэнсаваны раздзел твора — "Бацька". Перад намі не проста вопытны машыніст паравоза, па закону ваеннага часу — у кіцелі і пагонах. Гэта працавіты і мужны чалавек, патрыёт роднай зямлі, які ўдосталь нацярпеўся ад немцаў, але перад ім узнікала пагроза — "каб і ў цямніцы нашай адседзець тэрмін свой". Нягледзячы на асабістыя беды, згадаем, што фашысты расстралялі яго дачушку Вольку, патомны чыгуначнік на ўсё жыццё застаўся верны дэфіцытнай прафесіі і грамадзянскаму абавязку. Галоўнаму персанажу "аршанскай" паэмы аўтар не дае ні прозвішча, ні імя, але прататып угадваецца адразу — родны бацька. Ён выдатны працаўнік, клапатлівы сем'янін, якому хочацца, каб ягоны малалетні нашчадак таксама стаў машыністам паравоза, і калі той прыносіць на раз'езд хатулёк з ежай, вучыць сына кіраваць вогнедышнай машынай: "Імчыць састаў імкліва // Па насыпу крутым. // Нібы лячу, шчаслівы, // Над горадам сваім". Што ні кажы, а ў вобразе бацькі пазнаецца асобнымі рысамі характару і годнымі ўчынкамі лынькоўскі легендарны Андрэй Лятун — непапраўны рамантык, вялікі аптыміст, чалавек моцнай сілы волі. Паэт, які там, у маленстве, не адзін раз вітаў Оршу працяжным гудком з кабіны паравоза, апавядае, як "паступова, спакваля", пазнаваў і "другі бок медаля": бацькаў "прафесійны" радыкуліт, вечную стому і боязь.

Час і прагрэс няўмольныя — зніклі назаўсёды дзюбатыя семафоры, адбегалі сваё, а дзе-нідзе ўзняліся на п'едэстал ахрыплыя паравозы, але не змаўкае ў балючай памяці рэха далёкіх гудкоў. Аўтара напаткала ўдача, і, безумоўна, гэты праўдзівы твор з жыцця аршанскіх пуцейчыкаў без лішных слоў упадабаў бы нават самы крыклівы на Беларускай чыгунцы стары машыніст Андрэй Лятун. Думаю, выданне паэмы Паўла Саковіча на ягонай праслаўленай радзіме — у Оршы, якая адзначае сваё 940-годдзе, стала добрым падарункам як для самога паэта, так і для ўсіх землякоў-аршанцаў.

Віктар ГАРДЗЕЙ

Добры падарунак

"Вавёрчына хатка" — такую назву мае новая кніга дзіцячага пісьменніка Міхася Пазнякова, якая нядаўна выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура". У гэтай кнізе для дзетак — дванаццаць апавяданняў і шэсць казак. Яна прыгожа і з густам афармлена, тут многа цудоўных малюнкаў.

Як і сказана ў анатацыі, апавяданні і казкі пісьменніка вызначаюцца глыбокім веданнем дзіцячай псіхалогіі, адкрываюць шматколерны свет дзяцінства, хараство прыроды і чалавечай душы, хвалююць шчырасцю, любоўю да ўсяго жывога і прыгожага.

І гэта сапраўды так. Вось да прыкладу апавяданне "Цукеркі". Яно пра той нялёгкі час, канец пяцідзесятых гадоў, калі яшчэ краіна залечвала раны ваеннага ліхалецця.

Герой апавядання хлопчык Міхасік, які восенню ішоў ужо ў другі клас. Акрамя Міхасіка ў сям'і было яшчэ пяцёра малых. Маці дала Міхасіку дзесяць рублёў, іх якраз павінна было хапіць на кнігі, і ён з сябруком Лёшкам сабраўся ісці ў суседнюю вёску, куды ў мясцовую школу аўталаўка з райцэнтра падвозіла на продаж падручнікі.

"— Мамачка, дай яшчэ на цукеркі, — папрасіў Міхасік.

Маці паглядзела на Лёшку, аднакласніка сына, які сціскаў у кулаку некалькі карамеляў, зноў развязала насоўку, дала Міхасіку рубель і сказала:

— Глядзі, Міхасік, не пераблытай грошы — дзесятка на кніжкі, а рубель — на цукеркі.

Па дарозе Лёшка пачаставаў Міхасіка цукеркай. Яна хутка растала ў роце — смачная-смачная...

— Прадай мне цукерак, — не стрываў Міхасік і працягнуў сябруку рубель.

Лёшка, нібы чакаў гэтага, дастаў з кішэні дванаццаць карамеляў.

Чакаючы аўталаўкі і ходзячы па школьным двары Міхасік з'еў карамелькі адну за адной.

Аўталаўка з падручнікамі ў той дзень так і не прыехала. Лёшка пайшоў дамоў, а Міхасік застаўся. Яму вельмі не хацелася вяртацца дадому без цукерак: там жа меншыя чакалі. І замест падручнікаў Міхасік купляе ў краме цукеркі. На ўсе дзесяць рублёў.

Колькі радасці было ў хаце, калі Міхасік высыпаў на стол цукеркі.

Праз нейкі час у хату з гародчыка ўвайшла маці.

— Я ж цябе папярэджвала, каб толькі на рубель купіў. Ах ты, горачка маё, неслух ты паганы, — залямантавала маці, хапаючы рэмень.

— Не бі, не бі яго матуля, не бі, — кінуліся абараняць Міхасіка сястрычкі і брацікі".

Чаму я так падрабязна спыніўся на апавяданні "Цукеркі"? А таму, што гэтае апавяданне — вялікая праўда таго, пасляваеннага жыцця. І я, як і герой апавядання Міхасік, зведаў усё тое самае. Помню, як у нашай вёсцы, стараючыся не памерці з голаду, людзі вясною перакопвалі бульбянішча, каб знайсці хоць які мёрзлы клубень, варылі крапіву. Да скону дзён не забудзецца, як аднойчы маці дала мне дзесяць яек і папрасіла, каб я іх памяняў у краме на соль. Солі я тады не купіў, а прынёс дадому на ўсе яйкі цукерак, за што атрымаў ад бацькі добрага "пачастунку".

Вельмі цікавыя і доўга помняцца такія апавяданні ў кнізе, як "Шпачынае гняздо", "Алеська", "Сынок", "Партрэт на сцяне", "Летнім днём", "Васількова дарога", "Бабуля", "Каля раўчука".

А вось апавяданне "Клён" пісьменнік крыху недапрацаваў. Вясною хлопчык прыхапіў бацькаву сякеру і накіраваўся ў сад, дзе рос высокі, стройны і прыгожы клён. Яму вельмі захацелася пакаштаваць кляновага соку. Хлопчык падсек дрэва ў адным месцы, у другім, падставіў слоік. Дасталося тады хлопчыку на арэхі... "Цэлую гадзіну стаяў, прывязаны бацькам да клёна: "піў сок"..."

Надта ж ужо вялікая кара для хлопчыка ды і ці праўдападобна гэта?

"Зайчык прачнуўся ўночы ад холаду. Над лесам церусіў зябкі дождж. Зайчык паскакаў з палянкі, на якой ён спаў пад лазовым кусцікам, пад высокія густыя яліны, каб знайсці сухое месца і крыху сагрэцца. Навокал стаяла цемра — хоць выкалі вока!" — так пачынаецца вельмі цікавая і адна з лепшых казак "Зайчык".

Кніжка апавяданняў і казак "Вавёрчына хатка", безумоўна, прынясе вялікую радасць маленькім беларускім чытачам.

Янка ГАЛУБОВІЧ

Кніжная паліца

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла ў свет "казку з чароўнымі напамінкамі" *"Естьли вода на Марсе?"* Сяргея **СТАЛЬМАШОНКА**, ім жа і афармлена. Кніжка выйшла ў спецыяльнай серыі, прысвечанай году дзіцяці.

У выдавецтве "Беларусь" выйшаў чарговы том серыі "Культурная спадчына Беларусі". Гэта каляровa ілюстраваны зборнік *"Мужчынскі касцюм на Беларусі"* напісаны Валянцінай **БЕЛЯВІНАЙ** і Любоўю **РАКАВАЙ**. *"У кнізе ўпершыню на аснове разнастайных гістарычных крыніц, этнаграфічнай і этналінгвістычнай літаратуры XIX — XX стагоддзяў комплексна, ва ўсёй сваёй шматграннасці паказаны працэс развіцця мужчынскага касцюма розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі з глыбокага мінулага да сучаснасці."*

Выйшаў з друку шосты нумар часопіса **"ПАМІЖ"**, які з 2001 года выдаецца студэнтамі і выпускнікамі Беларускага Калегіума. Гэтым разам рэдактарам нумара была Ціна Давыдчук. У маладзёжным, але не па гадах інтэлектуальным выданні можна пачытаць у добрых перакладах і перастварэннях творы ўкраінцаў Ю. Андруховіча, Т. Прахаські, Ю. Вінічука і У. Дзіброва, палячкі В. Татарчук, французжанкі Ані Самон, англічаніна Т. Капотэ, а таксама тэксты ўласна саміх (былых, цяперашніх і будучых) студэнтаў Калегіума: Н. Хоміч, Т. Барысюк, К. Курчанковай, І. Бародкі, З. Валасевіч, А. Спрынчан, С. Мядзведзева, А. Прышывалкі, Т. Беланогай, Я. Майскай ды выбітнога Г. Лабадзенкі.

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" пабачыла свет кніга аповесцей і нарысаў Анатоля **СУЛЬЯНАВА** *"Третий пилот"*. Новую кніжку вядомага пісьменніка, генерал-маёра авіяцыі склалі нарысы пра Ю. Гагарына і В. Чкалава, аповесці "Сашок", "Полёт в никуда" і "Третий пилот".

У Лунінцы выйшаў другі нумар бюлетэня **"ВЫТОК"** творчага клуба "Муза" і Брэсцкай абласной філіі СБП. Шаснаццацістаронкавы нумар цалкам, апроч рэгіянальных літаратурных навін і некалькіх паведамленняў, прысвечаны юбілеям Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка. Аўтары нататак і вершаў: Н. Мацяш, А. Каско, М. Пракаповіч, С. Варонік, К. Жмінько, І. Лагвіновіч, В. Філатаў, М. Доўгі.

Чарадзейная сіла слова



“Мне здаецца, што было б вельмі добра, каб на старонках газеты “Літаратура і мастацтва” мы час ад часу абменьваліся думкамі па пытаннях культуры мовы. Калі такая вялікая і магутная мова, як руская, адчувае неабходнасць аберагаць сябе ад выпадковай засмечанасці, то гэтакай засмечанасці ў нас куды больш. Гэта тлумачыцца многімі акалічнасцямі, і ў першую чаргу бурным узбагачэннем і развіццём літаратурнай мовы. Якое дзіва, што ў часе такога імклівага развіцця могуць даваць сябе знаць выпадковасці. Часамі яны выяўляюцца ў звычайных шарахаватасцях, часамі ў механічным разрыве з сінтаксісам, часамі ў нашай нядобрай прывычцы да лёгкага, беглага скорапісу. Часамі ж проста ад таго, што мы павярхоўна ведаем народную мову і не хочам турбаваць сябе, каб зірнуць хоць трошкі глыбей за прывычную газетную або канцылярска-бюракратычную лексіку. Што там гаварыць, побач з агульным развіццём і ўзбагачэннем мовы трапляюцца ў нас яшчэ і паўзучая спрошчанасць, і архаізмы, і дыялектызмы, карыстанне якімі наўрад ці можна апраўдаць; часта мы пішам шэрай, бясколернай калькай, парушаючы прыроду і законы мовы, і пасля дзівімся, як некаторыя пацешнікі скардзяцца, што беларуская мова непрыгожая, што гэта нейкая мешаніна з усіх моў і што яе цяжка чытаць”.

Янка Скрыган. “Яшчэ трохі аб мове” (1962 — 1964).

«Полымя» № 11

Часопіс надрукаваў заключныя раздзелы трэцяй часткі сямейнай хронікі “Вяртанне” Уладзіміра Гніламёдава. Пісьменнік дэталёва асвятляе дзеянні падпольшчыкаў у Заходняй Беларусі, умовы іх барацьбы, а таксама — жорсткія расправы ўладаў, захады паліцыі па ліквідацыі “заканспіраваных камуністаў”, бунтаўшчыкоў і “сімпатыкаў”. У хроніцы створаны маляўнічыя партрэты тыповых прадстаўнікоў свайго часу — людзей з сялянскага асяроддзя, носьбітаў спрадвечнай народнай маралі. Аднак кожны герой у творы надзелены індывідуальным характарам, тэмпераментам і інтэлектам, выяўляе ўласны погляд на свет. Гэтаму, несумненна, спрыяе і ўменне аўтара засяродзіцца на псіхалагічным жыцці герояў, і выключнае веданне ім самога вясковага быту, але найперш — увага пісьменніка менавіта да мовы твора, чуйнасць да фраз і рэплік персанажаў, да адпаведнасці маўлення герояў іх сацыяльнаму статусу, удалае выкарыстанне гутарковай лексікі і адмысловай народнай фразеалогіі.

Палымянская паэзія прадстаўлена вершамі Міколы Маляўкі, Адама Грынкевіча, Яўгена Гучка і вянком санетаў Соф'і Шах.

У творчасці маладога пісьменніка Аляксея Бруя заўважаецца мэтанакіраванае імкненне да алегарычнага абагульнення. Новае апавяданне аўтара “Шкляная труна”, як і папярэднія, мае прыпавесційны характар. Сюжэт яго даволі змрочны... У маленькага хлопчыка — унука Бога — дзень нараджэння. Дзед, мудры стары Бог, дорыць яму адмысловы падарунак — “гадзіннік з блакітнага шкла, знутры якога павольна перасыпаліся каляровыя пясчынкі”. Гэты гадзіннік — чалавечы свет, пясчынкі — людзі, заключаныя ў шкляныя сцены... Маленькі Бог вырашыў зрабіць людзей шчаслівымі, даць ім волю і разбіў гадзіннік. У фінальнай фразе ўвасоблены ідэйны сэнс твора: “Недзе па завуголлях і між халодных камянёў падлогі ў брудзе і пыле ляжалі і плакалі адзінокія свабодныя людзі”.

У апавяданні Тацціяны Гарэлікавай адлюстравана, так бы мовіць, гісторыя суроку. Гераіня — сучасная дзяўчына Юля, у якой усё ў жыцці складаецца найлепшым чынам, робіцца ахвярай варажбітки Аліны. Былое шчаслівае існаванне Юлі ператвараецца ў суцэльнае пекла, – і на працы, і ў асабістым жыцці ўсё разладжваецца. Змагаючыся з чарамі вядзьмаркі, дзяўчына бяжыць у царкву... На самай справе з гэтай гісторыі магла б атрымацца цікавая мастацкая рэч, – сама сюжэтная задума дае для гэтага падставы. Але не атрымалася... Прычын тут некалькі: першая — гэта адсутнасць нават спробаў засяродзіцца на ўнутраным, псіхалагічным жыцці герояў, заглыбіцца ў іх характары; другая — празмерная спрошчанасць учынкаў персанажаў, спецыфічная беспадстаўнасць канфлікту; трэцяя — бедная, прэсная мова твора...

Цыкл матэрыялаў часопіс прысвяціў 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. У публікацыі “Да калыскі Коласа” дэталёва асвятляецца Рэспубліканскае свята паэзіі, якое прайшло 15 верасня на радзіме Песняра. У нарысе Анатоля Зэкава “Стаіць мая хата між хвой кучаравых...” гаворка ідзе пра мемарыяльныя мясціны, якія ўшаноўваюць імя і памяць творцы. Сярод матэрыялаў гэтаксама артыкулы Вольгі Казловай “Эпісталярная спадчына Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны”, Алесі Шамякінай “Прастора ў трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”, Васіля Жураўлёва “Заўтрашні дзень” як альтэрнатыўная праблема ў творах Якуба Коласа” і іншыя.

У лістападаўскім нумары часопіса адкрылася новая рубрыка — “Школьныя далягляды”. У прадмове рэдкалегіі адзначаецца, што ў рубрыцы “будуць друкавацца мастацкія творы, адрасаваныя не толькі непасрэдна дзіцячай і падлеткавай чытацкай аўдыторыі, але і здольныя паспрыяць канструктыўнаму дыялогу вучняў і настаўнікаў, дзяцей і бацькоў. У гэты “сшытак” таксама ўвойдуць публіцыстычныя і літаратуразнаўчыя матэрыялы, аналітычныя, аглядныя, палемічныя і дыскусійныя артыкулы, прысвечаныя розным праблемам літаратуры для дзяцей і юнацтва, крытычныя рэцэнзіі на асобныя творы”. Дэбютны выпуск прадстаўлены грунтоўным “пакетам” крытыкі, які склалі аглядны артыкул Міхася Южыка “Што чытаць дзецям?”, рэцэнзія “Майстэрства пабудовы прыгодніцкага сюжэта” на аповесць Андрэя Федарэнкі “Афганская шкатулка”, рэцэнзія Алены Масла “Ключ да разумення жывога свету” на зборнік “Чырвоная кніга ў казках і вершах”. Алесь Наварыч прапанаваў чытачам аповесць “Жыццё і дзіўныя штукарствы Мацейкі, або Рабінзон Кукуруза, сын Палесся”. Думаецца, гэты твор — не проста арыгінальны, але і па-свойму двухсэнсоўны — прывабіць чытачоў розных узростаў, прымусіць шукаць інтэрпрэтацыі калізій і вытлумачэнні перыпетый.

«Маладосць» № 11

Тыя рысы-якасці сучаснай беларускай паэзіі (пераважна маладога пакалення), якія дзесятак год таму выдаваліся арыгінальнымі, сёння зрабіліся настолькі звыклымі, трывіяльнымі і уніфікаванымі, што вершы пачынаюць выглядаць безабліччна... Цэлыя цэхі паэтычных суполак-груповак-хаўрусаў, узяўшы на ўзбраенне постмадэрнісцкую эстэтыку, канвеерам “крояць вершы” па адных лекалах, сшываюць кавалкі чорна-шэрых мрояў белымі ніткамі. Асабліва прыкра, калі вынік выдаецца за “haute couture”. Вось, напрыклад, фрагмент з верша Ярыны Дашынай “Анічаганяма”, дзе пафас і сінтаксіс традыцыйна падмяняюць думку:

такія высокія столі
неба душы варушэнне
нібыта пад мікраскопам
з прыцэлам
на незваротнасць
пад градусам у чатыры
куты нібыта ў чатыры
бакі ўсяго несусвету
жывучасць аголеных нерваў
казыча тваю дзявоцкасць
так проста стацца
вар'яткай
абранай сярод абраных

Між іншым, у часопісе друкуецца артыкул Вікі Трэнас “Лабірынты паэзіі. *Творчы партрэт Ярыны Дашынай*”, дзе аўтар сцвярджае, што “творы Ярыны глыбока самасныя, не прызначаныя для шырокай аўдыторыі, яны самадастатковыя, яны нібыта не прадугледжваюць ніякай інтэрпрэтацыі”. Нягледзячы на агульны кампліментарны тон артыкула, вызначэнне “не прадугледжваюць ніякай інтэрпрэтацыі”, па-мойму, падобна на прысуд. Далей Віка Трэнас заўважае: “Зрэшты, гэта і ёсць адзнака сучаснасці, мадэрновасці — паэт дэманстратыўна адасабляе сябе ад навакольнага свету, падкрэсліваючы ў той жа час тое, што ён фактычна нічым не адрозніваецца ад натоўпу, ён пратэстуе супраць сваёй уласнай шараговасці”. І гэта вельмі дакладна... Адно застаецца заўважыць, што пратэст “супраць сваёй уласнай шараговасці” — не самы плённы спосаб творчага самавыяўлення, значна больш спрыяльны шлях у гэтым напрамку — пошук аўтарам індывідуальнага стылю, спроба ўласнага голасу ў рэшце рэшт... Бо агульнае ўражанне ад паэтычных узораў Ярыны Дашынай застаецца цалкам адпаведнае назве працытаванага вышэй верша...

Паэтычныя абсягі “Маладосці” пашыраюць вершы Ірыны Поўх, Віктара Вабішчэвіча, Маргарыты Латышкевіч і інш.

Драматургія прадстаўлена ў часопісе п'есай Анатоля Крэйдзіча “Марыська-Папараць” (па матывах палескага фальклору), дзе арыгінальнае аўтарскае вызначэнне жанравай спецыфікі твора выступае адначасова і анатацыяй да яго: “Казачная гісторыя пра Янку і яго сястрычку Марыську-Папараць, пра дабрыню і ліхадзейства, пра жыццё і смерць, а таксама пра тое, якое яно — сапраўднае золата”.

Сем'і, кшталту той, пра якую ідзе гаворка ў аповесці Валерыя Гапеева “Ведзьміна тоня” (пачатак; заканчэнне будзе ў наступным нумары), называюць па-рознаму — праблемныя, неўпарадкаваныя... Бацькі няма, маці-выпівоха прывяла ў хату “прымака” — “былога зэка, п'яніцу і лайдака”... Гісторыя бярэ пачатак ад моманту, калі з інтэрната прыязджае на лета ў родную хату старэйшы сын, — чатырнаццацігадовы Сяргей. Малодшую сястрычку хлопчык застае ў жахлівым стане: галоднае, бруднае дзіця сядзіць прывязаным за нагу да дрэва ў двары... Брат пачынае самастойна апекавацца малою, спрабуе пасвойму наладзіць жыццё. Паводзіны, характар падлетка, які не мае ў жыцці фактычна ніякага апірышча і вымушаны рупіцца ў літаральным сэнсе пра кавалак хлеба, аўтар адлюстраваў вельмі рэалістычна і надзвычай кранальна. У цэлым аповесць па-мастацку выразна завастрае маральна-этычныя праблемы, уласцівыя сённяшняму грамадству, выклікае шчымлівыя пачуцці, глыбокае спачуванне маленькім героям. Размова ў творы датычыцца не толькі пытанняў дабра і зла ў агульным сэнсе, але акцэнтуе гэтаксама праблемы ўвагі да бліжняга, міласэрнасці, чуласці... На мой погляд, аповесць Валерыя Гапеева — гэта выдатны ўзор сучаснай мастацкай прозы для дзяцей і юнацтва, здольны зацікавіць сённяшніх школьнікаў, паўплываць на іх свядомасць, светапогляд, прымусіць задумацца аб сапраўдных жыццёвых каштоўнасцях.

“Прага актуалізацыі” — такую назву мае матэрыял, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Думаецца, гэтая публікацыя прыцягне шырокую ўвагу чытацкай аўдыторыі. У прадмове Ігар Запрудскі падкрэслівае: “Мы не збіраемся рабіць замах на класічную спадчыну. Але хацелі б ведаць, ці хаця б паспрабаваць высветліць рэальнае стаўленне моладзі, не прэтэнцыёзных эстэтыкаў, а звычайных студэнтаў-філолагаў, да асобы і творчасці Якуба Коласа. Таму і прапануем чытачам, так сказаць, “канвеерную” падборку эсэ розных аўтараў “Мой Колас”. У іх гранічна шчыра, выразна, эмацыянальна, а дзе і вельмі палемічна, дыскусійна, малюецца воблік вялікага пісьменніка ва ўспрыманні прадстаўнікоў пакалення, якім больш-менш 20 гадоў. Мы па досыць зразумелых прычынах друкуем матэрыялы пад псеўданімамі, прынцыпова не прапануем сваіх каментарыяў, не асцерагаемся негатыўных, а таму небяспечных вынікаў сваёй ініцыятывы, бо цвёрда пераканаиы: да больш жахлівых вынікаў прыводзіць няведанне і маўчанне”.

«Нёман» № 11

Паэтычныя старонкі часопіса прадстаўлены творчасцю Паўла Саковіча (пераклад з белар. А. Цяўлоўскага), Тамары Красновай-Гусачэнкі, Соф'і Шах (пераклад з белар. І. Катлярова), Елізаветы Паляес, Аляксандра Суслава і Ганны Мігаль.

Невядома на якіх падставах узор творчасці Аляксандра Сакалова пад назвай “Потерянные планеты” кваліфікаваны як “аповесць”... Сюжэта ў традыцыйным разуменні ў творы няма, ёсць адно асобныя дыскрэтныя падзейныя лініі. Аўтар ад першай асобы дзеліцца ўражаннямі ад наведвання Афрыкі, прафесійнымі назіраннямі лётчыка (расказвае пра спецыфіку працы, абсталяванне і асаблівасці розных самалётаў), успамінамі пра сяброў і знаёмых... Па фармальна-жанравых прыкметах твор з'яўляецца чымсьці сярэднім паміж “мемуарамі” і “мастацка-публіцыстычным нарысам”. Нельга не прызнаць, што сярод эпізодаў трапляюцца насамрэч цікавыя назіранні і звесткі, але адсутнасць кампазіцыйнай вытрыманасці і лагічнай паслядоўнасці робіць аповед хаатычным, неахайным. Позірк аўтара слізгае ад малюнка да малюнка, ад з'явы да з'явы, ні на чым асабліва не засяроджваючыся... Пісьменнік не здолеў упарадкаваць стыхію матэрыялу і надаць фактам арганізаваную мастацкую форму.

“Нёман” пачаў друкаванне другой часткі рамана Клаўдзіі Харкевіч “Излом” (пачатак быў у № 9, 10, 11 за 2006 г.). Тут падзеі разгортваюцца ў 50-я гады XX стагоддзя, а галоўным героем на гэты раз выступае Багдан Кір'янавіч Свяціч — сын Тэклі і Кіркі. У 1955 годзе Багдан — супрацоўнік КДБ — атрымлівае службовае заданне выехаць “в места ссылок в Сибирь и лично выявить, кто из Белоруссии там находится”. Фактычна пра абставіны выканання гэтага даручэння і ідзе гаворка ў васьмі раздзелах рамана. Калі мінулыя публікацыі твора прываблівалі арыгінальнай апавядальнай манерай аўтара, то на гэты раз уражанне зусім іншае... Справа ў тым, што “казачна-размоўны” тон, які адпавядаў гаворцы пра жыццё-быццё паноў, заможных сялян і вясковай беднаты, зусім не прыдатны дзеля асвятлення палітычных перыпетый. Менавіта з-за гэтага некаторыя эпізоды твора выглядаюць амаль кур'ёзна... Так, напрыклад, у раздзеле “Первое боевое крещение” адважны чэкіст хутчэй нагадвае казачнага асілка, надзеленага звышнатуральнымі здольнасцямі, які ў адно імгненне распраўляецца з цэлай бандай ворагаў. Некаторыя жэсты персанажаў быццам спісаны з народных казак. Як той, калі Свяціч, расправіўшыся з бандай, з'язджае з вёскі, а да яго падбягае дзяўчына-прыгажуня са словамі: “Спасибо вам! Это рукавички, возьмите их себе, чтобы руки не мёрзли”. Па-мойму, менавіта неадпаведнасць мовы падзеям выклікае непрыманне матэрыялу. Вобразы герояў выглядаюць штучнымі, іх учынкі — ненатуральнымі, а гісторыя ў цэлым выклікае скепсіс.

Сярод публіцыстычных матэрыялаў часопіса — нарыс “Интуиция писателя, чутьё политика предвосхищают события” — гутарка галоўнага рэдактара Ніны Чайкі з Мікалаем Чаргінцом, нарыс Уладзіміра Вярнігорава “Судьбоносный 1917 год”, іншыя.

125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа прысвечана публікацыя Антаніны Гарон і Віталя Скалабана “История одной дружбы в письмах и документах. Якуб Колос и Антон Усс”.

Напрыканцы ізноў хацелася б прыгадаць меркаванне Янкі Скрыгана: “Вялікую чарадзейную сілу мае слова. Сапраўды, варта быць пісьменнікам, каб любіць яго і адчуваць!”

Лада АЛЕЙНІК

Мар'ян ДУКСА

Ты

З закрытымі ці голымі плячамі,
ці грэшніца, ці ўзвышана-святая,
з блакітнымі ці чорнымі вачамі,
квяцістая красуня маладая —
табой жывуць легенды і паданні...
Які б ні быў ён, гэты свет сапсуты,
была і ёсць ты вечным апраўданнем
зямному шматаблічнаму абсурду.
Як стане ў свеце глуха,
нібы ў студні,
калі міне бравурнасць і параднасць,
калі з бакоў навальваюцца будні —
тады адна ты,
хто падносіць радасць.
Твая прысутнасць паслабляе церні
пакутнікам самотным і няшчасным.
Ты з векавечнай далятаеш цемры
адзіным мо праменьчыкам нязгаслым.
Сярод адчаю кругаверці вольнай,
над плынню бедаў,
што цякуць ракаю,
сярод усіх апусташальных войнаў
ты ёсць адзіны подых супакою.

* * *

Сізіфаў камень высілкаў людскіх...
Няужо ён марны —
клопат той Сізіфаў?
Нам хоць арэх перападзе ад іх —
тых безнадзейных
і маркотных міфаў?
Мы ўсё ж перамаглі
гультайства грэх,
навошта нам адчайвацца без меры?
Цягнуць мы будзем сто разоў уверх
залатаносны светлы камень веры —
няхай сабе і здольная яна
скаціцца ўніз, на друздачкі разбіцца.
Тут наша і віна, і не віна.
Ці варта песімістамі рабіцца?
Хай вецер прывітае твой капрыз,
Як сокалу, табе варушыць пер'е.
Іначай — сам ты паляціш уніз,
калі цябе адолее бязвер'е.

Археолаг

Сляды, сляды мінуўшчыны былой.
З-пад бітай цэглы час забыты гляне.
Гісторыя, я чую голас твой
цераз пяскоў густых напластаванне.
Тваё дыханне адчуваю я
праз попел-пыл гадоў утрамбаваных.
І таямніца цёмная твая
вось-вось і мною будзе разгадана.
Усё-усё, што ў Лету адплыло,
схавалася даўно ў зямлю сырую,
я вынесу на сонца, на цяпло,
былую тайну сёння расшыфрую.
Адкрыю людству знак былой красы.
Вы толькі гляньце —
прыгажосць якая!
Здаецца, што людскія галасы
я на паверхню з цемры выпускаю.

* * *

Аб нечым шкадаваць занадта позна.
Вырошчваць кветкі можна і зімой.
Мой шлях
у нейкай меры крыжаносны.
Затое асаблівы ён. І мой.
Зусім не скажаш,
што мой лёс узорны.
Як феерверк... Зусім наадварот.
Затое ён па-свойму непаўторны,
бо даў душы і крылы, і палёт.
Цябе аднойчы ўзвысіць —
не прынізіць,
напэўна, можа кожны варыянт.
І ты нябёсы здольны сам наблізіць.
Бог кожнаму з нас выдзяляе грант...

* * *

Плачам ці радасным крыкам
нікога не здзівіш,
словам душу яго рэзка не скаланеш.
Сэрца стамлёнае выйшла, здаецца,
на фініш —
свой невясёлы, але апраўданы рубеж.
Гнанае часам нядобрым
і ўласным сумленнем,
чуе звароты і заклік
толькі ледзь-ледзь.
Бітае столькі разоў
па дарозе каменнем,
што і само яно стала
крыху камянець.
Поўная чаша людской насалоды
і мукі.
Піць ці не піць з яе —
кожны прыкідвае сам.
Хто як умее — лёс свой ловіць у рукі.
Ловіць па-свойму.
Таму ці даверыцца нам?

* * *

Добрыя нашы матулі
нас нараджаюць для радасці.
Штодня да сэрцайка туляць
і далучаюць да святасці.
Словы пяшчотныя кажуць,
цешаць, ратуюць ад вірусаў.
І не паспеюць заўважыць,
што мы аднойчы ўжо выраслі.
Беды яшчэ не прыгнулі,
шмат яшчэ юнай бадзёрасці...
З клопатам ходзяць матулі,
чуючы нашыя горасці.
Там, дзе цвілі летуценні,
вылезлі травы калючыя.
Першыя нашы падзенні,
расчараванні балючыя.
Смутныя нашы матулі,
што так паніклі з адчаю вы?
Пэўна, вас раняць, як кулі,
нашы няўдачы звычайныя.
Хоць і прыносяць адхланне
нашы аповеды сціслыя...
Каменем — нашым маўчаннем —
сэрцайка ваша прыціснута.
Лёгка забыць пры расстанні
тое, што вы асаблівыя.
Як вам патрэбна прызнанне,
што мы заўсёды шчаслівыя!

Алена БАБУРЭВІЧ

Алена Бабурэвіч нарадзілася ў Слуцку. Скончыла Салігорскі педагагічны каледж і Мінскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка. Працуе ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага агратэхнічнага універсітэта.

Восень

Жоўты ліст у лужыне азябнуў.
Чаму ты не бачыш яго?
Гэта ж восень.
А восень — гэта я.
Я — павуціна
на тваіх руках.
Я — вецер,
што ірве парасон.
Я — дождж,
што нашэптвае сны.
Я — апалы ліст
на тваіх валасах.
Восень — гэта я.
Чаму ты мяне не помніш?

* * *

У жыцці стала ўсё
Перакручана,
І змагацца з сабой
Надакучыла.
Ад трывожлівых сноў
Прачынаюся,
Ад задушаных слоў
Задыхаюся.
Яшчэ нешта ў душы
Не атручана.
Яно плача ў цішы —
Ціха, змучана.
Неба стала ад слёз
Цёмна-сіняе.
А каханне без слоў
Перасільвае.

Хто каго?

* * *

Так проста здаецца —
Бяры і пішы...
Дзе ўсё магло дзецца
І знікнуць з душы?

Не граюць музыкі,
Не чуецца звон...
Хачу я пазычыць
Хоць некалькі слоў

У снега, у неба,
У сонца, у сноў.
Мне многа не трэба,
Хоць некалькі слоў...

* * *

Па начах ізноў не спіцца.
Трэба рухацца далей:
Прыручылася сініца,
Прыручыўся журавель.

Нешта ў небе стала пуста —
Як хто зоры пазбіраў.
Нават месяц — жоўты, тлусты,
Нехта спрытны зацугляў.

Мабыць, доўга я праспала,
Мабыць, трэба ўжо ўставаць.
Зоры з торбачкі дастану —
Стану неба засяваць.

Юры ЧАРНЯКЕВІЧ

* * *

Яна чакае леташняга снегу,
Сустрэч са мною,
Зораў, што калісьці падалі ў траву...
Яна так спадзяецца адшукаць
Пачуцці ў мёртвых вершах,
Загубіцца
У тых салодкіх пацалунках,
Што хвалявалі нас раней.

Яна чакае леташняга снегу.

* * *

На ростанях —
Расстанне,
Ведзьмакі
Цяжарных думак,
Груганы,
Кры-кры
Крычаць,
Як рыба,
І глытаць паветра,
На пяску гарачым,
Засынаць
Апошнім сном
На прысаку
Вандровак у пустэчы

Без цябе.

* * *

Перашкоды – нішто.
Параходамі,
У зялёным вагоне
Метро,
Параходамі
Прабяруся, узнікну,
З'яўлюся
Ланцугамі спавіты
Ля цябе,
Ля муроў
Былых нашых клятваў,
Нашых веры, надзеі,
Нашай долі
Агульнай
На зямлі
І над небам
Над гэтым.

Забяру цябе раніцай,
Ноччу,
Напрарочу табе,
Напрарочу
Нашых лёсаў жыццё
І суладдзе,
Квецень травеньскіх зёлак
Змяшаю,
Напаіўшы, цябе затрымаю
На хвіліну,
Гадзіну,
Світанне...

Да спаткання,
Расстання,
Чакання
У зялёным вагоне метро...

* * *

Скуру з краскі
Здзіраючы...
Боль...
Няўмелымі пальцамі
Выдаліць поўню
З неба начнога,
З душы.
Патаемна выйсці
Пад дождж
Шолахам, ценем...

На голай зямлі
Твае сны
Абяцаюць цацанкі,
Усмешак расплывістасць,
Плыткасць
Сюжэтаў і словаў
Падманы.

Намарна
Твар захаваць
Мармуровым...

* * *

Вершапісанне, як
Найвялікшы асілак,
Лянота.
Як абібоцтва апошняга
Чалавека зямнога.
Утульнасць.

Пускаючы бурбалкі смеху,
На павуціне паперы
Застаецца ўсё тая ж
Знаёмая бель.
А-нічога.

Рыбаю гладкае цела
Верша знікае ў салёных вірах
Напрыканцы прачытання
Услых
На вячорках ці дзе там.

Бурбалка сэнсу
Без Сэнсу
Без Веры
Без Слова.

Фота Кастуся Дробава

Зацемкі з левай кішэні

Леанід ГАЛУБОВІЧ

• *"Пасля ісціны, няма нічога прыгажэйшага за выдумку".*
(І. Гарын, "Пророки и поэты".)

• Нават для тых, каго я ўзненавідзеў, я пакідаю любоў на будучае...

• *"Маленькі сабака і ў старасці — шчанюк".* (Пачуў гэта ў рэдакцыі часопіса "Полымя". Гаворка вялася пра нудотна-графаманскія тэксты невысокага аўтара, які і ў 70 выглядаў на 55.)

• Ёсць запіс пра тое, што вялікі і мудры Лао-цзы, адыходзячы назаўжды ад людскога быцця, папрасіў спаліць усе свае рукапісныя кніжкі, запісаўшы для памяці толькі іх назвы...

Па назвах кніг можна здагадацца пра тое, што ў іх было напісана, казаў ён.

"Калі мяне кліча да сябе жывы шлях, які я некалі назваў "дао", то што перад ім гэтая мёртвая грудка кніг — гэты мой зямны шлях, які я хачу спаліць ад пачатку да канца... Што застаецца ад нашых памерлых бацькоў? Толькі імёны на таблічках... Што застаецца ад пайшоўшага сябра? Толькі яго голас, абрывак фразы, канца якога мы не помнім... Так і ад кніг.."

Выпісаў. Мне гэта блізка.

• Немагчыма пэўна выказаць тое, што ў дадзены момант думаеш. І не таму, што страшышся выказаць гэта словамі, а таму што нестае слоў, каб выказаць **тое**. Мысленне і мова чалавека — гэта як Космас і Зямля... Такі зманлівы, неабжыты, амаль недасяжны Космас! Вось адкуль вырастаюць крылы ў людзей — з уявы і задумення...

• *"Васіль Быкаў — сапраўды вялікі пісьменнік нашага часу. Ён мае нямала афіцыйных савецкіх рэгалій — народны пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўных прэмій БССР і СССР, дэпутат. Усё гэта набліжае яго да той, першай групы. Праўда, тут... ёсць невялічкі нюансік: усе рэгаліі і годнасці надаюцца яму ўладамі не ад душы, а каб прыручыць і паказаць свету, што Быкаў зусім не пераследуецца за свае адметныя эстэтычныя прынцыпы, за свой адметны гуманізм, які не кладзецца ў рамкі традыцыйнага тупога сацрэалізму."*

Так у М. Дубянецкага ў дзённіках "Трэба рызыкаваць", "Полымя", № 10 за гэты год.

Тады чаму ж не прыручылі гэткім ці падобным чынам А. Салжаніцына, В. Бродскага, У. Караткевіча?.. І ўвогуле "Дзённік" М. Дубянецкага (з такімі заігрываннямі і пахваламі на адрас былых ЦКушнікаў ды выпячваннем уласнай асобы) мяне ўразіў і трошкі падкарэктаваў маё стаўленне да яго...

• Чалавечае жыццё роўнае чалавечай думцы пра яго...

Самае доўгае жыццё чалавек пражывае сам з сабою, самае кароткае — з іншымі...

• Гэтыя дзве цытаты поруч кажуць больш, чым паасобна.

"Омерзительно, гадко и позорно, когда писатель, надевая маску учителя, орёт, что проституция — грех общества, а сам покупает за три рубля десятилетнюю девочку, кричит о красоте жизни и прекрасных идеалах, не выходя из кабака."

(І. Гарын, "Пророки и поэты".)

"...стихи — это умственный разврат."

(Л. Талстой)

• Сёння дзесяць гадоў як памёр бацька.

Званіў у вёску маме. Пагаварылі, а я і не ўспомніў пра гэта і яна — таксама, а мо чакала, што я ўспомню, а не ўзгадаў — пакрыўдзілася ў душы сваёй і сама вырашыла не напамінаць, каб мне ніякавата не рабіць... Зрэшты, магла і забыць. Не дзіва, бо ў нашым родзе да ўсякіх дат і юбілеяў адносіліся прахалодна — абы жывыя-здаровыя былі, а ўжо колькі каму гадоў ніхто лічыць не руплуўся: чым больш, тым лепш...

Але брат патэлефанаваў з Жодзіна ды напомніў пра самотную дату. У яго сына сёння дзень нараджэння: унук нарадзіўся якраз перад тым як бацька сканаў (яшчэ паспеў уведаць)...

Жыццё працягваецца...

• У Алеся Пісьмянкова вершы чыстыя, як замоленыя грахі...

Іх — у свет людскі, у гурму нельга. Адразу ж запэцкаюць, захэкаюць... Такія духатварэнні "жывуць" толькі на аўтарскіх вачах...

• Яшчэ працуючы на БТ, знайшоў я ў макулатурным закутку літдрамрэдакцыі вершаваны зборнік Генадзя Бураўкіна "Дыханне" (1966) з такім дарчым подпісам: *"Вячаславу Адамчыку — слаўнаму празаіку і хлопцу — шчыра Генадзь. 14.X.1966г."*

Узяў дахаты, каб не прапаў. Думаў, аддам таму, каму кніжка падараваная была... Ды чамусьці за будзённічнай забылася пра тое. А як Адамчык раптоўна памёр, дык я адразу пра зборнік і ўспомніў. Аддам цяпер сыну яго —Валодзю, Адаму Глобусу — таксама ж слаўнаму празаіку і хлопцу. Але то ўжо будзе іншая гісторыя з жыцця іншых людзей. Людзі адыходзяць, а кніжкі застаюцца, хоць

"У тым няма віны мужчын,
Зусім няма віны,
Што рана леглі на спачын
Пад сосны і кляны..."

• У нашай літаратуры, аказваецца, яшчэ ёсць творцы, пра якіх мала згадваецца, хоць яны самабытныя і таленавітыя.

Галоўная прычына іх малавядомасці — гэта іх своеасаблівасць, з якой вынікаюць іх неардынарныя і арыгінальныя асобы.

Наталля Кучмель — паэтка — адна з такіх. Вакол яе "песціліся", гадаваліся і раслі як на дражджах многія, цяпер ужо даволі вядомыя ў літаратурных колах, паэты (Слінко, Гарачка). Яна рэдка і мала друкуецца, але калі гэта здараецца, то заўжды адметна. Высокі ўзровень адукацыі, культуры і прафесіяналізму не дазваляюць ёй быць "шараговай вершаскладальніцай".

Эстэтыка яе мастацкіх твораў змушае чытача адпавядаць аўтару альбо прысаромлена адысці да іншай "эстэтычнай школы". Хацелася б мець яе цэльную кніжачку паэзіі. Рэдкае на сённяшні час чытацкае жаданне (тое тычыцца і вершаў Галіны Дубянецкай).

• Няма на што купіць нават "ЛіМ" (зноў два месяцы без зарплаты).

Зайшоў у рэдакцыю, каб у Віці Шніпа ўзяць свежы асобнік тыднёвіка. Няма. Цяпер і на рэдакцыю даюць усяго 10 штук, замест ранейшых 30...

Забягае з газетай у руках Алесь Пісьмянкоў: *"Хлопцы, чаму гэта мы знялі ордэн Дружбы народаў з шапкі газеты? Гэта ж гісторыя! "Камсамолка" сваіх ордэнаў не паздымала... А мы?! Трэба вырашыць на рэдкалегіі ды зноў вярнуць ордэн на былое месца. Як ты, Лёня?..."*

"Мне ўсё адно, — кажу, — бо, што з ордэнам, што без яго, газета застаецца адна і тая ж"...

А Павел Саковіч, які зайшоў у рэдакцыю з часопіса "Полымя", дадае: *"І мы з Законнікавым вырашылі не мяняць старую шыльду на ўваходзе ў рэдакцыю — гэта ж сапраўды гістарычная рэліквія".*

Ці не пад раскрутку "Саюзнай дзяржавы" ўсе гэтыя старыя ідэі наноў ажываюць?..

• Сумленны чалавек мае права ганарыцца сваім пражытым часам, не зважаючы на тое, які гэта быў час адносна чалавечага жыцця ўвогуле, у тым ліку і наш сённяшні...

• Рускія слоўцы, нераўнуючы як вошы, свярбяць на языку, пяршаць у горле і перашкаджаюць мне выказвацца сваёй здаровай сцюдзённа-чыстай беларускай мовай. Ну хоць ты гэты *язык* адсячы, раз і назаўсёды!

• Разгаварыліся ў "Полымі" (з Федарэнкам, Акуліным ды Жуковічам) наконт гэтак званых замежных грантаў. Маўляў, якім толькі людзям яны не перападаюць (пераважна ўсё адным і тым жа на працягу дзесяці гадоў), а сапраўдным талентам — на выданне новай кніжкі ці наогул на хлеб нават — ані разу не перапала, апроч якіх двух-трох чалавек... І тут я ўспомніў, што за "праклятымі" бальшавікамі з гэтым была больш празрыстая сітуацыя: кармілі, вядома, і процьму ідэалагічных графаманаў, але, не будзем тут хлусіць, і таленавітых не забывалі: і таго ж Быкава, і Караткевіча, і Стральцова, і Сыса, і нават тое-сёе з Геніюш свет пабачыла (а гэта ж усё былі праблемныя людзі)... Ды некалі і маю неадназначную фігуру ў складаны для мяне час увагай не абдзялілі.

Дарэчы, у звязку з гэтым успомнілася мне колішняя "крыўда" на Рыгора Барадуліна, як на рэдактара майго другога зборніка вершаў "Споведзь бяссоннай душы"... Я ў тую кніжку панапіхаў усяго ўсякага, шчыра кажучы, для "таўсцейшага" ганарару. А Барадулін узяў і падпісаў яе ў друк на дзень раней, і я атрымаў толькі палову тых грошай, якія мог бы мець...

Але цяпер, мне здаецца, што рукой Барадуліна тады Бог вадзіў, калі ён падпісваў "у свет" той напалову графаманскі зборнік. Бог, аказваецца, усё бачыць — Рыгор Іванавіч толькі выканаў Яго прысуд...

Можа, яно і з грантамі гэтак: калі сумленны, то не бяры не зароблена.

• Сустрэў Сыса, якога не бачыў з лета... Падпіты і бутэлька распачатая ў руках... Абдымаецца, цалуецца, плача — худы, змэнчаны, недагледжаны...

— *Паслухай...*

Чытае чатыры неўразумелыя радкі, нешта з чарговага алкагольнага відзежу.

— *Пакінь нарэшце піць,* — упрошваю. — *Інакш здохнеш, як сабака.... Дзеці на вуліцы будуць дражніць і нагамі папіхаць. Пажыві хоць трохі светла, на роздыху... Бог дасць, мо яшчэ й напішацца што...*

— *До-до-до!.. Вось вы з Барадулінным "завязалі" і што — "пралятаеце" як паэты... Я так не хачу.*

— *Дык я ж і пісаць вершы кінуў...*

— *Гэта добра, але не для мяне...*

І зноў — слёзы, абдымкі, п'янае гундзенне...

— *Я, во, Лявон, перадам Але Канапельцы пуховую куртку для Міколы Купрэева. Яна табе прынясе яе ў рэдакцыю, а ты перашлі ўжо ці перадай яму. Скажы Міколу — што ад Толі Сыса, каб ён цёпла зімой пачуваўся, каб успамінаў, што мне тут холадна аднаму... І ён — адзін, але хай яму цёпла будзе, ён варты...*

Урэшце разышліся без гвалту. З невыказным жалем у сэрцы я пакінуў яго дапіваць віно, а сам са сваёй самотай пайшоў да людзей...

• У адной рэлігійнай сучаснай кніжцы "Христианство и модернизм" архімандрыта Рафаіла (1999) вычытаў цудоўнае парадаксальнае, можна сказаць, афарыстычнае выказванне вядомага фізіка Бора пра аднаго сябра: *"У яго не хапала ўяўлення для матэматыкі, і ён стаў паэтам".*

Падобнае можна сказаць і пра Алеся Разанава (*"І білі буйныя ранеты// па неразумнай галаве"*).

• Мець сваю родную Айчыну даецца не кожнаму. Большасць задавальняецца ўласнай зямлёй.

• Калі Пісьмянкоў даведаўся пра камень у маім жоўцевым пухіры, то зазначыў з нейкай акцэнтаванай бясспрэчнасцю: *"Ну, во, цяпер ты зразумеў, адкуль у цябе злосць была — ад болю гэтага... вось... насіў ты, значыць, камень за пазухай, муляў ён, абцяжарваў жыццё... Не бойся, цяпер гэта лёгкая аперацыя па выдаленні... Здымі камень з душы..."*

• Можна і пры святле навукі не заўважаць абсалютных ісцін. Але цемру *бачыць* нават сляпы... (Адносна беларускай сітуацыі.)

• Яшчэ раз у сувязі з каменем у жоўцевым пухіры.

Мая *"літаратурная жаўчь"* дайшла да крытычнай масы, і — **закамянела**...

• Чым вастрэйшы боль, тым яскравей наша мысленне.

• Цікава, што Цютчаў, які амаль увесь час гаварыў і пісаў па-французску, паэзію тварыў толькі ў роднай яму расійскай мове. Вось як гэта вызначаў Аксакаў: *"Значыць, з самай глыбіні яго духу крыніцай выцякала яго паэзія, з глыбіні, недасяжнай нават яго ўласнай волі; з тых таямніц, дзе жыве наша першавобразная стыхія, дзе месціцца сама праўда чалавека".*

Ці не таму мноства беларусаў выяўляе сябе ў нацыянальным паэтычным слове, не зважаючы на тое, што з усіх бакоў яны аточаныя чужой, хоць і даўно ўзвычаенай расійскай мовай. У мове — уся праўда чалавека, яго сутнасць...

Не сказаў бы, што для мяне было вялікім здзіўленнем уведаць, што менавіта Цютчаву належыць аўтарства шавіністычнага на сённяшні дзень выразу *"старший брат"*, аднак гэта некалькі знівеліравала маё высокае стаўленне да яго чалавечых і літаратурных праяў... Безумоўна, ні на ёту не ўсумніўшы мяне ў яго вялікай паэзіі.

Славянафіл па "веравызнанні", заходнік па інтэлекце, талент па сутнасці.

Але вось тыя словы:
Но Восток лишь
заалеет,
Чарам гибельным конец:
Первый в небе
просветлеет
Брата старшего венец...

Адтуль і пайшло... Там і тлее...

• *"Каб пісаць, трэба быць маладым і мець грошы. А я ўжо стары, пішу без усякага энтузіязму. Вось не плятуць жа цяпер карункі, а мая мама калісьці пляла іх. Яны тады былі ў модзе, калі жыццё не мела цаны, калі ж кошт ёй вызначылі, то ўсё скончылася...*

Раманы? Не, ведаеце, вельмі многа людзей ездзяць на аўтамашынах і надта спяшаюцца..." — казаў у адным сваім інтэрв'ю Л.-Ф. Селін.

Мне гэта зразумела.

• Дачка зламала ў школе палец на правай руцэ. Прыбегла дахаты сплаканая і спалоханая. Але неўзабаве супакоілася. Паехалі з ёй у паліклініку. Там зрабілі здымак і наклалі гіпс. Дзяўчо зусім асмялела, а пасля і ўзрадавалася: *"Якая лафа! Ажно два тыдні не трэба будзе рабіць пісьмовых заданняў — ура! Мой першы гіпс!"*

А мне на днях трэба рабіць аперацыю па выдаленні каменя. Аднак адчування радасці і эйфарыі ад будучага месячнага "безделья" ў мяне ўсё ж няма...

Мой апошні жоўцевы пухір...

• *"Немагчыма адначасова любіць праўду і наш свет. Але мы зрабілі выбар. Цяпер праблема ў тым, каб ад яго не адступаць. Заклікаю вас не здавацца. Не таму, што вам ёсць на што спадзявацца, не. Наадварот, папярэджваю: вы будзеце вельмі адзінокімі. Людзі як заўжды, прыстасоўваюцца да жыцця, інакш яны паміраюць. Вы — новыя самазабойцы."*

"Шчасця баяцца не трэба: яго няма."

Гэта цытаты з Мішэля Уэльбека — французскага паэта, празаіка, арыгінальнага сучаснага творцы, які нарабіў шмат шуму колькі гадоў таму сваім раманам "Элементарныя часцінкі"...

Яго тэксты, як і жыццёвыя паводзіны, выяўляюць натуру чалавека канца XX стагоддзя ірацыянальна...

• Сяджу з вамі — смяюся, а душа плача... па тым, над чым з вамі смяюся...

• Каторую ноч, чорны як зямля, ляжу і чакаю семя твайго, а ты засыпаеш мяне пяском жалю...

• Асабістае чалавечае жыццё — безнадзейнае. Смерць скрэслівае ўсё...

• Пішуць, выдаюць, пяюць дыфірамбы адзін другому, прэміі ды гранты "карыстаюць", "во славе ходят", а раптам, — праз гадоў якіх сто — акажацца, што ўсе яны жылі побач з якім-небудзь Галубовічам — толькі і ўсяго... (Нервовых і слабахарактарных прашу супакоіцца, на ўмоўным месцы Галубовіча кожны можа паставіць сваё ўласнае прозвішча.)

• У нас у вёсцы яшчэ гадоў трыццаць таму ад жанчын-кудзельніц можна было пачуць: *сукаць кужаль на цэлку*... Як усё хутка страчваецца ў гэтым жыцці. Калі кужаль яшчэ можна знайсці, то цэлак тых ужо нідзе няма. Хіба што ў каго на спавучыненым гарышчы.

• Кіраўнікі СБП прыйшлі ў рэдакцыю часопіса "Крыніца" і сталі (найперш Іпатава) павучаць супрацоўнікаў, як і што пісаць, каго друкаваць, і галоўнае — "не крыўдзіць" сяброў творчай арганізацыі (перад гэтым мы выдрукавалі неадназначны і колькі тэкст З. Вішнёва)...

"Ну, — кажу, — *ваш выступ нераўнуючы як жданаўскі адносна Ахматавай і Зошчанкі ў 1947-м..."*

"А вы што, — парыруе Вольга Міхайлаўна, — *сябе ўжо з Ахматавай раўняеце?!"*

Ізноў: ду-ду-ду, маўляў, пісьменнікі павінны любіць адзін аднаго... З якой гэта прычыны? Я люблю маці, жонку, дачку, белы свет і людзей у ім... Вядома, і пісьменнікаў, як людзей, паважаю, але канкрэтна іх любіць не павінен. Бо сапернічаю з імі ў творчасці. Няхай, нас любіць чытач, хоць і ён цяпер пераборлівы. Ад любові да нянавісці паўтара абзаца...

• Паэты — натуры грубаватыя, а паэзія — матэрыя тонкая. Адсюль і трагедыі...

• Я люблю паэзію і добрых шчырых людзей... І гэта не так проста даецца. Таму я і пакінуў пісаць вершы, што любоў да Паэзіі пераважыла ўласны пожад стаць адэкватным таму, што любіш — стаць самой сутнасцю паэзіі (Багдановіч, Купала, Стральцоў, Купрэеў, Сыс)...

Што з гэтага атрымалася вы бачыце па мне (па папярэдніх выніках майго жыцця)...

• Многія здзіўляюцца, як многа піша і выдае Рыгор Барадулін...

Гэта як намыванне залатога пяску. Чым больш яго сыходзіць з вадой часу, тым ясней высвечваюцца залацінкі на цёмнай далоні вечнасці...

• Іншы раз кажуць: тое ці гэта застанецца ў вечнасці... Але ў вечнасці застаецца ўсё — і тое, і гэтае... Вечнасць была цэлую вечнасць яшчэ да таго як яе назвалі гэтым словам...

Была яна да Купалы, Пушкіна, Шэкспіра, Дантэ і нават Гамера і Гільгамеша...

Яна ёсць **усім**, а мы толькі *сабою*.

• У мяне няма прэтэнзій да жыцця, а вось у яго да мяне ёсць...

г. Мінск,
лістапад-снежань 2001 года.

Арт-пацеркі

Аматары і гісторыкі мастацтва, краязнаўцы ды проста цікаўныя чытачы, і, пэўна, не толькі ў Беларусі, захочуць набыць для сябе гэтае выданне. Кніга Валерыя Шышанава "Віцебскі музей сучаснага мастацтва" (Мінск, "Медисонт", 2007), выдадзеная на рускай мове накладам 400 асобнікаў, распавядае пра тое, як у 1918 — 1941гг. стваралася і з цягам часу размяркоўвалася па музеях Пецярбурга, Віцебска і Мінска унікальная калекцыя. Жывая аналітыка, багаты дакументальны матэрыял, разнастайная іканаграфія (фота, чорнабелыя рэпрадукцыі жывапісных і графічных работ), простасць і лёгкасць аўтарскага стылю, — усё гэта надае даследаванню В. Шышанава вартасць і пазнаваўчага, і папулярнага, і нават займальнага расповеда.

"Сёння філармонія развівае і ўзбагачае свае слаўныя традыцыі, праводзіць вялікую работу па прапагандзе лепшых узораў класічнай, народнай і сучаснай музыкі, арганізацыі канцэртнага абслугоўвання ўсіх рэгіёнаў Беларусі, эстэтычным выхаванні людзей. У яе складзе працуюць вядомыя выканаўцы і унікальныя творчыя калектывы, якія з'яўляюцца гонарам нацыянальнага мастацтва", — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка на адрас Беларускай дзяржаўнай філармоніі з нагоды яе 70-годдзя. На ўрачыстай вечарыне, прысвечанай нашай галоўнай канцэртнай установе, яе лепшыя супрацоўнікі былі адзначаныя ўзнагародамі



Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, Міністэрства культуры, Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. У канцэртнай праграме пад кіраўніцтвам маэстра Міхася Казінца гучала музыка равеснікаў філармоніі —Д. Смольскага і А. Мдзівані, а таксама Я. Сібеліуса. Бетховенскай 9-й сімфоніяй дырыжыраваў Аляксандр Анісімаў.

"Беларуская опера прадстаўляе..." — адна з папулярных рубрык на афішы сталічнай філармоніі. І жанры, якія былі прадстаўлены пад гэтай рубрыкай у адным з лістападаўскіх вечароў, — таксама папулярныя: песня, раманс, вакальны дуэт. Яны ўвайшлі ў праграму з рамантычнаю назвай "Калі пачуцці — як полымя...". Гэта была, можна сказаць, ужо традыцыйная музычная сустрэча публікі з паэзіяй Таццяны Мушынскай: у выкананні салістаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі гучалі вакальныя творы, напісаныя айчыннымі кампазітарамі на яе вершы. Афіша ўражвала знанымі імёнамі: сярод аўтараў музыкі — Э. Зарыцкі, А. Атрашкевіч, Д. Далгалёў, М. Марозава, сярод спевакоў — Т. Глаголева, Т. Гаўрылава, Э. Мартынюк, Н. Масквіна... У музычным суправаджэнні гучалі раяль, віяланчэль, гітара, кларнет. Больш як 10 рамансаў і дуэтаў выконвалася ўпершыню.

С. ВЕТКА
Фота аўтара

Вяртанне да чалавека

У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа — новы спектакль "Васа" паводле класічнай п'есы Максіма Горкага. У галоўнай ролі — народная артыстка Беларусі Святлана Акружная. Пастаноўку ажыццявіў вядомы беларускі рэжысёр, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі, уладальнік многіх прэстыжных міжнародных узнагарод, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рыд Таліпаў. Гутарка з ім адбылася напярэдадні прэм'еры.

— Усё ж такі, чаму Горкі? Наколькі я ведаю, у апошнія дзесяцігоддзі цікавасць з боку і расійскіх, і беларускіх тэатраў да яго творчасці значна знізілася. Чым менавіта вас прывабіла драматургія "буравесніка рэвалюцыі"? Якія акцэнты ў яго апошняй п'есе, напісанай напярэдадні гібелі, вам бы хацелася змяніць ці, можа, узмацніць? У чым ваша рэжысёрская трактоўка адрозніваецца ад драматургічнай?

— Горкі ў часы будаўніцтва камунізму быў амаль крымінальнай фігурай. Яго зрабілі заснавальнікам сацыялістычнага рэалізму і сваім супольнікам, аднадумцам вялікія партыйныя начальнікі, хоць самі ж забаранялі спектаклі паводле п'ес Аляксея Максімавіча.

— Былі такія выпадкі?

— Не проста выпадкі, гэта здаралася даволі часта. Возьмем, да прыкладу, п'есы Горкага "Дачнікі", "Варвары", "На дне", "Апошнія", "Ягор Булычоў і іншыя". Яны для таго часу былі амаль крымінальныя, і рэжысёр мусіў некаторыя моманты прыбраць, змякчыць, што і рабілася, а сёння ёсць магчымасць паставіць Горкага такім, які ён ёсць. І я думаю, што час яго яшчэ наперадзе, бо драматург заўсёды пісаў пра складаныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Героі Горкага прагнуць любові, але ім яе не хапае. Канфлікты ва ўсіх яго п'есах вельмі чалавечыя, а не літаратурныя. Ці актуальная гэта драматургія? Вядома. Настолькі, наколькі актуальнае жыццё. Пра "Васу" зазначу, што раней тут на першы план выводзілі Рашэль — рэвалюцыянерку. А ці правільна гэта з маральнага боку? Рашэль пакінула ў бабулі сына, сама паехала да мужа ў Швейцарыю і цяпер прыязджае толькі з тым, каб аддаць хлопчыка сваёй сястры, якая не мае дзяцей. Калі адна з дачок Васы пытаецца: "Навошта ты нарадзіла сына?", Рашэль адказвае: "Гэта было маёй памылкай". Васа любіць унука і, зразумеўшы, што ён, калі будзе жыць у чужых людзей, стане сіратой, адмаўляе нявестцы. Гэта адна з асноўных падзей спектакля. А ў самым пачатку Васа даведваецца, што мужа будуць судзіць за разбэшчванне малалетніх дзяўчынак. Гэта пагражае вялікім скандалам у горадзе. Рушыцца рэпутацыя сям'і. І яна прапануе мужу выпіць атруту. Іншага выйсця няма. Такім чынам яна ўратоўвае ад ганьбы сваіх дачок. На плечы жанчыны кладуцца праблемы адна за другой, і сэрца яе (яшчэ не старой жанчыны) не вытрымлівае, яна памірае. Наробак усяго жыцця пераходзіць у рукі марнатраўцы, гулякі Прохара — брата Васы, які ва ўсім бачыць нейкую гульню, свята. Канфлікт у спектаклі чыста чалавечы — усім героям не хапае любові адно да аднаго, цеплыні. На сцэне знаходзіцца печка, да якой усе цягнуцца, каб пагрэцца. Паводле жанру спектакль — сямейная гісторыя.

— Гэта ўжо другая ваша пастаноўка ў коласаўскім тэатры. Якія вашы ўражанні ад віцебскіх артыстаў? З кім найбольш прыемна працаваць і чаму?

— Мы, рэжысёры, працуем з тымі, хто ёсць, і не павінны залежаць ад нейкіх асабістых сімпатый ці антыпатый. Я думаю над тым, які артыст зможа існаваць у прапанаваных абставінах найбольш дакладна, для мяне важны яго ўнутраны змест. Менш цікавіць прафесійны вопыт выканаўцы, галоўнае — чалавечы досвед, чалавечы змест. У коласаўскі тэатр я трапіў перш за ўсё дзякуючы Святлане Арцёмаўне Акружной. Мы даўно з ёй пазнаёміліся, доўга ішлі насустрач адно аднаму і сустрэліся ў супольнай працы ў "Кацярыне Іванаўне": там яна стварыла адзін з лепшых сцэнічных вобразаў, багаты зместам, складаны эмацыянальна. Мне здаецца, што цяпер Акружная стварае штосьці новае, ні ў чым не паўтарае свае ранейшыя знаходкі ў "Кацярыне Іванаўне" ці "Бацьку". Для мяне яна з'яўляецца сапраўды вялікай актрысай, цудоўнай жанчынай. Вельмі цікава працуе Валянцін Салаўёў, які стварае вобраз Прохара, шмат знаходак у маладых актрыс — Алены Сладкевіч, Наталлі Саламахі, Ніны Обухавай, Тамары Краснабаевай і іншых.

— Сёння вы прыхільнік псіхалагічнага напрамку ў рэжысуры (хоць і пачыналі з абсурдысцкага, авангарднага тэатра), звязанага найперш з талентам адчування акцёра, уменнем раскрыць яго, стварыць разам з ім "архітэктуру ролі" (дарэчы, ваш выраз). А вось у Расіі модныя рэжысёры (той жа Кірыл Сярэбранікаў) не вельмі ўмеюць (ці не хочуць) выстройваць дыялог, наладжваць узаемадзеянне персанажаў на сцэне, падмяняючы тонкае псіхалагічнае шытво рознымі рэжысёрскімі "фішкамі". Магчыма, гэта нейкае азіранне на сучасны заходні тэатр?

— Тое, што я рабіў у 80-я гады, не было перайманнем заходняга тэатра, мы ў той час не ведалі яго. Гэта было сваё. Мрожака ніхто ў Беларусі не ставіў, Ружэвіча, Зюскінда нават і ў Расіі. Я заўсёды займаўся чалавекам і ў гэтым сэнсе абсалютна не змяніўся, хоць розныя спектаклі, натуральна, адрозніваліся адзін ад аднаго. Лічу, што ў аснове тэатра павінна ляжаць драматургія, і я іду за аўтарам п'есы. Калі ставіў Мрожака, вучыўся жыць, глядзець на свет яго вачыма, і тое ж самае датычыць іншых аўтараў. Лічу абсалютна бесперспектыўнымі тых рэжысёраў, якія глядзяць на драматургію як на матэрыял для сваіх штукарстваў. Таму наша прафесія пачынаецца з найпадрабязнейшага аналізу драматургічнага матэрыялу. Як я магу аднолькава паставіць Горкага і Андрэева, калі ў іх абсалютна розны светапогляд, разуменне жыцця? Таму я лічу, што заўсёды займаюся ўнутранымі праблемамі людзей, а эстэтыка, пра якую ты згадаў, узнікае ад канкрэтнага драматурга. Чаму не займаюцца псіхалагічным тэатрам? А гэта заўсёды рызыка, бо вымагае ад рэжысёра падрабязнай унутранай працы з артыстамі, карпатлівасці, ведання чалавечай і акцёрскай псіхалогіі. Фармальнае вырашэнне знайсці прасцей. Я гэта называю турэцкім тэатрам — калі акцёры пяць мінут гавораць, дзесяць спяваюць, пятнаццаць — танцуюць. Хоць і Турцыя ўжо ад такога адмовілася: там усур'ёз займаюцца Чэхавым. Я ніколі не ішоў за публікай, хоць яе і вельмі паважаю. Гэта публіка павінна ісці за тэатрам. У іншым выпадку трэба ўсе оперы адмяніць, а музеі закрыць. Сёння драматычны тэатр павінен вярнуцца да чалавека, каб глядач прыходзіў не забаўляцца, а пазнаваць сябе, глядзець на сябе збоку. На жаль, вырасла цэлае пакаленне, якое не ведае, што такое сапраўдны драматычны тэатр.

— Рыд Сяргеевіч, вы памятаеце свой самы першы спектакль?

— У якасці прафесійнага рэжысёра?

— А былі і больш раннія спробы?

— У дзяцінстве ў нас была свая дваровая каманда: мы хадзілі па дамах і ладзілі там спектаклі. Ну, значна пазней, у сярэдзіне 1970-х гадоў, у мяне ўтварылася першая ў Беларусі тэатральная студыя "Стэрэа", там я паставіў "Рамэо і Джульету", потым "А зоры тут ціхія".

— Гэта былі эксперыментальныя спектаклі?

— У пэўнай ступені. Хоць я сам тады так не лічыў. Калі пошук назваць эксперыментам, кожная новая работа — эксперымент, бо яна — пошук нязведанага.

— Апрача рэжысёрскай працы, вы яшчэ і выкладаеце ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. А што вам больш падабаецца: педагогіка ці рэжысура?

— Я ніколі не пераставаў быць педагогам, бо ўсялякая рэжысёрская праца без педагогікі проста немагчымая. Як можна без педагогікі працаваць з акцёрамі?

— Але ж яны могуць сказаць: "Мы гатовыя артысты, навошта вы нас вучыце"?

— Ніколі ніводны артыст мне такое не гаварыў, нават Святлана Арцёмаўна: бяруцца працаваць, як студэнты, быццам ніякіх "пагонаў", ніякіх званняў няма. Чым акцёр больш таленавіты, тым больш на пачатку работы ён адчувае сябе вучнем.

— У кожнай творчай асобы, ды і проста ў чалавека ёсць жыццёвыя прынцыпы, ад якіх ён не можа адмовіцца. Якія самыя асноўныя ў вас?

— Найперш — застацца верным самому сабе. Вельмі цаню і ў іншых людзях надзейнасць і дружбу, не прымаю здраду. Калі азірацца назад, не прыпомню сваіх такіх ужо буйных учынкаў, за якія было б сорамна.

Гутарыў
Юрась ІВАНОЎСКІ
г. Віцебск

Юбілейная мазаіка

У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага — свята за святам. Прыхільнікі сцэнічнага мастацтва яшчэ памятаюць, як прыгожа адзначылі тут юбілей мастацкага кіраўніка тэатра, народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнкі. А нядаўна горкаўцы прымалі гасцей на яшчэ адной урачыстай імпрэзе — спраўлялі 75-годдзе свайго творчага калектыву: афіцыйная цырымонія, згадкі пра пачынальнікаў і ўшанаванне патрыярхаў, традыцыйны капуснік і паказ сённяшняй творчасці артыстаў... З юбілеем тэатр павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Лана ІВАНОВА
Фота Аляксандра Дзмітрыева

Амаль месяц наведнікі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі дзівіліся на "Магію колеру" — выстаўку жывапісу і графікі, прысвечаную 35-годдзю Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў. Побач з акварэлямі знанага выкладчыка — Яўгена Саковіча (на здымку) экспанаваліся работы яго лепшых вучняў: Веранікі Восіпавай, Надзі Завадскай, Леры Красновай, Антона Рубашкі, Андрэя Строцава, Максіма Шніпа, творы іншых юных мастакоў, выкананыя

гуашшу, акварэллю, акрылам на палатне, паперы, шкле, кардоне і ДВП.

Я. КАРЛІМА
Фота Кастуся Дробава

Імя Юрыя Іванова ведаюць далёка за межамі Беларусі. У 1990 годзе адзін з яго здымкаў быў прызнаны лепшым фотаздымкам у свеце за дзесяцігоддзе. Таму не дзіва, што выстава фотамайстра ў сталічным Доме кіно зацікавіла вельмі многіх людзей, хаця крыху раней яна экспанавалася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. "Між белым і чорным" — так назваў выстаўку Ю. Іваноў і прысвяціў яе 100-годдзю з дня нараджэння сваіх бацькоў. У Доме кіно размясціліся фатаграфіі з 1960-х гадоў да нашых дзён — работы, часта супрацьлеглыя стылістычна, кампазіцыйна і да т.п. Слушна кажуць, што паводле здымкаў Ю. Іванова можна

сачыць за развіццём эпохі. "Мне здаецца, што гэта выстава майстра, які стаіць не з фотаапаратам, а ля кінакамеры", — заўважыў старшыня праўлення Беларускага саюза кінематаграфістаў Юрый Цвяткоў. Прысутны на адкрыцці выставы скульптар Іван Міско вызначыў сакрэт поспеху знакамітага фотажурналіста — яго неверагодную працавітасць: кожным ранкам Ю. Іваноў некуды спяшаецца са сваёй вялізнай кайстрай...

Алесь КІРЫКОВІЧ
Фота аўтара

Беларускі «тахелесец»

(Працяг. Пачатак на стар.1)

"Тахелес" — накшталт свяшчэннай каровы для творчых людзей у Еўропе. Невытлумачальны і непрадказальны асяродак, ён падтрымлівае мастака, падсілкоўвае, натхняе на міфалагічныя і касмаганічныя сюжэты. Выстаўляцца тут А. Родзін пачаў у 2001 годзе. І цяпер, як піша нямецкая прэса, "уражвае сваімі палотнамі наведнікаў". Яго майстэрня знаходзіцца ў самім будынку "Тахелеса", таму мастак да самай ночы навідавоку, пры ўсіх малюе свае палотны і папаўняе персанальную выставу новымі творамі.

Алесь падкрэслівае: "Я менавіта малюю, а не пішу. Пішаце вы, мастацтвазнаўцы і крытыкі, а я малюю". Каля яго стаяць, моўчкі назіраюць за працай — ад першага мазка на палатне да подпісу пад гатовым творам, зрэдчас задаюць пытанні. Аднойчы падлічыў: з серады па суботу наведала яго каля 1000 чалавек: аўстралійцы, японцы, амерыканцы ды іншыя. Для іх важна ў тваім творы адчуць нерв: тады ты атрымаеш вельмі высокую адзнаку. Праўда, як там прынята, — нешматслоўную. Некалькі прыкладаў з кнігі водгукаў: "Я такога не бачыў. Дзякуй за свет, які ты адкрыў мне" (Крыстаф з Вялікабрытаніі); "Вельмі моцна ўражвае" (Джулія, Ізраіль); "Гэта ўзрушвае. Карціны можна гадзінамі вывучаць" (з Масквы, подпіс); "Вельмі ўражвае, правакуе на роздум" (Крыстаф Блюм, Канада); "Яшчэ адзін сапраўдны мастак, варты, каб яго зразумець" (Марыя; Францыя), "Я амаль гадзіну стаяла ля тваіх палотнаў і старалася пранікнуць ва ўсе дэталі" (Зухра, Палесціна)...

"Цяпер — са шкадаваннем кажа мастак, — жывапіс адыходзіць на другі план. Яго пачалі падмяняць размалёўкамі, графікай, ухіл ідзе ў бок актуальнага мастацтва — відэа, інсталяцыі, але ж гэта тэхна-поп... Я ж спалучаю ў жывапісе авангардныя формы, уношу канструктывізм, касмагенізм, але захоўваю класічную стылістыку". Нямецкія гледачы гэта разумеюць і вельмі цэняць. Яны любяць пагаварыць, паразважаць каля палатна. Алесь — цудоўны субяседнік і з задавальненнем расказвае пра свае творы. А яны, дарэчы, вялізныя: "Міфалагема тысячагоддзя" — 7 х 3 м, "Ноч неапазнаных сутнасцей" — 3 х 4 м, "Фотафініш" — 3 х 5 м і г.д.

Апісваць манументальныя палотны А. Родзіна — справа складаная, лепш адзін раз убачыць. Неардынарныя іх змест і тэхніка выканання. Некаторыя цалкам займаюць сцены ў выставачнай зале. А каб уважліва разгледзець хоць адно з іх, спатрэбіцца некалькі гадзін — столькі драбнюткіх дэталей і так філігранна яны намаляваныя. Поліфанічная і шматгранная творчасць таленавітага і надзвычай працавітага манументаліста змяшчае вялікую колькасць тэм і сюжэтаў, поўніцца складанымі сімваламі. Каб гэтак адлюстраваць свой асабісты свет, трэба жыць у ім кожны дзень. Я пабывала ў майстэрні А. Родзіна і яшчэ раз адчула гэты яго непаўторны творчы свет.

Маляваць ён пачаў яшчэ ў школе.У восем гадоў (гэта было ў 1955-м) адбылася яго персанальная выстаўка з сотні работ, якія Алесь намаляваў за час летніх канікул. Затым ён скончыў у Мінску мастацкую школу, у 1972 годзе — Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер акадэмія). Педагогамі яго былі вядомыя мастакі: І. Ахрэмчык, Н. Воранаў, Х. Ліўшыц, В. Вярсоцкі. Пасля доўгіх пошукаў сябе ў мастацтве, блуканняў, спроб у розных стылях і жанрах, А. Родзін прыйшоў да тэмы, якая ўжо шмат гадоў для яго галоўная, — тэмы ўзаемаўплыву і ўзаемапранікнення чалавека і космасу.

Калі Сусвет складаецца з мноства макра- і мікрачасцінак, у тым ліку і людзей, дык і кожны чалавек — гэта цэлая галактыка з яе "чорнымі дзіркамі" і "белымі плямамі". Калі чалавечае жыццё адносна жыцця планеты — доля секунды, дык і жыццё Зямлі адносна вечнага Космасу — імгненне. Мастак спрабуе зразумець, што ж адбываецца "там" і як гэта адлюстроўваецца "тут", што можа зрабіць чалавецтва, каб працягнуць імгненні зямнога жыцця. Беручыся за працу, ён імкнецца злавіць зарад пазітыўнай энергіі космасу, укласці яго ў карціну і такім чынам паслаць энергетычны імпульс-зарад гледачу.



Бо, як сцвярджае Алесь, без гледача няма мастака і яму самому неабходна "вярнуць" перададзеную праз карціну энергію, хай ужо ў змененым выглядзе. Таму ён з прыемнасцю працуе на вачах у публікі амаль што да раніцы. І прыхільнікаў філасофскага асэнсавання жыцця тэматыка работ А. Родзіна не пакідае абыякавымі. Дарэчы, яго фантастычныя, з элементамі сюррэалізму творы нагадваюць касмічныя пейзажы вядомага беларускага мастака-вандроўніка Язэпа Драздовіча.

Пасля "Тахелеса" А. Родзін заўсёды паказвае сваю выставу ў Мінску, хоча перадаць свае пачуцці і ідэі, свой новы вопыт. Прычым, далучае да вернісажа і фатографаў, і рокераў, дыскатэку з гітарамі, барабанамі, сінтэзатарамі і г.д. , — і усё ў адной прасторы. Мастаку гэта не перашкаджае. "Цяпер у "Тахелесе", — тлумачыць ён, — мне адвялі ўвесь пяты паверх пад майстэрню: гэта 1000 квадратных метраў, а на другім — сярод разбітых і размаляваных дзвярэй — чыесьці інсталяцыі, кучы смецця з надпісам "маё"; побач — пакой, напакаваны суперсучаснай тэхнікай... Так што і рытм, і стыль жыцця адмысловы, і суседзі цікавыя. "Тахелес" прыцягвае, як магніт, самае цікавае, авангарднае, жывое, смелае. Прыходзяць людзі розных узростаў: размаўляюць, п'юць хто каву, хто віно...".

Аляксандр Родзін — мастак, палітыкай не займаецца, але пра сваю сінявокую Беларусь заўсёды памятае, як і пра тое, што яго прозвішча перагукаецца са словам "Радзіма". І таму ў яго неабсяжных манументальных палотнах заўсёды ўбачыш што-небудзь, што нагадае пра Мінск, пра самабытны куточак Беларусі, нешта з яе гісторыі і нашых дзён...

Творы Аляксандра Родзіна вядомыя далёка за межамі Беларусі, і не толькі ў Германіі: у Галандыі, Бельгіі, Іспаніі, Італіі, Францыі, ЗША, Нідэрландах і іншых краінах свету прайшлі яго персанальныя выстаўкі.

Галія ФАТЫХАВА

На здымках: рэклама выстаўкі ў цэнтры Берліна; А. Родзін і яго работы ды "Блакітнае вока" ды "Свабоднае падзенне".

Андэграўнд ці авангард?

Набліжаецца 17 снежня — Дзень беларускага кіно. Гэта нагода паразважаць пра айчынную вытворчасць фільмаў, тым болей, што не так даўно яе апошнія набыткі абмяркоўваліся ў кантэксце XIV Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". Упершыню ў праграму прадстаўнічага форуму быў уключаны конкурс дакументальных стужак. А беларуская дакументалістыка, у адрозненне ад нашага іграваога кіно, заўсёды адпавядала ўзроўню сусветнага экрана... Няштатны карэспандэнт "ЛіМа" гутарыць з супрацоўнікам аддзела кіно и тэлемастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі імя Кандрата Крапівы, выкладчыкам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Галінай ШУР.

— Галіна Уладзіміраўна, у тым, што фестывальныя паказы дакументальных фільмаў адбываліся ў гандлёвым комплексе "Сталіца", у відэацэнтры, размешчаным на самым ніжнім падземным узроўні, можна ўбачыць нейкую сімволіку: сёння дакументальны кінематограф у нас — андэграўнд?

— Спачатку трэба вызначыцца, пра якое дакументальным кіно гаворка. Тое, што за апошнія 5—7 гадоў літаральна хлынула з тэлеэкранаў, дакументальным можна назваць з нацяжкай.

— У прафесіяналаў з'явіўся нават іранічны тэрмін "дакументалка"...

— Так. Пераважна з маскоўскіх тэлеканалаў на нас накаціўся проста вал прадукцыі, якая пад выглядам дакументальнага кіно прапануе нейкі субпрадукт з элементамі дакументалістыкі. Часам гэта цікавыя масаваму гледачу фільмы на гучныя сенсацыйныя тэмы са "смажанымі" фактамі. Мэта іх аўтараў — паднесці інфармацыю спрошчана, замест таго, каб прымусіць гледача задумацца.

У сусветным дакументальным кіно вызначыліся два асноўныя стылёвыя напрамкі. Першы — імкненне паказаць жыццё такім, якое яно насамрэч, прадставіць кінарэальнасць, набліжаную да аўтэнтычнасці. Другі — гэта калі дакументальны матэрыял выкарыстоўваецца дзеля пабудовы новай арт-прасторы. Паняцце "аўтарскі фільм" ахоплівае работы з ярка выяўленым стылем, у якім акрэсліваецца аўтарская індывідуальнасць з яе мастацкай канцэпцыяй, поглядам на свет, вобразным разважаннем. Дарэчы, фільмы гэтага напрамку былі прадстаўлены на сёлетнім "Лістападзе".

— Няпоўная зала на конкурсных і рэтраспектыўных паказах дакументальных стужак, напэўна, сведчыла, што сучасны беларускі глядач страціў цікавасць...

— Сапраўды, за апошнія 20 гадоў, як гэта ні прыкра, культура ўспрымання сур'ёзнага дакументальнага кіно ў нас страчана. Людзі старэйшага ўзросту, відаць, памятаюць, як за савецкім часам у Мінску існаваў спецыялізаваны кінатэатр, дзе круцілі выключна дакументальныя фільмы. Называўся ён "Навіны дня". Там амаль усе сеансы былі аншлагавыя. Гэта было месца паломніцтва творчай інтэлігенцыі і студэнцкай моладзі. Акрамя кінапаказаў тут праходзілі цікавыя вечарыны, сустрэчы са стваральнікамі дакументальнага кіно і г.д. Там гадавалі і выхоўвалі гледача. Калісьці і ва ўсіх кінатэатрах, бадай, перад кожным сеансам абавязкова паказвалі дакументальныя стужкі.

— Да "перабудовы" было што паказваць?

— А як жа! Наогул, савецкае дакументальнае кіно — моцная эстэтычная з'ява. Прафесія была на вельмі высокім узроўні мастацтва. Ва ўмовах партыйнай камуністычнай цэнзуры была створана унікальная кінамова. Беларускія дакументалісты былі ў авангардзе і першымі ў былым СССР распрацавалі гісторыка-культуралагічны жанр. Нашым стужкам надавалі выключна 1-ю катэгорыю. Яны былі запатрабаваныя. Гонар, залаты фонд беларускай дакументалістыкі — А. Канеўскі, В. Сукманаў, Р. Ясінскі, Ю. Лысятаў, рэжысёр-аператар С. Пятроўскі. Легендарная асоба А. Рудэрман, які загінуў на пачатку 1990-х падчас здымак у Таджыкістане.... Сённяшні мастацкі кіраўнік студыі "Летапіс" Міхаіл Жданоўскі і рэжысёр, аператар Юры Гарулёў пасля жудаснага армянскага землятрусу першымі (!) з савецкіх дакументалістаў прыбылі у Спітак. Зрабілі фільм...

Развіццё ў тыя гады сучаснай мадэлі аўтарскага фільма распачынаў таленавіты дакументаліст Аляксандр Карпаў-малодшы, дарэчы, лаўрэат сёлетняга "Лістапада". Нельга абысці маўчаннем Віктара Дашука. А Віктар Аслюк з прафесійных дакументалістаў — адзіны на тэрыторыі былога СССР член Еўрапейскай акадэміі кіно. Толькі за адну сваю стужку "Мы жывём на краі" В. Аслюк атрымаў больш як 40 прэмій і прызоў на вельмі прэстыжных міжнародных фестывалях! Знакамітае імя ў кінадакументальным мастацтве — Галіна Адамовіч. Яе стужка "Завядзёнка" была таксама адзначана на сёлетнім "Лістападзе", а трохі раней на фестывалі ў Кракаве (кшталту Канскага для дакументалістаў. — **А. С.**) заваявала адзін з галоўных прызоў. Фільмы Аслюка і Адамовіч характарызуюцца стылем класічнай дакументалістыкі, у меру інфарматыўнай, у меру сюжэтнай, у меру фактурнай.

— Галіна Уладзіміраўна, а наогул, у якім стане сёння беларуская дакументалістыка, якія ў яе праблемы?

— Мяркую, у стане нейкага чакання. У лепшыя гады БССР на "Беларусьфільме" выходзіла не менш як 30 прафесійных дакументальных фільмаў, сюды трэба дадаць т. зв. заказныя стужкі, навукова-папулярныя часопісы і альманахі. Ёсць праблема фінансавая, і яшчэ адна вельмі сур'ёзная — праблема пераемнасці пакаленняў. Сёння дзве трэція супрацоўнікаў студыі "Летапіс" фактычна пенсіянеры. Каб мастацтва жыло, патрэбна супрацоўніцтва сталых з малодшымі. Гэта натуральны працэс. Пакуль жа нашым шаноўным майстрам няма каму перадаць эстафету прафесіяналізму. Адзіны выпуск спецыялістаў дакументальнага кіно за ўвесь найноўшы перыяд гісторыі Беларусі адбыўся ў 1994 г. (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, курс В. Дашука).

— Я нядаўна даведаўся, што ў Расіі сярод шматлікіх тэлевізійных каналаў з'явіўся і такі, што спецыялізуецца выключна на дакументальным кіно. Ці можам мы пра нешта падобнае марыць?

— Нам прабіцца б спачатку на звычайныя каналы айчыннага тэлебачання... А паказаць жа ёсць што. Дарэчы, на ўрачыстым закрыцці "Лістапада-2007" кіраўнік Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзімір Замяталін звярнуўся да тэлевізійшчыкаў з просьбай часцей паказваць на нашых каналах стужкі айчыннай вытворчасці. Хочацца спадзявацца, што будзе больш увагі і да беларускай кінадакументалістыкі. Тым больш, што у 2008-м студыі "Летапіс" споўніцца 40 гадоў і там плануюць выпусціць 35 дакументальных стужак.

•

Галоўны прыз конкурсу дакументальных стужак на фестывалі "Лістапад-2007" атрымаў фільм "Мае вочы" (рэжысёр Эрленд Е. МО, Данія). Сярод узнагароджаных прызамі журы ў розных намінацыях — работы беларускіх кінематаграфістаў Сяргея Рыбакова ("Крывая Ніва"), Аляксандра Карпава ("Пагаворым на "ты", альбо Сеанс скульптурнай лепкі як псіхааналіз..."); рэжысёр Галіна Адамовіч адзначаная прызам часопіса "На экранах" ("Завядзёнка").

Гутарыў Аляксей СТРЭЛЬНІКАЎ

На здымку: беларускі рэжысёр Аляксандр Карпаў атрымлівае конкурсную ўзнагароду.

Фота Аляксандра Дзмітрыева

Родавае гняздо паблізу возера Шэлахава

Штрыхі жыццёвага і творчага лёсу Генадзя Пацыенкі



Прачытаўшы гэтае прозвішча, тыя хто некалі не прапускаў свежага нумара "Роман-газеты" — выдання, тыраж якога ў свой час дасягаў трох мільёнаў экземпляраў, адразу з прыемнасцю прыгадаюць, што менавіта Генадзь Барысавіч, як галоўны рэдактар "Роман-газеты", браў на сябе права адбіраць для друку самае-самае. Запомніўся Г. Пацыенка і тым, хто ў свой час вучыўся ў знакамітым Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве. Выпускнік гэтай вышэйшай навучальнай установы, аналагаў якой не было ва ўсім свеце, ён некаторы час працаваў там выкладчыкам. Пры гэтым сам нямала пісаў і друкаваўся.

Аднак з-за сваёй прыроднай сціпласці не надта клапаціўся, каб усё гэта належным чынам прарэцэнзавалі. Як бы там ні было, а рэцэнзія, якая своечасова з'явілася ў друку, таксама рэклама. Калі ж крытыка пра цябе піша мала, дык атрымліваецца, што ты знаходзішся як бы ў цені. Хоць нельга забываць і вядомае выслоўе: напісанае застаецца. Асабліва, калі яно пазначана адзнакай таленту. А менавіта так і піша Генадзь Барысавіч. Таленавіта. А яшчэ мае немалы жыццёвы вопыт, а гэта для празаіка вельмі важна, бо дазваляе браць у якасці прататыпаў сваіх персанажаў тых, каго ведаў ці добра ведаеш, а не высмоктваць праблемы з пальца.

Родам Г. Пацыенка — з вёскі Зубакі, што на Лёзненшчыне. Праца галоўным рэдактарам "Роман-газеты", выкладанне ў Літаратурным інстытуце імя М. Горгага, зразумела, — толькі частка яго біяграфіі, той перыяд у ягоным жыцці, калі ён як асоба (не ў апошнюю чаргу творчая), паспеў ужо сфарміравацца. Перад гэтым жа было басаногае маленства, апаленае вайной і азмрочанае няпростымі пасляваеннымі выпрабаваннямі. Затым паспытаў фэзэвушнага хлеба, быў на цаліне, служыў у СА танкістам, працаваў токарам. А пазней ужо, пасля рэдактарства, стаў супрацоўнікам апарата Міністэрства па справах нацыянальнасцей Расійскай Федэрацыі. Менавіта Г. Пацыенка ў свой час падказаў неабходнасць выпуску спецыяльнага нумара часопіса "Жизнь национальностей", прысвечанага ўтварэнню Садружнасці Беларусі і Расіі.

Ягоная армейская служба праходзіла далёка ад родных мясцін — лёс закінуў ажно на Далёкі Усход, а вось рабочую закалку атрымаў у Гродна. Менавіта ў Гродна ім былі зроблены і першыя крокі ў літаратуру. Пачынаў з лірычных запісаў, навел, апавяданняў. А што іскрынка ягонага таленту ніколі не тлела, а хутка ператварылася ў жыццядайны творчы агонь, сведчыць тое, што прадмову да кнігі Г. Пацыенкі, якая выйшла ў маскоўскім выдавецтве "Современник", напісаў Васіль Быкаў.

Дарэчы, пра Васіля Уладзіміравіча ў яго засталіся самыя светлыя згадкі. Паводле ягоных успамінаў, В. Быкаў паўстае шмат у чым не такім чалавекам, як падаюць яго многія. Якім? Хацелася б спадзявацца, што ад вусных згадак Генадзь Барысавіч, нарэшце, пяройдзе да мемуарных згадак і чытач адкрые для сябе шмат новага. Г. Пацыенку ёсць што расказаць. І не толькі пра Быкава, а і пра П. Броўку, П. Панчанку, М. Танка, І. Шамякіна і іншых. Іван Пятровіч, для прыкладу, першае, што рабіў па прыездзе ў Маскву — тэлефанаваў яму і прасіў хутчэй завітаць у гасцініцу. Захавалася ў Генадзя Барысавіча і багатая эпісталярная спадчына. І не толькі з беларускімі пісьменнікамі перапісваўся ён. У ягонай біяграфіі "прапісаліся" і Васілій Фёдараў, Віктар Астаф'еў, Гаўрыіл Траяпольскі, Юрый Бондараў, Васілій Бялоў... Калі кніга ўспамінаў пра літаратараў напішацца, несумненна, яна будзе запатрабавана чытачом, бо ў ёй змесціцца нямала цікавага і невядомага.

Пакуль жа на творчым рахунку Г. Пацыенкі кнігі "Дни среди молний», "Дом без соседей", "Зал ожидания", "Пока пуля летит", "Взрыв души", двухтомнік выбраных твораў і іншыя выданні. Калі коратка казаць пра іхні змест, дык гэта — само жыццё. Праўда, сталы чытач, прачытаўшы такое сведчанне, скептычна ўсміхнецца: а які празаік не адлюстроўвае само жыццё?! Яно то так. Толькі мала ў каго з пісьменнікаў такія моцныя аўтабіяграфічныя моманты, як у Генадзя Барысавіча. Астатняе хаваецца за вядомым флабэраўскім: "Пані Бавары — гэта я сам".

Ахоп жа падзей у яго самы шырокі. Пачынаючы ад таго ж ваеннага і пасляваеннага маленства. Калі б паспрабаваць выстраіць напісанае па часе, дык у нейкай ступені атрымаецца як бы аўтабіяграфічны аповед аднаго героя ў розныя перыяды ягонага жыцця. Няважна, хто гэта: Андрэй Чакалін з аповесці "Под стук колес", герой-апавядальнік — "Деньги на Марсель", Павел Паленін — "Ожидание неудач". Спіс можна доўжыць. Усе гэтыя галоўныя героі, незалежна ад іхняга ўзросту, занятку, прафесіі, прытрымліваюцца высокага маральнага кодэксу. Не таго, зразумела, які называўся маральным кодэксам будаўніка камунізму, а свайго, асноватворныя палажэнні якога выпакутаны падчас жыццёвага сталення і роздуму.

Пастулаты гэтыя, калі да ўсяго падыходзіць коратка, можна звесці да наступнага: "люди с идеями живут дольше", а "заказное счастье" не для тых, у каго да ўсіх і да ўсяго самыя высокія маральныя патрабаванні. Абодва вызначэнні ўзяты з твораў Г. Пацыенкі. А калі што і можна дадаць да партрэта ягоных галоўных герояў , дык тое, што яны — людзі "совестливые". Менавіта рускі варыянт для іхняй характарыстыкі ў дадзеным выпадку падыходзіць як нельга лепш.

Крыху адасоблена ад ўсяго напісанага Генадзем Барысавічам стаіць кніга "Дни среди молний". Яна таксама саткана з перажытага, з'явілася вынікам ягонай паездкі ў якасці саветніка Міністэрства па справах нацыянальнасцяў у Інгушэцію. У Назрані, а таксама ў іншых населенных пунктах, ён на свае вочы пабачыў і адчуў, што такое "каўказская праблема", і пасвойму, аб'ектыўна зірнуў на тое, што ёсць, і сказаў аб тым, што, на ягоную думку, неабходна рабіць, каб пажар у гэтым расійскім рэгіёне не разгараўся далей.

За гэтую кнігу Г. Пацыенку было прысвоена званне ганаровага акадэміка Пушкінскай акадэміі. А мог бы атрымаць яго і за ўсю сваю творчасць, такую моцную гуманістычнымі пачаткамі, напоўненую глабальнымі развагамі і прасякнутую глабальнай празорлівасцю. У яго творчасці прысутнічае тая духоўнасць, што закладваецца ў чалавеку не толькі дзякуючы вялікай начытанасці, празе да дасканаласці, але і прыродай. Гэтыя пачаткі — літаратурны і прыродны — у яго цесна знітаваны. Выхаваны ён на класічных узорах прыгожага пісьменства. Нездарма сярод пісьменнікаў, якімі ён асабліва захапляецца, на першым месцы стаіць Пушкін, хоць і іншыя ягонай любоўю не абдзелены.

Напярэдадні свайго 70-годдзя, а яно прыпала на канец жніўня сёлетняга года, Генадзь Барысавіч прапанаваў часопісу "Беларуская думка" некалькі сваіх новых навел. Яны і былі апублікаваны разам з артыкулам Міхася Кузьміча пра юбіляра "Свет несказанный и негасимый". Паразважаем пра адну з новых навел Г. Пацыенкі "Тень крыла".

Яна — з шэрага тых яго твораў, з якіх прасочваецца ягоная паэтычная душа. Асабліва ўражвае ў навеле шчымлівая любоў да роднай зямлі, да прыроды як да вышэйшай дасканаласці. Зразумела, самая высокая дасканаласць — чалавек, але ён, чалавек гэты, на жаль, часта не заўважае ні гэтай прыгажосці, а яшчэ часцей забывае, што і родную зямлю трэба любіць так, як самага блізкага табе чалавека — да самазабыцця, да самаахвярнасці. І не толькі ў хвіліны духоўнага ўзлёту, а пастаянна. А яшчэ, што таксама немалаважна, нязменна адчуваць сваю кроўную, роднасную сувязь з прыродай. Тады ў табе абавязкова прачнецца паэт. Ты будзеш наталяць смагу зямным хараством і атрымліваць ад гэтага найвышэйшую асалоду:

"В солнечной августовской тиши на исходе лета было невозможно понять: откуда на лицо пала нежданно тень? Непроизвольно, машинально вверх вскинулась голова. Над домом в поблекшей перед осенью голубизне неба кружила неторопливо, будто в некоем раздумье, тройка аистов. И самый крупный на миг застыл, заслонил распластанным широким крылом солнце. И почему-то стало так тихо, как будто птицы только и ждали, когда их кто-то с земли заметит. Я был пронзен этой невольно озарившей меня догадкой и, приложив козырьком ладонь, залюбовался, вглядываясь ввысь.

Было несомненно, что перед отлетом на юг, на свою зимовку, аисты неохотно покидали полюбившуюся им родину".

У творчасці Г. Пацыенкі таксама заўсёды прысутнічае гэты напамінак: любіць сваё гняздо. Гучыць ён спакойна, ненавязліва, не дыдактычна-крыкліва, як гэта робяць сёння многія гараджане якія, у лепшым выпадку, маюць толькі ўласную дачу. Аднак завітаўшы ў вёску, яны ледзь не слязу пускаюць: як тут усё хораша...

Слязу, канечне, пусціць прасцей, чым стала пасяліцца там... У сувязі з гэтым прыгадваецца яшчэ адна навела Генадзя Барысавіча, напісаная ім раней — "Мелодии тихой осени". Чытаючы яе, лёгка правесці паралель з творчасцю шмат якіх пісьменнікаў — і рускіх, і беларускіх, якія гэтаксама, як і Г. Пацыенка, адчуваюць са сваёй малой Радзімай, "самую жгучую, кажучы словамі цудоўнага паэта Мікалая Рубцова самую смертную связь".

Але, не будзем забываць, што ад іншых Генадзь Барысавіч, як мне здаецца, усё ж адрозніваецца. І істотна, бо ў яго лёгка ранімая душа беларуса і шырокая, адкрытая душа расіяніна. Так ужо атрымалася, што ён знаходзіцца як бы на своеасаблівым сумежжы — не толькі дзяржаўных меж (Расійская Федэрацыя пачынаецца праз некалькі кіламетраў ад ягоных Зубакоў), і культур, а калі канкрэтней літаратур — беларускай і рускай, уносячы ў абедзве з іх свой важкі плён. І гэты самы беларус-рускі ці рускі-беларус вучыць іншых — і беларусаў, і рускіх, што ёсць у нас куды больш таго, што нас аб'ядноўвае, чым таго, што раз'ядноўвае.

Ды вернемся да навелы "Мелодии тихой осени». Сапраўды, у гэтым творы гучыць мелодыя — ціхая, шчымліва-спакойная і, як бывае ў падобных выпадках, элегічная:

"Он дышал яблоками, и они казались самыми наилучшими из всех пробованных. Живя в городах, он не видел подобных ни на рынках, ни в магазинах". Самотлівасць настрою ўзмацняецца: "Снимать плоды в родном саду он мог бы и каждую осень. Но в юности его и сверстников убеждали что-то осваивать, добывать, прокладывать — как необходимейшее и важнейшее".

Літаральна праз некалькі радкоў напоўніцу паўстае суровая праўда сённяшняй вясковай рэчаіснасці ва ўсёй яе безгаспадарчасці і бязладдзі, якая, нібыта пырнік той, трымаецца за глебу: "Снимая яблоки, он не переставал оглядываться. Повсюду стояли такие же оскудевшие сады. Даже покинутые, забытые, неухоженные они продолжали плодоносить. А сколько бы вызрело на них яблок при постоянном догляде? И каких, каких яблок?

А пока они отрывались и вздрагивающе падали на затравенелую пожухлую землю.

И за целый день в забытом саду так и не открылась дверь дома. Так и не вышел никто на усыпанное листвой крыльцо, прикоснуться к мелодии тихой осени".

На шчасце, "самая жгучая, самая смертная связь" з вёскай засталася, не парушылася ў такіх людзей, як Г. Пацыенка. Уся мітусня падаецца нявартай увагі, калі поруч адчуваеш сапраўднае выпраменьванне дабра, шчодрасці, цеплыні...

Думаю, гэта самае адчувалі, прыязджаючы ў Зубакі, і М. Рубцоў, і Іван Стаднюк, і многія касманаўты, і супрацоўнікі Цэнтра ўпраўлення палётамі... Як напамінак засталіся пасаджаныя імі дрэвы.

Я свайго дрэва на ёй яшчэ не пасадзіў, але пасля свайго другога наведвання Зубакоў, вярнуўся дахаты з падараванай Генадзем Барысавічам "книгой избранных откровений", што пад назвай "Взрыв души" выйшла ў Маскве. На ёй аўтограф "Алесю Андреевичу Мартиновичу — на добро и память от автора — с просьбой приезжать чаще на хутор Зубаки. Ген. Пациенко. 7 сентября 2007 г., Лиозненщина".

Мне часам сніцца радавое гняздо Генадзя Барысавіча. Быццам увачавідкі бачу тое, што дакладна перадаў у сваім артыкуле-нарысе пра Г. Пацыенку М. Кузьміч:

"Домик родителей, согретый и обласканный его теплом, заботами и любовью, стоит в стороне от деревни, но уже с центральной дороги видны резные наличники крыльца и окон, еще отцовский сад, рядом с верандой, между липами, основательная скамья — почти как у многих именитых русских писателей прошлых столетий. Она — атрибут его житья-бытья.

Вокруг дома аккуратный забор и небольшой дворик, где, как будто бы всматриваясь в пространство жизни и ожидая неведомого жильца, пока сиротливо стоит собачья конура. Рядом с ней древяник, справа, в десятке шагов от него, небольшая банька — особая его гордость. Летом на огороде — несколько грядок и раздолье для разнотравья и медоносов — как раз достаточно для семей пчел, ульи которых приютились под яблонями. И густая засень деревьев по периметру забора".

Бачу і самога гаспадара з даверліва-адкрытым позіркам ягоных прыгожых вачэй, у якіх, здаецца, умясціўся ўвесь блакіт нябёсаў.

Думаю, што абавязкова яшчэ завітаю сюды — у пацыенкаўскія Зубакі — яго родавае гняздо, на ягоную малую радзіму, дзе ён жыве цяпер пастаянна.

Зубакі там, дзе возера Шэлахава. Хоць правільней сказаць, што яны знаходзяцца там, дзе жыве Генадзь Пацыенка.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Генадзю Пацыенку ёсць што расказаць. І не толькі пра Быкава, а і пра П. Броўку, П. Панчанку, М. Танка, І. Шамякіна і іншых. Іван Пятровіч, для прыкладу, першае, што рабіў па прыездзе ў Маскву — тэлефанаваў яму і прасіў хутчэй завітаць у гасцініцу. Захавалася ў Генадзя Барысавіча і багатая эпісталярная спадчына. І не толькі з беларускімі пісьменнікамі перапісваўся ён. У ягонай біяграфіі "прапісаліся" і Васілій Фёдараў, Віктар Астаф'еў, Гаўрыіл Траяпольскі, Юрый Бондараў, Васілій Бялоў...

Напрыканцы кастрычніка ў экспазіцыйнай зале Палаца культуры чыгуначнікаў адбылася выстава жаночай творчасці "Натхненне-2007", арганізатарам якой выступіла мінскае гарадское грамадскае аб'яднанне "Супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын". Наведвальнікі маглі пабачыць працы народных майстроў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў шматлікіх тэхніках выканання: аплікацыя кветкавым пухам, ручная вышыўка, карункапляценне, батык, фларыстыка, упрыгожанні са скуры і паўкаштоўных камянёў, мастацкае выпальванне па тканіне, бісерапляценне, вышыванне бісерам ды іншае. У экспазіцыі — работы жанчын-майстроў з розных рэгіёнаў нашай краіны. Прыкладам, Галіна Логінава (Светлагорск) Таццяна Акуленка і Антаніна Уласава (Бабруйск)...

«Натхненне-2007»

Галоўная ідэя выставы — працягнуць увагу грамадства да здольнасцяў творчага самавыяўлення жанчыны. Удзельніцы жаночай гарадской грамадскай арганізацыі — прадстаўніцы самых розных прафесій, сацыяльных груп і ўзросту. А аб'ядноўвае іх адно — любімая справа, вынікам якой з'яўляецца прыгожая рэч. Працуюць майстры ў розных тэхніках, але калі пачынаеш разглядаць іх работы, то разумееш, што кожны кірунак цікавы, яркі і незвычайны.

Невялікая па плошчы выставачная зала змясціла незлічоную колькасць аўтарскіх работ. Адной з галоўных, сімвалічнай па сэнсе, лічыцца выява рукадзельніцы, якую вышыла крыжыкам Галіна Арцюшэўская. Дарэчы, пры стварэнні гэтага шэдэўра майстар выкарыстала сто восемдзесят каляровых адценняў нітак.

Прыцягвала ўвагу і іншыя работы ў тэхніцы вышыўкі, у якіх акрамя нітак майстрыхі выкарысталі бісер.

Яркія фарбы вышываных работ вабяць вока багаццем колераў, і, нібы ў процівагу ім, — чорна-белыя працы ў той жа тэхніцы. І ў кожным творы, як каляровым, так і чорна-белым, існуе свая непаўторная прыгажосць.

Майстар фларыстыкі Сафія Лях, якая працуе з кветкавым пухам, прадставіла на выставе свае новыя работы: рэпрадукцыі карцін амерыканскага мастака Рокуэла Кента і яго партрэт. Сафія Адамаўна з дапамогай пуха з дзьмухаўцоў перадала суровую прыгажосць чорна-белых пейзажаў Аляскі і Грэнландыі.

У рамках выставы праходзілі прэзентацыі, творчыя сустрэчы і музычныя гасцёўні. А для тых наведвальнікаў, хто захацеў паспрабаваць стварыць нешта сваімі рукамі, праводзіліся майстар-класы. Мне ўдалося пабачыць адзін такі занятак, калі маладыя дзяўчаты пад кіраўніцтвам майстра Галіны Кірылюк стварылі простыя, але прыгожыя рэчы з бісеру. Замацаваць першы поспех і далей спасцігаць навуку бісерапляцення дзяўчаты могуць у спецыяльным клубе.

Падчас агляду экспазіцыі можна было пазнаёміцца і з самімі майстрыхамі. Вельмі захапіў наведвальнікаў стэнд з работамі Галіны Кірылюк. Майстрыха не толькі цікава прадставіла свае работы — упрыгожанні з бісеру і паўкаштоўных камянёў, але і расказала, як правільна падабраць пацеркі, бранзалет альбо завушніцы. Па словах Галіны Пятроўны, аніякія знакі задыяку тут ні пры чым. Галоўнае — ведаць уласцівасці камянёў і ўлічваць колер самога ўпрыгожання. Своеасаблівая творчая рыса гэтай майстрыхі заключаецца ў тым, што яна пачынае работу над новым вырабам з "размовы" з каменем. Ён сам падкажа, што можа з яго атрымацца і ў якім спалучэнні.

У тых, хто працуе з камянямі, да гэтага матэрыялу своеасаблівыя, вельмі трапяткія адносіны. У гэтым я пераканалася, пазнаёміўшыся з выдатным майстрам Станіславай Шчыгловай. Яе работы з камянёў і бісеру заслугоўваюць асобнай увагі. Жанчына стварае пацеркі, завушніцы ды іншыя аксесуары са старых упрыгожанняў. Спадарыня Станіслава верыць, што менавіта такія "спадчынныя" рэчы валодаюць асаблівай энергетыкай. Увогуле, вельмі цікава даць новае жыццё старой камеі з бабулінай завушніцы, са зламанай, напрыклад, засцежкай, якую хтосьці іншы проста б выкінуў. Але згаданая майстрыха ператварае былую завушніцу ў прыгожы медальён, аздабляе паўкаштоўнымі камянямі і — атрымоўваецца цудоўная рэч, якую марыла б мець кожная сучасная модніца.

Разглядаючы ўсе творы выставы, выкананыя ў самых розных накірунках і тэхніках, да кожнага наведвальніка, магчыма, прыходзілі думкі пра тое, як хацелася б мець дома хоць бы адзін з гэтых шэдэўраў. Кожная аўтарская рэч — эксклюзіўная і непаўторная. Патрабуе ад майстра шмат часу, намаганняў, фантазіі і натхнення, у кожную працу закладзена частка душы аўтара.

Выстава "Натхненне" адбываецца штогод. У наступны раз, праз год, нас зноў будзе чакаць сустрэча з таленавітымі майстрамі і іх новымі цікавымі работамі. А тых нашых чытачоў, хто ўжо цяпер хоча бліжэй пазнаёміцца і з майстрамі, і з іх работамі, альбо трапіць на майстар-клас ці пабываць на творчых сустрэчах, якія арганізоўваюцца грамадскім аб'яднаннем "Супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын", запрашаем зазірнуць на сайт у Інтэрнеце: http://sunlight.iatp.by Там можна знайсці ўсю неабходную інфармацыю.

А нам, наведвальнікам выставы, застаецца толькі падзякаваць арганізатарам і ўдзельніцам за магчымасць пабачыць выдатныя творчыя работы і пазнаёміцца з іх цікавымі аўтарамі.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

На здымках: падчас выставы.

Фота аўтара

З увагай да прыгожага пісьменства

Часам падзеяй у гісторыі айчыннага перыядычнага друку становіцца юбілей той ці іншай раённай газеты. Вось і "Пухавіцкія навіны" — выданне, якое традыцыйна ўважлівае да культуры, асветніцтва.

У газеце ў розныя гады працавалі пісьменнікі Антон Бялевіч, Браніслаў Зубкоўскі, вядомы ў Беларусі краязнаўца Анатоль Ярохін. Зараз літаратурным аб'яднаннем пры райгазеце кіруе член Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольга Савасцюк. А самой газетай "Пухавіцкія навіны" ўжо больш як 20 гадоў кіруе Браніслаў Казіміравіч Яблонскі. Яму споўнілася 60 гадоў. Паважаны ў Мар'інай Горцы, на Пухавіччыне чалавек, дэпутат раённага савета, ён звязаў свой лёс з радзімай Міхася Чарота і Анатоля Вольнага яшчэ ў 1981 годзе.

Газета "Сцяг працы" за гэтыя гады стала "Пухавіцкімі навінамі". Але па-ранейшаму ўважлівая да беларускай літаратуры. Працуе літаб'яднанне, рэгулярнымі з'яўляюцца выпускі літаратурнай старонкі. Жыхары раёна з цікавасцю чытаюць вершы сваіх землякоў. Часта друкуюцца ў "Пухавіцкіх навінах" паэты, празаікі, літаратурныя крытыкі, лёс якіх так ці іначай спрычыніўся да Пухавіччыны. Уважлівая раёнка да юбілеяў пісьменнікаў-землякоў. Як прыклад — ушанаванне і ўганараванне на старонках "Пухавіцкіх навін" Васіля Гарбацэвіча, Міхася Чарота, Аркадзя Моркаўкі, Захара Біралы, Таісы Бондар. У газеце ёсць рубрыка "Пісьменнікі Пухавіччыны". Асобная тэма — лёс, жыццё, творчасць, повязь з краем народнага песняра Беларусі Якуба Коласа, які ў 1930 — 1950-я гады летаваў у пухавіцкіх вёсачках. Часты аўтар газеты — доктар тэхнічных навук, сын класіка айчыннай літаратуры Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч.

Рэалізацыя ўсіх гэтых творчых праектаў, канечне ж, была б немагчымая без руплівасці,арганізатарскіх і творчых зацікаўленняў Браніслава Казіміравіча Яблонскага. Народжаны ў нясвіжскай вёсцы Дубяўкі, журналіст у свой час працаваў у Старых Дарогах. Як плён тых гадоў — дзве гісторыка-краязнаўчыя кнігі пра Старадарожчыну. Веданне жыцця на Пухавіччыне, сустрэчы з многімі яе ўраджэнцамі, некаторыя ўласныя росшукі па гісторыі краю, хацелася б спадзявацца, яшчэ падштурхнуць Браніслава Яблонскага на краязнаўчую работу па стварэнні біяграфіі Пухавіцкага раёна.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Прэмія — мастаку

Ушанаванне памяці выдатнага літаратара, сатырыка Кандрата Крапівы і ўручэнне Літаратурнай прэміі яго імя мастаку, заслужанаму дзеячу мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргею Волкаву — адразу два мерапрыемствы сабралі пісьменнікаў і аматараў літаратуры ва ўтульнай зале Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

— 85 год таму на нашым літаратурным небасхіле з'явілася новая, "сатырычная" зорка — менавіта ў 1922 годзе ў газеце "Красноармейская правда" быў надрукаваны вершаваны фельетон "Жылі-былі" Кандрата Крапівы, — адзначыла загадчыца экскурсійнага аддзела музея Вольга Гулева.

Вядомы пісьменнік пачынаў свой творчы шлях менавіта як паэт-сатырык. Ён быў першым рэдактарам часопіса сатыры і гумару "Вожык".

У 2002 годзе па ініцыятыве паэта Міхася Пазнякова, колішняга рэдактара "Вожыка", рэдкалегія часопіса прыняла рашэнне аб заснаванні прэміі імя Кандрата Крапівы ў галіне сатыры і гумару. Заснаванне ўзнагароды прымеркавалі да 80-годдзя творчай дзейнасці народнага пісьменніка. Прэмія ўручаецца кожны год не толькі выбітным сатырыкам-літаратарам, якія друкуюцца на старонках "Вожыка", але і мастакам, якія працуюць на сатырычнай ніве.

— Невыпадкова тут прадстаўлены працы мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргея Волкава. Ён плённа супрацоўнічае з часопісам "Вожык", і рэдакцыя вырашыла, што менавіта яму будзе ўручацца наступная прэмія імя Кандрата Крапівы за малюнкі, надрукаваныя ў 2006 годзе, — падкрэсліў у сваім уступным слове Уладзімір Саламаха, галоўны рэдактар часопіса.

— Часопіс ажыў дзякуючы таленту Сяргея Волкава, які працягвае славутыя традыцыі вядомай дынастыі беларускіх мастакоў Волкавых. Сярод іх — дзед лаўрэата, народны мастак Беларусі Валянцін Волкаў, і бацька — вядомы беларускі графік Анатоль Волкаў, які з 1945 па 1980 год працаваў у часопісе "Вожык", — адзначыў Міхась Пазнякоў.

Сяргей Волкаў афарміў больш як 200 кніг, намаляваў больш 100 сатырычных плакатаў.

Падчас вечарыны Міхась Пазнякоў прэзентаваў кнігу "Падарожжа ў краіну загадак" з ілюстрацыямі новага лаўрэата прэміі імя Кандрата Крапівы.

Аддаць даніну павагі народнаму пісьменніку і павіншаваць заслужанага мастака прыйшлі пісьменнікі і паэты Казімір Камейша, Янка Сіпакоў, Навум Гальпяровіч, Яўген Хвалей, Янусь Малец, Юлія Зарэцкая і іншыя, а таксама сваякі Кандрата Крапівы.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Бібліятэка і чытач заўсёды разам

Уздзенскі край... Тут кожны населены пункт — незабыўны куточак даўніны, кожны жыхар — унікальны носьбіт нацыянальнай памяці, сведка памятных падзей. Прыгожы, утульны куточак Уздзеншчыны, вёска Цялякава, знаходзіцца ў маляўнічых мясцінах, тут жывуць добразычлівыя людзі, якія нягледзячы на бясконцыя хатнія справы, спяшаюцца наведаць Цялякаўскую сельскую бібліятэку...

Вёска Цялякава, цэнтр сельскага савета, мае цікавую гісторыю. У пісьмовых крыніцах паселішча ўпамінаецца з XVI стагоддзя. У той даўні час на гэтай зямлі гаспадарыў князь Радзівіл.

Сёння гэтая вёска, дзе пражывае 253 чалавекі. Тут размешчаны сярэдняя школа, Дом культуры, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін і бібліятэка. А ўзначальвае бібліятэку прыгожая, шчырая, душэўная жанчына, якая працавала дагэтуль настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, Ала Сяргееўна Шыбко.

Пра багатую і непаўторную біяграфію сваёй вёскі, малавядомыя старонкі яе гісторыі і людзей яна імкнецца расказаць сваім чытачам і аднавяскоўцам. Бібліятэка размешчана ў адным памяшканні з сельскім Домам культуры. Яе наведваюць амаль усе вяскоўцы. Восем ветэранаў вайны і працы абслугоўваюцца па месцы жыхарства. Маецца два пункты выдачы ў вёсках Ялоўка і Міколка.

Сярод чытачоў — людзі пенсійнага ўзросту, якім неабходна ўвага, клопат, дапамога. Таму ў 2006 годзе Ала Сяргееўна прапанавала аб'яднацца ў клуб "Узрост не перашкода". Гэтая ідэя зацікавіла людзей, і неўзабаве адбылося першае пасяджэнне напярэдадні дня пажылога чалавека "Каб восень была залатой". Потым было праведзена на "багатую Куццю" — свята нацыянальнай кухні "Мой край, мой рай бульбяна-жытны", на якім бабулі дзяліліся рэцэптамі сваіх страў, распавядалі прысутным, чым іх кармілі ў дзяцінстве, частавалі смачнымі выпечкамі.

На працягу года Ала Сяргееўна ладзіць цікавыя мерапрыемствы па розных тэмах. Для дзецей і моладзі прайшлі ўрокі "Калі хочаш быць здаровым — загартоўвайся", "Лепш папярэдзіць наркаманію, чым лячыць"; дыялогі за "круглым сталом" "Наша жыццё без шкодных звычак", "Ва ўсім патрэбна мера" (аб карыстанні касметыкай), "Дрэнныя звычкі. Як ад іх адмовіцца?" і інш. Нямалая ўвага надаецца рабоце з маленькімі наведвальнікамі бібліятэкі.

Сёлета для ўсіх жыхароў вёскі быў прапанаваны месячнік традыцыйнага мастацтва, падчас якога былі арганізаваны выставы: "З крыніц народнага майстэрства", "Умельцы вёскі беларускай", вечарына "Майстэрствам рук іх ганарымся".

Акрамя таго, Ала Шыбко піша вершы, байкі, апавяданні, музыку да сваіх вершаў і прыгожа спявае. Ала Сяргееўна з'яўляецца членам літаратурнага аб'яднання "Нёманец", які створаны пры мясцовай газеце "Чырвоная зорка" і Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Труса. Прымае актыўны ўдзел у раённых конкурсах, такіх як "Жыве крапівінскае слова", "Мацярынскае поле" (стала лаўрэатам у адной з намінацый), "Жыве мая вёска". У гэтым годзе аддзел бібліятэчнага маркетынгу Уздзенскай ЦБС выдаў зборнік вершаў Алы Шыбко "Мая папараць-кветка" ў серыі "Бальзам жывых крыніц".

З дапамогай кнігі Ала Сяргееўна робіць усё магчымае, каб жыццё ў маленькай вёсачцы было цікавым і разнастайным, каб прытулак у бібліятэцы знаходзілі чытачы рознага ўзросту.

Аксана ДРАЧАН,
метадыст Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса

Жыццё даруецца, каб яго расходаваць, а не зберагаць.
Д.Г. Лоўрэнс

Нотынгемскі дзённік

Напрыканцы лета 2007 года ў Нотынгеме (Англія) праходзіла XI міжнародная канферэнцыя, прысвечаная творчасці Д. Г. Лоўрэнса.

Імя гэтага пісьменніка вядома ва ўсім свеце. Ён нарадзіўся 11 верасня 1885 года ў мястэчку Іствуд, каля Нотынгема, і памёр 2 сакавіка 1930 года ў Вэнсе, на поўдні Францыі. Але пазней, у 1935 годзе, яго жонка, памятаючы пра мару Лоўрэнса аб ідэальным грамадстве, якое б існавала ў поўнай гармоніі з прыродай далёка ад еўрапейскай цывілізацыі, арганізавала эксгумацыю, крэмацыю і перазахаванне цела Лоўрэнса ў Кайова Ранча, Нью Мексіка (ЗША), дзе сям'я жыла некаторы час.

Яго бацька быў напалову адукаваны шахцёр, ад якога малы Берт (ён любіў, каб менавіта так яго называлі) пераняў непасрэднасць успрымання жыцця, павагу да працы і імкненне да прыгажосці ўсяго прыроднага і жывога. Ад маці, былой настаўніцы, якая паходзіла з сям'і збяднелых арыстакратаў, Лоўрэнсу дасталася цяга да ведаў, вытанчанасць манер і пачуццяў, творчыя здольнасці і інтэлект. З самога нараджэння ён назіраў сацыяльны канфлікт у сваёй сям'і. Яго жыццёвая драма ўзмацнялася і фатальным захворваннем лёгкіх. Скончыўшы школу, будучы пісьменнік вучыўся ў Нотынгемскім універсітэце, працаваў клеркам на фабрыцы хірургічных інструментаў, а затым — школьным настаўнікам.

У 1912 годзе ён сустрэў Фрыду Уіклі (народжаную фон Рыхтхофен), жонку свайго універсітэцкага прафесара, якая дзеля Лоўрэнса пакінула свайго мужа і трох дзяцей і далучылася да цяжкага пісьменніцкага лёсу.

За сваё параўнальна нядоўгае жыццё Д. Г. Лоўрэнс пабачыў мноства краін свету, стварыў 40-томную літаратурную спадчыну — раманы, самыя вядомыя з якіх — "Сыны і любоўнікі" , "Вясёлка", "Закаханыя жанчыны" , "Кенгуру" , "Каханак ледзі Чатэрлі" , апавяданні і аповеды, вершы, эсэ, лісты... Акрамя таго, Лоўрэнс — таленавіты мастак, прадстаўнік мадэрнісцкага жывапісу.

У гісторыю літаратуры Д. Г. Лоўрэнс увайшоў перш за ўсё як стваральнік рамана "Каханак ледзі Чатэрлі", што пасмяротна прынёс яму славу і зрабіў амаль што рэвалюцыю ў свядомасці людзей. Шчырае і паўнацэннае каханне ва ўсіх яго адкрытых і падсвядомасных праявах мастак паставіў вышэй за грамадскія правілы і прымхі, аспрэчваючы непарушнасць шлюбу, якому нестае пяшчоты і пачуццёвай ласкі.

Тое, што Лоўрэнс працаваў і ў іншых мастацкіх жанрах — паэзія, драма, філасофскае, псіхалагічнае, літаратурна-крытычнае эсэ, дарожныя нататкі — робіць яго не толькі літаратарам, але і выдатным мысліцелем XX стагоддзя.

Творчасць Лоўрэнса часта выглядае супярэчлівай: яго лічаць прапаведнікам цялеснага кахання, але ён заўсёды ўсхваляе высокую духоўнасць і мараль; яго заклікі да вяртання ў прыроду і да пачуццёвай свядомасці перамяжаюцца з яго глыбокімі роздумамі пра стан грамадства і лёс чалавецтва... Менавіта яго творы кінулі выклік існуючым кансерватыўным светапоглядам, стымулявалі нараджэнне новага мыслення ў цэлым шэрагу галін. І нават пасля смерці пісьменніка яго ідэі прадаўжаюць уплываць на мараль, палітыку і на экалагічную свядомасць людзей.

Цікава, што ў сваіх вандроўках па свеце Лоўрэнс адчуваў сябе нібыта ізгой альбо ссыльны. І не дзіўна: калі ў 1915 годзе ён вяртаецца на радзіму па прычыне пачатку сусветнай вайны, ён вымушаны сутыкнуцца з іншай вайной, што была аб'яўлена яму грамадствам. Пахіснутая рэпутацыя ў сувязі са зводам чужой жонкі была нішто ў параўнанні з "вогнішчам інквізіцыі", на якім гарэла яго "непрыстойная" кніга — раман "Вясёлка". Лоўрэнса мучаў туберкулёз, пачыналася галеча. Апроч таго, яго падверглі паліцэйскаму пераследу, падазраючы ў шпіянажы на карысць Германіі (жонка — немка па паходжанні). Пасля яго абвінавацілі ў адмове ад ваеннай службы. А на самай справе — тры разы выклікалі і кожны раз прызнавалі непрыгодным да ваеннай службы ў сувязі з хворымі лёгкімі.

У 1926 годзе Лоўрэнс пасля вандровак па свеце нарэшце зноў вярнуўся ў шахцёрскі Іствуд...

Упершыню ў жніўні 2007 года на радзіме пісьменніка адбылося важнае мерапрыемства: міжнародная канферэнцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Д.Г. Лоўрэнса.

Непазбежнай тэмай многіх дакладаў была вайна. Адносіны пісьменніка да "масавай разні" былі поўныя адчаю і болю. Цікавым вынікам дыскусій стала ідэя аб сувязі паміж вайной і каханнем, што робіць Лоўрэнса арыгінальным прадвеснікам маральнай каштоўнасці здаровых чалавечых адносін.

Невялікае мястэчка Іствуд, малая радзіма пісьменніка, мае дом-музей з сувенірнай і кніжнай крамай, дзе кожны наведвальнік можа забраць з сабой нейкую часцінку таго, што потым доўга будзе нагадваць знаёмства са святая святых для кожнага фаната ці даследчыка творчасці Лоўрэнса.

А ў Нотынгемскім універсітэце, дзе, дарэчы, Лоўрэнс "наставіў рогі" свайму выкладчыку, знаходзіцца буйнейшы ў свеце фонд рэсурсаў Д.Г. Лоўрэнса: усе яго творы ў розных выданнях і рукапісных манускрыптах, рэпрадукцыі і некаторыя арыгіналы яго карцін, эсэ і лісты.

Адказы на пытанне аб папулярнасці і прыцягальнай сіле твораў пісьменніка я знайшла, прыняўшы ўдзел у рабоце XI міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай Лоўрэнсу, — "Вяртанне ў Іствуд". Канферэнцыя ў чарговы раз (я была ўдзельніцай дзвюх у Парыжскім універсітэце ў 2006 і 2007 гг.) пацвердзіла і замацавала маю ўпэўненасць у тым, што Д.Г. Лоўрэнс не проста адзін з пісьменнікаў — гэта цэлы культурна-свядомасны пласт, дзе спалучаюцца мастацкія, філасофскія, псіхалагічныя, сацыяльныя і нават педагагічныя ідэі.

У рабоце канферэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі больш чым 10 краін свету (118 чалавек). Беларусь была прадстаўлена ўпершыню. Апроч лекцый і пленарных дакладаў, працавала 10 секцый, якія ў сваю чаргу былі падзелены на падгрупы.

Вывучаючы Лоўрэнса, вывучаеш і сябе. Таму, напэўна, адной з самых распаўсюджаных тэм на канферэнцыі была біяграфія пісьменніка. На адной з прысвечаных асабістаму лёсу аўтара секцыях знакаміты сучасны біёграф Лоўрэнса Джон Уортэн давеў да ведама слухачоў новыя (!) звесткі аб жыцці Фрыды фон Рыхтхофен яшчэ да знаёмства з Лоўрэнсам. Былі агучаны і новыя вынаходніцтвы: Лоўрэнс і Аўстралія, Лоўрэнс і Італія, успрыманне пісьменніка ў Даніі, Іспаніі, Індыі і яшчэ Бог ведае ў якіх кутках свету. Гэтыя мультынацыянальныя падыходы ў сваю чаргу выклікалі, напрыклад, новае прачытанне знакамітага рамана "Каханак ледзі Чатэрлі" праз прызму этрускай міфалогіі і індуісцкай тантры.

Адным з цэнтральных месцаў сярод розных падыходаў да творчасці Лоўрэнса займаў псіхааналіз. Прадстаўнік Канады аналізаваў адну з навел з дапамогай архетыпу трыкстэра, а дакладчыца з ЗША пазнаёміла з адным з найноўшых вынаходніцтваў у псіхааналітычнай крытыцы — поглядам французскага псіхааналітыка Андрэ Грына на "Комплекс мёртвай маці" і з асабістымі высновамі па рамане "Сыны і любоўнікі", дзе за аснову браліся не фрэйдаўскія падаўленыя жаданні ці комплексы, не юнгіанскія архетыпы, а пачуццё жалобы па памерлай маці. Гэта праблема, як у сусветным псіхааналізе, так — а, можа, і большай ступені — у літаратуразнаўстве з'яўляецца цэнтральнай. Цяпер "балем кіруе" не "памерлы бацька" як падсвядомасны вобраз, а памерлая маці як рэальная страта. Смерць маці — матыў творчасці не толькі Д.Г. Лоўрэнса. Гэты элемент сюжэта наогул папулярны ў сучаснай літаратуры. І як даказала даследчыца — Элізабет Фокс — мова ўрону, страты і няшчасця вызначае ўвесь раман "Сыны і любоўнікі". Адным з удзельнікаў канферэнцыі была зорка літаратуразнаўства ў сусветным маштабе — славутая Сандра Гілберт, крытык, паэтка, заслужаны прафесар Каліфарнійскага універсітэта, сааўтар кнігі, што перавярнула сусветную крытычную думку "Шалёная ў каморы: Жанчыны-пісьменнікі і літаратурныя фантазіі XIX стагоддзя".

Сваю новую кнігу Сандра Гілберт прысвяціла праблеме перажывання смерці блізкага чалавека — "Пад дзвярыма смерці: Сучасная смерць і віды жалобы" (2006). У сваім дакладзе Сандра Гілберт таксама акцэнтавала ўвагу на танаталагічных пытаннях сучаснай літаратуры. Але войны і катастрофы, страты блізкіх людзей здараюцца не толькі на старонках раманаў. І таму праблематыка і сімволіка смерці ў мадэрнісцкай літаратуры і ў паэзіі Лоўрэнса ў прыватнасці сталі аб'ектам даследавання С. Гілберт, што памагае асэнсаваць цэнтральныя праблемы існавання чалавека.

Яшчэ адным адкрыццём у адносінах да творчасці Д.Г. Лоўрэнса (па сутнасці, гэта выключна актуальна ў наш час) было фарміраванне некалькіх канферэнц-секцый па тэме "Хвароба". Беручы за аснову эсэ Сюзэн Сонтаг "Хвароба як метафара" (1978) Джудзіт Рудэрман (першая жанчына-прэзідэнт лоўрэнсаўскай асацыяцыі Паўночнай Амерыкі, аўтар манаграфіі "Д.Г. Лоўрэнс і маці, што знішчае") кіравалася тым пастулатам, што хвароба ў шырокім сэнсе гэтага слова можа служыць трапным ключом да разумення не толькі Лоўрэнса, але і яго часу. С. Сонтаг меркавала, што хвароба, асабіста калі яе прычына невядома, можа скопліваць вялікае мноства сэнсаў, што могуць адносіцца як да асабістага, так да нацыянальнага характару ў вызначаны перыяд. І, такім чынам, медыцынскі стан у той жа ступені адлюстроўвае гістарычнае становішча, што і любы іншы культурны кампанент. Даследчыца сцвярджае, што туберкулёз, на які хварэў Лоўрэнс, быў характэрнай хваробай канца XIX — пачатку XX стагоддзя. І пісьменнік праз выкарыстанне метафар хваробы намаляваў хваробу грамадства ў цэлым.

Непазбежнай тэмай многіх дакладаў была вайна. Адносіны



пісьменніка да "масавай разні" былі поўныя адчаю і болю. Цікавым вынікам дыскусій стала ідэя аб сувязі паміж вайной і каханнем, што робіць Лоўрэнса арыгінальным прадвеснікам маральнай каштоўнасці здаровых чалавечых адносін.

Даследаванні творчасці Лоўрэнса непазбежна ўводзілі яго постаць у больш шырокі культурны і літаратурны кантэкст.

Мой даклад "Дыскурс і рыторыка кахання ў кароткіх апавяданнях Д.Г. Лоўрэнса" абмяркоўваўся на адной секцыі разам з дакладам П. Балберта (аўтара шматлікіх кніг па творчасці Лоўрэнса), што даказвае выключны дэмакратызм атмасферы ўсёй канферэнцыі. Слухачы былі вельмі зацікаўлены пытаннямі выкладання кароткіх апавяданняў, чым я з задавальненнем падзялілася з шаноўнай аўдыторыяй. У сувязі з цікавасцю да даклада ўзнікла і зацікаўленасць да нашай краіны і універсітэта ў прыватнасці. Двое вучоных — прафесар Нотынгемскага універсітэта П.Прэстан і прафесар універсітэта Паўночнай Караліны (ЗША) К. Кушман, выказалі жаданне наведаць Мінск і прыняць удзел у канферэнцыях па замежнай літаратуры. У гутарках з удзельнікамі я таксама высветліла для сябе, што МДЛУ мае вельмі высокі ўзровень выкладання замежнай літаратуры, і наш вопыт можа служыць прыкладам для замежных універсітэтаў.

А яшчэ аказалася, што Мінск і Нотынгем — гарады-пабрацімы. Ці не таму, як заўважылі некаторыя госці, так многа прыгожых дзяўчат на вуліцах Нотынгема!

Канферэнцыяй было прынята рашэнне прадаўжаць вывучэнне і прасоўванне ведаў аб творах пісьменніка, а таксама назначыць месцам наступнай міжнароднай канферэнцыі ў 2010 годзе горад Канбера, Аўстралія.

Станоўчым дасягненнем камандзіроўкі ў Ноцінгем я лічу ўваходжанне беларускага замежнага літаратуразнаўства ў сусветны кантэкст, магчымасць далейшай арганізацыі міжнародных форумаў на базе нашых ВНУ, а таксама наладжванне важных акадэмічных сувязей з вядучымі універсітэтамі свету.

P. S. Хачу выказаць вялікую падзяку нашаму рэктару — прафесару Н.П.Баранавай за дадзеную магчымасць далучыцца да вялікіх падзей у нашай прафесійнай галіне, а таксама загадчыку кафедры Ю.В. Стулаву і ўсім маім калегам за падтрымку і натхненне.

Марына РАГАЧЭЎСКАЯ,
дацэнт кафедры сусветнай літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

Вуліцы, прысвечаныя братам-славянам, пачалі з'яўляцца на карце Мінска яшчэ на пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя. Адна з такіх невялічкіх вулачак насіла імя вядомага ўкраінскага паэта Тараса Шаўчэнкі. За часы свайго існавання яна не проста "змяніла дыслакацыю", але і "вырасла" да бульвара... Другой асобай украінскай літаратурнай эліты, адлюстраванай на шыльдах адной з вуліц нашага горада, сталася паэтэса Леся Украінка.

Гонар украінскай літаратуры

Бацька ўкраінскай літаратуры, мастак і рэвалюцыянер-дэмакрат Тарас Шаўчэнка "займеў" вуліцу ў Мінску яшчэ ў 1930-я, але знаходзілася яна ў глыбіні Татарскай слабады.

Прадмесце Татарская слабада з'явілася на паўночна-заходняй ускраіне Мінска ў XVI стагоддзі, калі вайсковы дзеяч ВКЛ Міхась Глінскі разбіў пад Клецкам у 1506 годзе войска крымскіх татар. Палонныя мусульманскія ваяры тады былі расселеныя ў паселішчах Беларусі. Адно з іх знаходзілася ля Мінска.

Чамусьці менавіта ў гэтым раёне, на пачатку 1930-х гадоў, адна з вуліц займела назву ў гонар класіка ўкраінскай літаратуры — Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі. Звілістая, сярод драўлянай забудовы прыватнага сектара яна нічым не вылучалася з мясцовага татарска-беларускага асяродку... Прайшло трыццаць год і на 100-годдзе з дня смерці паэта (1961) гарадскія ўлады вырашылі надаць імя паэта Украіны новаму і прыгожаму бульвару. Там узнік сапраўдны ўкраінскі асяродак: дапаўненнем да бульвара сталі кінатэатр "Кіеў" і Кіеўскі сквер.

Лёс жа першапачатковай вулачкі Тараса Шаўчэнкі склаўся не зайздросна. Спачатку яна была пераназвана ў завулак Дзімітрава, а ў 1970—80-я гады ўсю яе забудову знеслі. Цудам захаваўся толькі адзін будынак — Мінская шпалерная фабрыка.

Некалькі год таму вырашалася пытанне аб ўсталяванні ў Мінску помніка паэту Шаўчэнку. Камісія, што займалася абраннем месца для манумента заснавальніку нацыянальнай украінскай літаратуры, адмовілася ад прапанаванай тэрыторыі на самім бульвары. Напэўна, не вельмі прывабна выглядала на той момант навакольная забудова хрушчоўскіх часоў. Не спадабалася камісіі нават месца ў Старажоўскім скверы, на сучасным праспекце Машэрава. Задаволіў усіх трэці варыянт — Сцяпанаўскі сад, што знаходзіцца на рагу вуліц Кісялёва і Старавіленскай, дарэчы, побач з новапабудаваным пасольствам Украіны.

Без дазволу на каханне

Леся Украінка (Ларыса Касач-Квітка) набыла вядомасць як украінская паэтэса у 1884 годзе... Але аднойчы, у ліпені 1897-га, у Ялце звёў лёс украінскую прыгажуню-літаратарку з падпольным рэвалюцыянерам Сяргеем Мяржынскім, ураджэнцам Кіева. Ён скончыў Кіеўскі універсітэт, але пераехаў на працу ў Мінск. У Крыме гэтыя дзеячы нашай гісторыі і культуры знаходзіліся на лячэнні ад сухотаў і там жа пакахалі адзін аднаго, ці, магчыма, гэта было сапраўднае, моцнае сяброўства... Потым Леся Украінка чатыры разы прыязджала ў Мінск да Мяржынскага.

У 1950-я гады адна з новых вуліц Мінска займела імя Сяргея Мяржынскага. Яе даўжыня — 350 метраў, знаходзіцца паміж вуліцай Калініна і Бульварам Талбухіна. Да 1987 года спадар Мяржынскі быў "у адзіноце", але ў адзін цудоўны момант у Мінску з'явілася вуліца Лесі Украінкі. На жаль, толькі знаходзіцца яна на ўскрайку горада — у мікрараёне Вяснянка... Так закаханыя аказаліся... разлучанымі.

Дар'я САЦУКЕВІЧ

Наш тэатр — Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача — напаткала раптоўнае і вялікае гора: памёр наш вядомы акцёр Міхаіл Лявонцеў. На ягоным творчым рахунку — каля трыццаці буйных тэатральных роляў, ролі ў кіно і на тэлебачанні, удзел у рэспубліканскіх дабрачынных праектах. Адна з апошніх буйных работ акцёра — сапраўдная зорная роля! — Клоун Клаўс у спектаклі "Пацалунак ночы", чыя прэм'ера адбылася ў 2006 годзе.

Бывай, Артыст...

У траўні 2007 года "Пацалунак ночы" быў названы лепшым спектаклем тэатральна-тэлевізійнага фестывалю "Ожившая сказка" ў Маскве. 29 кастрычніка 2007 года "Пацалунак ночы" быў заяўлены ў афішы міжнароднага тэатральнага фестывалю "Панарама", але за дзень да выхаду на сцэну здарыўся сардэчны прыступ...

...Абаяльны, пластычны, падцягнуты, с мяккім барытонам, Лявонцеў выявіўся вельмі чуйным да прафесіі: аж з 1976 года ягоная акцёрская маладосць пазначана добрым тузінам другарадных персанажаў без імёнаў і прозвішчаў, ды ўвесь тузін шчодра сілкаваўся лявонцеўскай непаўторнасцю. Год 1981 адзначаны заўважным акцёрскім поспехам: ніводная тагачасная рэцэнзія на спектакль "Як гартавалася сталь" не абыходзілася без таго, каб не ўспомнілі ролю буфетніка Прахошкі: эпізадычная роля зрабілася адной з самых ёмістых і значных. Прахошка порстка гаспадарыў у буфеце чыгуначнай станцыі, даваў дыхту афіцыянтам, годна ладзіў з наведнікамі і крутам-мутам уладарыў на станцыі, у горадзе, — траха не ў свеце! Прайдзісвет Прахошка застаўся адной з самых улюбёных роляў акцёра Лявонцева.

Крамнік Хобс са спектакля "Маленькі лорд Фаўнтлярой" — роля важкая і складаная сваёю станоўчасцю. Хобс мусіў вучыць жыццю маленькага лорда Седрыка, даць яму колькі ўрокаў чуласці і запэўніць малога ў сваёй спагадзе. Характарных рысаў свайму Хобсу акцёр Лявонцеў адшкадаваў вельмі скупа: крамнік быў стрыманым ды спакойным, затое дужа шчырым, надзейным, натуральным.

Казачныя персанажы Лявонцева — заўсёдныя дзіцячыя ўлюбёнцы: Млынар ("Шукай ветру ў полі"), сквапны Купец ("Пра Іванку дурненькага"), Мухамор ("Жылі-былі дзве лісічкі"), жыццялюбец-Людаед ("Кот у ботах"), вяўнічы Ваенны міністр ("Сястра мая Русалачка"), справядлівы Доктар ("Дзень нараджэння ката Леапольда"), разважлівы Леў ("Дарога на Віфлеем")...

Зорная роля Лявонцева — Клоун Клаўс, добры чалавек, чыёй прыстойнасцю і даверлівасцю скарысталіся іншыя. Міхаіл Лявонцеў далікатна даводзіў аўдыторыі, што душэўнасць, прыстойнасць, спагадлівасць ягонага персанажа хіба маглі ўбараніць цвёрды характар, абачлівасць і цвярозы розум. Але вучоны, — а менавіта вучоным-вынаходнікам быў Клаўс — і ўявіць не мог, якой бядзе, якому гору могуць слугаваць ягоныя адкрыцці. Ад першага выхаду Клаўса на сцэну за ім адчувалася нейкая няўлоўная віна, — у манеры рухацца, размаўляць, прадстаўляць нумары сваёй вясёлай праграмы, ладзіць стасункі з хворымі дзецьмі. Глядацкую аўдыторыю ён тым часам далікатна рыхтаваў да нейкай страшнай праўды, — а пасля таго, як гэтая праўда высвятлялася, з Клаўса нібыта здымаўся вялікі цяжар. Ён выпроставаўся, здавалася, нават ростам рабіўся вышэйшы. У гаворцы з'яўлялася ўпэўненасць, вінаватую ўсмешку пераймаў здаровы рогат, а — галоўнае! — акцёр ясна выяўляў, што наперадзе — выйсце! Выйсце з прыгнёту віны, з разгубленасці, пазбаўленне ад шоку здрады, а для малога, якім Клаўс апекуецца — выйсце з хваробы! А менавіта выздараўлення для дзяцей дамагаўся герой Лявонцева на працягу ўсяго дзеяння. Ён ахвяраваў уласным жыццём, ахвяра — цана пазбаўлення Клаўса ад памылак даверлівасці. Але мэта — жыццё і здароўе дзяцяці — настолькі вялікая, што ахвяра Клаўса не ўспрымалася фатальна і змрочна.

...Тэатральны акцёр заўжды ахвяруе сябе часу: ягонае мастацтва ўсё яшчэ цяжка фіксаваць для нашчадкаў. Выходзіў на сцэну, іграў, жыў, быў, — яшчэ ўчора грымяраваўся, паўтараў ролю... Дзіўны занятак, калі не сказаць — дзівосны. Ні змрочнасці, ні фаталізму. Хіба толькі любоў...

Ад імя ўсіх, хто служыць у тэатры — загадчык літаратурна-драматычнай часткі Жана Лашкевіч

Калектыў рэдакцыі часопіса «Вожык» глыбока смуткуе з выпадку смерці былога рэдактара часопіса, пісьменніка Валянціна Уладзіміравіча БОЛТАЧА (ВАЛЯНЦІНА БЛАКІТА) і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў рэдакцыі тыднёвіка «ЛіМ» смуткуе з прычыны смерці пісьменніка Валянціна Уладзіміравіча БОЛТАЧА (ВАЛЯНЦІНА БЛАКІТА) і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Дарога, не ўсыпаная кветкамі

9 лістапада закончыў свой зямны шлях Міхаіл Міхайлавіч Грыбаў, настаўнік-пенсіянер, грамадзянін, літаратар, мой старэйшы таварыш з горада Іўе.

Гэта быў чалавек вельмі няпростага лёсу, які падлеткам у гады Вялікай Айчыннай вайны быў прымусова вывезены фашыстамі ў Германію, дзе спаўна спазнаў што такое быць остарбайтарам.

Некалі, а дакладней, на пачатку 1998 года, ён, пенсіянер, упершыню прыйшоў у рэдакцыю часопіса "Маладосць". Тады Міхаіл Міхайлавіч прынёс свае "Запіскі остарбайтара". Аказалася, іх ніхто нідзе не браў у друк. Прызнаўся таксама, што наш часопіс, які адкрыў дзесяткі імёнаў беларускіх пісьменнікаў, і які друкаваў суровую і праўдзівую прозу і публіцыстыку пра вайну, яму дарагі.

Усе мы, тагачасныя супрацоўнікі, уважліва слухалі аповед гэтага чалавека пра час, народ, Айчыну і пра сябе. Міхаіл Міхайлавіч неяк адразу, нязмушана стаў нашым старэйшым таварышам. А галоўны рэдактар, слынны пісьменнік Генрых Далідовіч, калі так можна сказаць, блаславіў яго на літаратурную працу. Сказаў, што гэта вельмі патрэбна маладым, і не толькі... Каб помнілі і ведалі праўду.

І ён пісаў, не спяшаючыся. Пісаў шчыра, даверліва. Яго нельга было папракнуць у фальшы, прыстасаванстве.

З Міхаілам Міхайлавічам, які падпісваўся як Міхась Грыбаў, працаваў Анатоль Казлоў і я. Асабіста для мяне і, як ведаю, для Анатоля, Міхаіл Міхайлавіч як мудры і чуллівы настаўнік паказваў узоры непахіснасці ў сваіх чалавечых і грамадзянскіх перакананнях, выверанных уласным лёсам, жыццём і працай сярод людзей.

Так, ён іх "адточваў" у самых розных жыццёвых калізіях. Найчасцей (трэба глядзець праўдзе ў вочы) падчас сутыкнення з рознымі баязлівымі, хамаватымі чыноўнікамі і асобамі з органаў, якія ў пасляваенныя часы, калі вярнуўся на радзіму хворы на туберкулёз, бачылі ў ім і ворага народа, і здрадніка.

А той "вораг" і "здраднік" яшчэ падлеткам, аказваецца, здзейсніў, можа, свой самы галоўны чалавечы подзвіг у імя жыцця: перад расстрэлам не выдаў карнікам ні тое, што вёска звязана з партызанамі, ні партызанскія сем'і...

І спатрэбіўся немалы час, каб Міхась Грыбаў зноў стаў паўнапраўным сынам сваёй Айчыны, якая даверыла яму быць настаўнікам падрастаючага пакалення. І адбылося тое, што ў такіх выпадках заканамернае. А менавіта — адразу ж, як толькі тыя, хто лічыць сябе вяршыцелямі чужых лёсаў, сыходзяць са сваіх пасад, імёны іх трапляюць у забыццё, а калі і згадваюцца ў адпаведным, "заслужаным" імі ракурсе, дык толькі ў кнігах тых, хто быў іх ахвярамі.

Але свет трымаецца на добрых людзях. Яны, добрыя людзі, дапамагалі Міхасю Грыбаву ў самыя цяжкія яго часы пасля вяртання на сваю зямлю з фашысцкага рабства. Ён стаў не толькі настаўнікам, грамадзянінам у самым высокім сэнсе гэтага слова, але і пісьменнікам. Стаць пісьменнікам была яго самая запаветная мара. Ды і дар у яго быў пісьменніцкі ад нараджэння.

Шкада, што сваю адзіную паўнапраўную кнігу



"Запіскі остарбайтара" Міхась Грыбаў змог выдаць толькі напрыканцы жыцця.

У гэтай праўдзівай і сапраўды высокамастацкай кнізе не толькі ўласнага лёсу, а і лёсу пакалення, падлеткавыя і юначыя гады якога выпалі на фашысцкі палон — нямала ўрокаў мудрага чалавека, філасофскай схільнасці розуму, аналітыка. Але ёсць у гэтай шматгадовай, пакутлівай працы і агульнае для ўсіх: у любых абставінах заставацца чалавекам. Такая, здавалася б, простая, і такая архіскладаная задача. І калі раскласці на мноства "складаемых" такой жыццёвай пазіцыі Міхаіла Міхайлавіча, дык я адзначыў бы і такое: не прымаць хлусні, ад каго б яна не сыходзіла... Знаходзіць у сабе мужнасць казаць праўду там, дзе яе не хочуць ведаць... Словам, быць мужным. І ён сам быў мужным.

Сталася так, што ўсе гэтыя гады, пасля прыгаданага знаёмства ў "Маладосці", не парываліся нашы асабістыя сувязі з Міхаілам Міхайлавічам. Апошнія гады ён цяжка хварэў. Незадоўга да свайго сыходу з зямнога жыцця патэлефанаваў мне і "пахваліўся", што прывёз на падворак помнік, які заказаў сабе: "такі, як хацеў". На маё, разгубленае суцяшэнне, маўляў, дарэмна пра такое думаць, адказаў амаль весела: "Ды не, буду трымацца. Унук (ён у Аўстраліі. — *У. С.*) просіць дачакацца яго". А яшчэ дадаў, што высылае мне неадкладна сваю самвыдатаўскую кніжачку апавяданняў "Былое ў сучасным" і першую маладосцеўскую публікацыю "Запісак..."

Міхаіл Міхайлавіч заўсёды цікавіўся чалавечым і пісьменніцкім лёсам блізкіх яму маладосцеўцаў Генрыха Далідовіча і Анатоля Казлова. Калі з іх дазволу я казаў яму, што і як, прамаўляў: "Валодзя, ніхто не будзе пасыпаць вашы дарогі кветкамі..."

У яго кнізе "Запіскі остарбайтара", у фінале, як вынік, ці што, падобнае выказванне чытаецца ў пісьме да Ганначкі, першаму каханню. Цытую даслоўна: "Мы (маюцца на ўвазе тыя, хто перажыў разам з ім усе нягоды) рана адкрылі ісціну, што ніхто не будзе пасыпаць кветкамі нашу дарогу нам".

Успрымаем вобразную паралель незалежна ад часу, месца, абставін. Зразумеем, як і наступнае: ісці сваімі шляхамі ўпарта, не чакаючы нечай ласкі...

На развітанне, можа, упершыню паспрабую запярэчыць гэтаму мудраму чалавеку... Памяццю ад жыхароў родных Вашых Чаркасаў, што на Дзяржыншчыне, вялікімі і сціплымі іх справамі, справамі шматлікіх вашых вучняў азораны апошні Ваш зямны шлях, Міхаіл Міхайлавіч. Усыпаны кветкамі людзей, якія ў Іўе прыйшлі да Вас на развітанне.

P.S. На помніку Міхаіла Міхайлавіча Грыбава дата нараджэння такая: 8 лістапада 1924 года.

Уладзімір САЛАМАХА

Жыццё для людзей

Вось ужо крыху больш за месяц, як пайшла з жыцця Алена Іванаўна Чабярук, вядомы беларускі дыялектолаг, уганараваны дзяржаваю за сваю шчырую і руплівую працу на ніве нацыянальнага мовазнаўства.

Да наступных угодкаў яна не дажыла ўсяго два тыдні. Ёй споўнілася б 82... Доўгі век. Колькі было на жыццёвым шляху: апаленае вайной юнацтва, перапоўненае страхам і бояззю за жыццё, неўтаймаваная юначая вера ў заўтрашні дзень, упэўненасць, што са сканчэннем вайны надыдзе шчаслівы час.

Для Алены Іванаўна пасляваенны перыяд стаў па-сапраўднаму светлы. Яна паступіла ў БДУ на аддзяленне логікі, псіхалогіі і рускай мовы філалагічнага факультэта. Вучоба была ў радасць, нягледзячы на пасляваеннае ліхалецце. У час навучання вызначыўся і характар будучай працы. Пасля заканчэння універсітэта прыйшла ў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа. З 1952 г. яе лёс быў звязаны толькі з Інстытутам. Тут яна стала кандыдатам навук, абараніўшы дысертацыю (1969). Але куды больш важна, што ў інстытуце малады даследчык знайшла сваіх сяброў, калег і паплечнікаў, з якімі прайшла праз усё жыццё, шчыруючы разам на навуковай ніве, — Ю. Мацкевіч, Я. Рамановіч, Г. Арашонкаву, А. Крывіцкага, Ф. Клімчука, І. Яшкіна і многіх-многіх іншых. Разам з імі, а таксама іншымі навукоўцамі, А. Чабярук брала ўдзел у стварэнні "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы" (1963), комплексу кніг "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968 — 1969), манаграфіі "Нарысы па дыялекталогіі беларускай мовы" (1964). Гэта не проста звычайныя навуковыя працы — гэта навуковы капітал, попыт на які ніколі не пройдзе. А. І. Чабярук у ліку іншых аўтараў была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР у галіне навукі і тэхнікі (1971). Такая высокая дзяржаўная ўзнагарода была не адзінай у яе скарбонцы.

У канцы мінулага стагоддзя з'явілася новае фундаментальнае лінгвагеаграфічнае даследаванне. Ім стаў "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" — найбагацейшы пяцітомны збор назваабазначальных адзінак, выпрацаваных у выніку моватворчай дзейнасці беларускага народа і замацаваных у яго маўленні. Унікальнасць і найвышэйшая каштоўнасць здзейсненай навукова-даследчай працы ўсведамлялася не толькі навукоўцамі-лінгвістамі. Стварэнне "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" было высокага ацэнена ўрадам нашай краіны. Актыўныя ўдзельнікі, пачынальнікі і нязменныя выканаўцы гэтай фундаментальнай працы былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. Сярод узнагароджаных аказалася і А. Чабярук. Двойчы лаўрэат вышэйшых дзяржаўных узнагарод у галіне лінгвістыкі... Вось вынік і плён творчых дасягненняў.

А паміж гэтымі вяршыннымі навуковымі даследаваннямі былі яшчэ і іншыя: збіраўся матэрыял і складаўся 5-томны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча" (1979 — 1986), ішоў збор і апрацоўка звестак для "Агульнаславянскага атласа", пісаліся артыкулы, выконваліся розныя планавыя і пазапланавыя навуковыя тэмы.

А. Чабярук была высокаінтэлігентным і чулым чалавекам. З радасцю і горкімі навінамі ішлі да яе супрацоўнікі, калегі па працы. І Алена Іванаўна ратавала шчырым словам, яна ўмела абнадзеіць і падтрымаць. Яе заўжды ратаваў аптымізм. У скрушлівыя хвіліны жыцця жанчыну лячыла вера. Яна многае пераадолела і многага дасягнула дзякуючы любові — да жыцця, працы, людзей. Такой сонечнай, улюбёнай у свет, яго радасці і нягоды, яна і застанецца з намі, у нашай памяці.

Супрацоўнікі аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі, калегі па працы, сябры

Лялькі «пад ёлачку»

Упрыгожваць каляднае дрэўца і хаваць пад ім падарункі было ранавата: каляндар нагадваў пра лістапад. Аднак... Дробненькі, мокры, але ўсё ж такі — снег, сеяўся з неба на гарадскую плошчу; у цэнтры яе, ля мудрагелістага каркаса, завіхаліся людзі , распакоўваючы кардонныя скрыні з хвойнымі лапкамі ды майструючы пухнаты ўбор для рукатворнай зялёнай прыгажуні. А ў гэты час за некалькі кварталаў ад плошчы пачыналася імпрэза, у атмасферы якой панавала свята. Амаль каляднае...

Нездарма на гэтую, "троху калядную", святочнасць падзеі, што адбывалася ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, звярнуў увагу яго дырэктар Сяргей Вечар. Выстаўка "Лялькі польскія. Лялькі свету", якая адкрывалася тут, узнімала настрой, што называецца, ужо з парога: так радуюцца самым прыемным і нечаканым падарункам. Наведнікі экспазіцыі атрымалі гэты унікальны падарунак дзякуючы плённаму супрацоўніцтву музея з Польскім інстытутам у Мінску (дырэктар Пётр Казакевіч).

Ужо з назвы бачна, што выстаўка "Лялькі польскія. Лялькі свету" складаецца з дзвюх частак. Першая прадстаўляе польскія лялькі ў нацыянальных і гістарычных строях, другая — лялькі з больш як 20 краін свету, падораныя ўдзельнікамі дзесяці выставак Міжнароднага біенале рэгіянальных лялек, што ладзіліся ў 1974 — 2000 гадах. Беларусы, якія, па бальшыні, упершыню пачулі пра існаванне такіх фэстаў, з цікавасцю даведваліся пра іх традыцыі ды мэты.

А мэты біенале — распаўсюджванне ў Польшчы ведаў пра традыцыі, фальклор і звычкі народаў іншых краін, абмен досведам па захаванні традыцый у сферы папулярызацыі форм народнай мастацкай пластыкі, што існуюць сёння, і аднаўленне тых яе форм, якія знікаюць. У 10 біенале ўдзельнічала 45 краін з 6 кантынентаў, якія прадставілі каля 220 аўтараў і больш як 3500 работ. Лялькі-"госці", якія заставаліся ў Польшчы, а таксама вырабы сваіх майстроў, — уласнасць варшаўскага фонду "Цэпелія". Гэты фонд польскага нацыянальнага мастацтва і рамёстваў арганізуе выстаўкі, кшталту разгорнутай у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, дзеля папулярызацыі фальклору і творчасці народных майстроў краін свету і Польшчы. Звярнуўшыся да наведнікаў мінскай выстаўкі, яе куратар Ганна Філіповіч-Мроз падкрэсліла унікальнасць многіх экспанатаў: іх аўтары ўжо завяршылі свой зямны шлях, і таму незвычайнае народнае мастацтва ў некаторых краінах пачало, на жаль, занепадаць. Таму правядзенне такіх выставак не толькі мае пазнавальнае значэнне, але і спрыяе пошуку аналагічных форм самаідэнтыфікацыі народаў розных краін.

Апынуўшыся ў маляўнічай, стракатай і экзатычнай кампаніі незвычайных экспанатаў, нібы трапляеш у магічны свет, насельнікі якога надоўга прыцягваюць тваю ўвагу. Лялькі вялікія і мініяцюрныя, амаль дэкаратыўныя і падобныя да жывых людзей, што нібы прыпыніліся на імгненне ў "стоп-кадры", але зараз пачнуць рухацца, танчыць, займацца сялянскаю справай і нават размаўляць між сабой...

Так, гэтым нерухомым стварэнням шмат перадалося ад людзей. І не дзіва. На ўсіх кантынентах, ва ўсіх народаў лялька спадарожнічае чалавеку, яго культуры (і культам) са старажытнасці. Аднак сёння агульная рыса ўсіх нацыянальных лялек — іх дэкаратыўнае прызначэнне. Апранутыя ў нацыянальныя строі, яны ўжо не з'яўляюцца цацкамі, гэта найперш — экспанаты і сувеніры. Многія зробленыя з асаблівай стараннасцю, з увагай да самых дробных дэталяў касцюма, яго крою і колеравай гамы, упрыгажэнняў: гэта ўжо сапраўдныя захавальніцы самабытных нацыянальных і нават рэгіянальных традыцый. Некаторыя лялькі, перадусім — польскія, паказаны ў адмысловых сюжэтах: вось хлопцы выганяюць пасвіць авечак; вось тыповая сялянская сям'я засяродзілася на скубанні пер'я; вось дзяўчаты рыхтуюць велікодныя пісанкі; а там — паненкі ў жалобных строях, а там — захапляльная сцэна палявання...

Адпаведнасць традыцыям і дасканаласць выканання робяць нацыянальныя лялькі творам сапраўднага мастацтва, сімвалам краіны або этнічнай групы. Таму яны і могуць быць сямейным, сяброўскім падарункам, і нярэдка выкарыстоўваюцца ў якасці прыгожага сувеніра кіраўнікам дзяржаў падчас афіцыйных візітаў.

На жаль, беларускіх лялек у экспазіцыі няма, бо дагэтуль прадстаўнікі нашай краіны ў такіх міжнародных варшаўскіх імпрэзах не ўдзельнічалі, хаця ёсць і свае старажытныя традыцыі ў шматаблічнай "лялькавай" культуры, і таленавітыя майстры, і штогод у Мінску адпаведныя выстаўкі праходзяць. Арганізатары выстаўкі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі выказалі спадзяванне, што прадстаўленне маляўнічых фігурак не будзе выключна эстэтычным уражаннем для нашых гледачоў, а стане ключом да пазнання і разумення іншых культур, а таксама ўласнай спадчыны. Таму, безумоўна, "лялечная прэм'ера" польскіх сяброў у Мінску не толькі паспрыяе нашым абменам і ў гэтай галіне, але і падштурхне беларускіх спецыялістаў да правядзення падобных фэстаў.

Хтосьці з гасцей музея, агледзеўшы выстаўку, заўважыў: калі б тут стаяла ёлка, можна было б напоўніцу адчуць, што набліжаецца чаканая зімовая ўрачыстасць... Так або інакш, калекцыя дзівосных лялек, экспазіцыя якой завяршаецца сёння, у многіх яе гледачоў выклікала непаўторнае адчуванне свята.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Кастуся Дробава

Незабыўныя фотаімгненні

Позірк з даўніны

Гэтаму здымку амаль паўвека. Арыгінал фота ў пашкоджаным выглядзе трапіў да мяне разам з публікацыямі аўтараў, ураджэнцаў Міёрскага раёна, пры падрыхтоўцы да выдання кнігі "Літаратурная Міёршчына" (серыя "Беларусь літаратурная"). Малады тут творца з Міёршчыны — Віталь Іванавіч Высоцкі (1926—2006, стаіць трэці злева), а фота — з яго сямейнага архіва.

Такім чынам зафіксавана падзея 1959 года, калі Віталь Высоцкі быў запрошаны на літаратурную вучобу ў Дом творчасці "Каралішчавічы". Асноўнай прафесіяй В. Высоцкага была матэматыка: ён доўгі час працаваў настаўнікам Цвецінскай школы ў Міёрскім раёне, але і роднаму слову служыў у меру сваіх здольнасцей і натхнення. Друкаваўся ў часопісе "Бярозка", а найчасцей з апавяданнямі для дзяцей выступаў у сваёй раённай газеце.

З кім жа ў 1959 годзе сустракаўся мой зямляк у Каралішчавічах? Паўглядаемся ў фота. Сядзяць (злева направа) Усевалад Краўчанка, Эдзі Агняцвет, Алесь Якімовіч, Іван Шамякін, сакратар гаркама Дзмітрыева, Янка Маўр прыабдымае піянерку Вольгу Іпатаву, Сяргей Грахоўскі, Станіслаў Шушкевіч.

За імі стаяць ужо названы В. Высоцкі, а далей, калі глядзець злева направа, можна пазнаць аблічча Алеся Шашкова, Пятра Рунца, Алеся Пальчэўскага, Васіля Віткі, Артура Вольскага.

Неназваных удзельнікаў, спадзяюся, апазнаюць чытачы "ЛіМа", а мо і раскажуць штосьці цікавае пра тую каралішчавіцкую падзею. Будзем убіраць у сябе позіркі з даўніны.

Сяргей ПАНІЗНІК

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"
РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Жана МАЛЕВІЧ
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый. Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3434
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 12.12.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6719

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686